— Каго любіш?
— Люблю Беларусь!

ЛіМ

ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

11 КАСТРЫЧНІКА 1996 г. № 41 (3865) Кошт 2 500 руб.

НА АТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БЕЛАРУСІ

НЕЧАКАНЫЯ ЧАКАНАСЦІ МІХАЛА ФІНБЕРГА

У спісе прэтэндэнтаў на ганаровыя лаўры ягоная кандыдатура — ці не адзіная, вакол якой можна не ўсчынаць спрэчкі. Слава пра народнага артыста Беларусі Міхала Фінберга ідзе гучная і добрая. Каго-каго, а знанага маэстра галоўная прэмія краіны, пэўна ж, не абміне, навошта яшчэ ладзіць нейкае дадатковае абмеркаванне "мастацкага ўкладу", відавочнага настолькі, што...

Што аказваецца досыць няпростаю справай — расшыфраваць пратакольную фармулёўку вылучэння: "за канцэртныя праграмы 1992—1995 гг.". І сапраўды, паспрабуйце вось так, з ходу, прыгадаць усе імпрэзы, наладжаныя за гэты час Дзяржаўным канцэртным аркестрам Беларусі пад кіраўніцтвам няўрымслівастомнага мастацкага кіраўніка! Тут і праграмы-прэм'еры, якія штораз упрыгожваюць маладзечанскі фэст Нацыянальнай песні і паэзіі, усталяваны ў нашым культурным жыцці намаганнямі самога ж М. Фінберга. Тут і з любоўю, з натхненнем зладжаныя-праведзеныя аўтарскія вечарыны: кампазітараў Ігара Паліводы, Ігара Лучанка, Эдуарда Зарыцкага; паэтаў, чыя творчасць спакроўлена з роднаю песняй, — Генадзя Бураўкіна, Ніла Гілевіча, Уладзіміра Някляева... Тут і "зробленыя на салістаў" і для ўдзячных слухачоў маляўнічыя нізанкі рэтра-шлягераў; і канцэрты ў памяць карыфеяў жанру — Глена Мілера, Эдзі Рознера; і тытанічная праца (у "жывым", як заўсёды, гучанні!) на галоўнай пляцоўцы "Славянскага базара"...

Заўсёды чакаеш: а што ж яшчэ прыдумае-запрапануе апантаны творчай працай маэстра? Чаканні спраўджваюцца. Ды чаканае зазвычай поўняць нечаканасці.

Вось хаця б канцэрт, які адбыўся падчас фестывалю "Мінская вясна-96". Цікаўныя чакалі: што там ізноў выштукавала маэстрава фантазія? Бо й сапраўды дзіўнаю была назва канцэрта: "Фолк + джаз = музыка". І ўрэшце — сапраўды нечаканае ўзрушэнне сталася радасцю для многіх слухацкіх сэрцаў.

Слухацкіх — і глядацкіх. У той вечар сцэна Беларускай дзяржаўнай філармоніі выглядала нязвыкла. Ці не ўпершыню яна была падзелена паміж двума аркестрамі, такімі, здавалася б, несумяшчальнымі — ні паводле "аўдыё", ні паводле "візуальных" прыкмет. Злева — Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі, справа — Акадэмічны народны імя І. Жыновіча. Уяўляеце? Ад гэтай смелай, дзёрзкай нават, і такой духоўна прыгожай, такой у выніку пераканальнай, захапляючай, святочнай творчай акцыі аж дух займала.

Паядналіся музыкі на сцэне. Паядналася ў зале стракатая грамада іх прыхільнікаў. "Пабраталіся" два нашы выдатныя дырыжоры — Міхал Казінец ды Міхал Фінберг. Як артыстычна, з якой віртуознай тактоўнасцю змянялі яны адно аднаго на ўяўным капітанскім мосціку чарадзейнага музычнага флагмана! Якімі пікантнымі былі чаргаванні народна-інструментальных нумароў ды кампазіцый для бігбэнда з удзелам вакалістаў "Камераты"! Якімі зачараванымі вачамі глядзелі хлапчукі з канцэртнага аркестра на самабытных віртуозаў-жыновічаўцаў Аляксандра Крамко, Сяргея Забаронка, Святлану Лясун, знаную цымбалістку Ларысу Рыдлеўскую; з якой непасрэднасцю пляскаў у ладкі з дапамогай... сваёй "залатой" трубы славуты Валеры Шчарыца! І як апладзіравалі музыкі разам са сваім кіраўніком Міхалам Казінцом, калі рэй вялі майстры Фінбергавага калектыву: Сяргей Анцішын, Уладзімір Ткачэнка (з уласнай версіяй "Саўкі ды Грышкі"), Уладзімір Семянюк, Аляксандр Стражук, Уладзімір Ксёнц!

Быў і абмен музычнымі дарункамі. У гонар кіраўніка Дзяржаўнага канцэртнага аркестра жыновічаўцы выканалі экзатычную "Цыганскую рапсодыю" Я. Грыдзіна; майстры народна-інструментальнага выканальніцтва, чый калектыў яшчэ пад кіраўніцтвам І. Жыновіча М. Фінберг, зусім тады юны, слухаў у родным Мазыры, атрымалі "ў падарунак" віртуозную п'есу для трамбона ў выкананні Віктара Бударына. Апафеозам сталася сапраўднае паяднанне ў неўміручай "Песні пра Нёман" Н. Сакалоўскага, калі пад акампанемент жыновічаўцаў заспявалі вакалізам... трубачы, а потым узялі свае звонкія інструменты, і шырокую, як шчырая душа, меладыйную плынь падхапіў аркестр...

Думаю, што падчас таго канцэрта шматлікія фанаты эстраднай інструментальнай і джазавай музыкі для сябе адкрылі (для сябе нязнаны!) свет высокапрафесійнага і натхнёнага народна-інструментальнага мастацтва. Думаю, што прыхільнікі беларускага фальклору ў той вечар умацаваліся ў сваёй павазе да маэстра Міхала Фінберга, чыя дзейнасць у мастацтве паслядоўна і ўсвядомлена скіроўваецца на карысць Беларусі.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Фота Віт. АМІНАВА

КОЛА ДЗЁН

Колькі ўжо разоў вучыла гісторыя: якія могуць быць кампрамісы там, дзе размова ідзе пра "быць альбо не быць"? Тым больш, што "быць" спадабалася і вельмі хочацца... У такой сітуацыі заўсёды перамагае больш рашучы і настойлівы. Сёння з вялікай доляй пэўнасці можна сказаць, што Вярхоўны Савет загубіў сябе якраз нерашучасцю лідэраў і пошукамі кампрамісаў. Ініцыятыва страчана, страчаны час, які другі бок, мяркуючы па ўсім, скарыстаў дужа плённа. Пляцецца "ў хвасце" прэзідэнцкіх прапаноў і апазіцыя ў цэлым. Прапанаваў прэзідэнт чатыры пытанні на рэферэндум — дададзім тры свае; прапанаваў праект Канстытуцыі — чытайце і наш; збірае "народны сход" — арганізуем і мы альтэрнатыўны... Адзіная ж дзейсная рэч у сённяшняй сітуацыі — працэдура імпічмента — так і не была сур'ёзна распачата. Цяпер ужо і сапраўды, сваё слова можа сказаць толькі народ. Але што ён можа сказаць, калі ўся прапагандысцкая машына працуе на адно... Песімізм? Так. Аптымізм да апошняга ў нас ніколі не пакідаў толькі БНФ. Таму ён заўсёды і прайграваў.

ЗАКАНАМЕРНАСЦЬ ТЫДНЯ

110 дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларусі паставілі свае подпісы пад спісам прапаноў аб папраўках у прэзідэнцкі праект Канстытуцыі. Калі прэзідэнт прыме і падтрымае іх, то дэпутаты абяцаюць зацвердзіць прапанаваную ім дату рэферэндуму — 7 лістапада. Яшчэ адзін "кампраміс"... Чым далей зацягваецца супрацьстаянне, тым меншае актыўнасць лідэраў парламента, тым відавочней перамога інстынкту самазахавання асобных дэпутатаў над інстынктам самазахавання парламента ў цэлым.

НАМЕРЫ ТЫДНЯ

19 кастрычніка — зусім блізка. Але пра тое, што можа адбыцца ў гэты дзень на "Усебеларускім народным сходзе", мы можам толькі здагадвацца. Мяркуючы па некаторых інтэрв'ю і выступленнях прэзідэнта, планы і надзеі на гэты "форум" вялікія. Прынамсі, ужо зараз не ўтойваецца, што паўнамоцтвы ў сходу будуць ці не большымі, чым у парламента. Прасеяныя праз "вертыкальнае" сіта дэлегаты сходу ў ідэале павінны быць лаяльнымі прэзідэнту. А значыць, могуць, павінны прызначыць патрэбны прэзідэнту дзень правядзення рэферэндуму і зацвердзіць падрыхтаваны яго памочнікамі праект Канстытуцыі. І няхай потым, як сказаў прэзідэнт, "дзермакраты" даказваюць нелегітымнасць гэтых рашэнняў. На сваіх кухнях. І адзін аднаму.

ЗВАРОТЫ ТЫДНЯ

За ўжо трохі забыты "круглы стол" на мінулым тыдні зноў селі прадстаўнікі 30 уплывовых партый і рухаў Беларусі. Праўда, на гэты раз у ім не прымалі ўдзел камуністы і аграрыі. Удзельнікі "круглага стала" прынялі два важныя звароты да дэпутатаў Вярхоўнага Савета краіны. Першы — з прапановай распачаць працэдуру імпічмента прэзідэнта. Другі — з прапановай стварыць дэпутацкую камісію для праверкі гаспадарчай дзейнасці кіраўніцтва спраў прэзідэнта. "Мы заклікаем дэпутатаў Вярхоўнага Савета праявіць грамадзянскую мужнасць і прадоўжыць дзейнасць па аднаўленні законнасці ў краіне", — гаворыцца ў адным са зваротаў. Сесія сваю работу пачала. Але — не з абмеркавання зваротаў.

ПРАПАНОВА ТЫДНЯ

Старшыня Цэнтрвыбаркама В. Ганчар на прэс-канферэнцыі заявіў, што рэферэндум немагчыма будзе правесці не толькі 7 лістапада, але і 24, і прапанаваў перанесці яго на больш позні тэрмін. Каб паспець падрыхтавацца. Але ж прэзідэнт даўно адмовіўся ад паслуг Цэнтрвыбаркама. Рэферэндум рыхтуе "вертыкаль"... Больш таго, ходзяць чуткі, што ўжо нават бюлетэні для галасавання падрыхтаваны. І ў іх толькі чатыры прэзідэнцкія пытанні... Вучыцеся, "дэмакраты", як трэба дзейнічаць, і кусайце локці...

ЧУТКА ТЫДНЯ

За апошні месяц на Беларусі пабываў дзесятак рознага рангу "міратворцаў" з Расіі, але ўсе гэтыя візіты закончыліся практычна нічым: прэзідэнт як гнуў сваю лінію, так і гне. І вось новае, пакуль неафіцыйнае, паведамленне ("Звязда", 8 кастрычніка г. г.): у бліжэйшы час Беларусь наведае прэм'ер-міністр Расіі В. Чарнамырдзін. Мэтай яго візіту будзе не столькі прымірэнне выканаўчай і заканадаўчай галін улады, колькі заклапочанасць тым, што запазычанасць Беларусі Расіі за энерганосьбіты дасягнула астранамічных сум і тэндэнцыі да яе змяншэння няма. Знакаміты вясновы "нулявы варыянт" ужо забыты і паколькі ў нашай краіны так шмат грошай, што яна раскашэльваецца на мільярдныя затраты на рэферэндум, дык чаму б не напомніць і пра даўжок?

КЛОПАТ ТЫДНЯ

Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны і Таварыства беларускай школы распачалі збор подпісаў пад патрабаваннем да прэзідэнта і ўрада забяспечыць грамадзянам Беларусі канстытуцыйнае права на атрыманне вышэйшай адукацыі на беларускай мове. Закон аб мовах, разлічаны на 10 гадоў, не выконваўся і ў лепшыя часы, а сёння і зусім забыты, захлынуўся ў "роўнасці" моў. Зразумела, мала хто верыць, што гэтая акцыя — збор подпісаў — дасць нейкі канкрэтны вынік, але ж колькі можна сядзець склаўшы рукі? Ёсць жа яшчэ беларусы, і яны — жывыя.

ДАЗВОЛ ТЫДНЯ

Мінгарвыканкам усё-ткі дазволіў правядзенне 19 кастрычніка мітынгу апазіцыйных сіл у абарону Канстытуцыі супраць дыктатуры. Першапачаткова аргкамітэт планаваў правесці яго ля Палаца спорту, дзе ў гэты дзень будзе праходзіць "Усебеларускі народны сход", але Мінгарвыканкам "адвёў" для мітынгу толькі плошчу Парыжскай камуны, ля Опернага тэатра. Паколькі збор удзельнікаў мітынгу плануецца на плошчы Якуба Коласа, то, магчыма, адбудзецца і шэсце. Па тратуарах.

Парламент

СЕМ РАЗОЎ АДМЕРАЙ...

"Ведаеце, я не дачакаюся ўжо, калі пайду ў водпуск і паеду дахаты", — вочы заўсёды іранічнай пані Уршулі, карэспандэнткі агенцтва друку адной з еўрапейскіх краін былой сацыялістычнай садружнасці, глядзелі нязвычна сумна. "Шмат працы, стаміліся?" — паспачуваў я. "Калі і стамілася, — пачуў у адказ, — дык ад гэтага вашага жыцця, ад прамывання мазгоў, якое праводзіцца ў лепшых традыцыях таталітарных часоў, урэшце ад вашых мас-медыя, што ў аснове сваёй прагнуць засведчыць сваю адданасць уладзе. Мы ад гэтага ўжо адвыклі. У нас само слова "прапаганда" выклікае алергію..."

У нас жа яна ў самым разгары. Запазычаная яшчэ з савецкіх часоў, толькі мо больш цынічная і езуіцкая. Узяць хоць бы нядаўняе інтэрв'ю аднаго з самых верных збраяносцаў прэзідэнта Сяргея Посахава, змешчанае ў "Народнай газеце", дзе ён тлумачыць апошнія частыя візіты ў Мінск вядомых палітычных дзеячаў Расіі тым, што яны не маюць аб'ектыўнай інфармацыі аб Беларусі, бо вымушаны карыстацца толькі матэрыяламі СМІ, што стаяць у апазіцыі да прэзідэнта. Чытаеш гэта і — хоць стой, хоць падай. Бо каму невядома, кім сёння захоплена амаль уся інфармацыйная прастора ў краіне, хто з аптэчнай дакладнасцю вызначае, што трэба, а што не трэба ведаць "простым людзям". Скажам, пра кожны крок, кожнае слова спадара Лукашэнкі — трэба, а, да прыкладу, пра пасланне прэзідэнта Расійскай Федэрацыі прэзідэнту Беларусі, дзе ён заклікае свайго беларускага калегу пазбягаць канфрантацыі з парламентам, ведаць неабавязкова. Зусім замаўчаць, праўда, не ўдаецца, — навошта злаваць магутнага суседа, ад якога ты цалкам залежыш, але абмежавацца толькі некалькімі радкамі паведамлення — можна.

Невыносна цяжкі прапагандысцкі прэс ў поўнай меры нарэшце адчуў на сабе і Вярхоўны Савет. Кажу — "нарэшце", бо доўгі час парламентарыі нашы на ўціск палітычных свабод у краіне не надта і зважалі. І толькі калі самі сталі аб'ектам кавалерыйскіх наскокаў прэзідэнта і яго акружэння, калі на асобных дэпутатаў былі выліты цабэркі бруду, яны і заварушыліся, заняўшы, як кажуць, кругавую абарону, раз-пораз падымаючыся ў контратакі супраць праціўніка. Не заўсёды, праўда, узважаныя. Маю на ўвазе хоць бы і адмаўленне ў акрэдытацыі пры ВС карэспандэнтаў Белдзяржтэлерадыёкампаніі. Слоў няма, паводзіць яна сябе ў адносінах да многіх дэпутатаў брыдка, нецывілізавана, не спыняючыся перад маной, абразай, але — станавіцца з ёю на адну дошку?..

Высвятленню адносін з прэзідэнцкай адміністрацыяй менавіта па частцы арганізацыі ёю прапагандысцкай кампаніі, звязанай з ініцыіраваным кіраўніком дзяржавы рэферэндумам, кампаніі, якая, на думку многіх парламентарыяў, вызначаецца хлуснёй, дэзінфармацыяй, падтасоўкай фактаў, іншымі несумленнымі прыёмамі, было прысвечана амаль усё ранішняе пленарнае пасяджэнне ВС 8 кастрычніка. Пэўную запеўку дыскусіі зрабіў, выступаючы ў "Розным", дэпутат Анатоль Лябедзька, які расказаў прысутным пра распаўсюджаны выканаўчай уладай нейкі ананімны дакумент (у ім не ўказаны ні аўтар, ні зыходныя дадзеныя), поўны ўсхвалення прэзідэнта і паклёпу на Вярхоўны Савет. Аб "асаблівасцях" прапагандысцкай кампаніі на карысць прэзідэнцкага рэферэндуму на прыкладзе горада Пінска ў тым жа "Розным" расказаў дэпутат П. Знавец. В. Абрамава паведаміла аб фальшыўцы, звязанай з яе імем, што прайшла па Беларускім тэлебачанні (гэтаму факту была прысвечана і сабраная ёю ў перапынку паміж пасяджэннямі прэс-канферэнцыя).

Пасля "Рознага" дэпутаты пачалі ўносіць прапановы па ўключэнні ў парадак дня сесіі дадатковых пытанняў, якія, на іх думку, патрабуюць неадкладнага вырашэння. Адна з такіх прапаноў адразу назлектрызавала Авальную залу. Я маю на ўвазе прапанову Станіслава Шушкевіча аб адкліканні з пасады старшыні парламенцкай камісіі па правах чалавека, СМІ, сувязях з грамадскімі аб'яднаннямі і рэлігійнымі арганізацыямі Ігара Катлярова, які, па словах Станіслава Станіслававіча, нямала паспрыяў манапалізацыі прэзідэнцкай уладай інфармацыйнай прасторы краіны, нічога не зрабіў, каб захаваць за Вярхоўным Саветам "Народную газету", мала дбае пра захаванне на Беларусі правоў чалавека. С. Шушкевіча падтрымалі В. Абрамава, А. Бухвостаў, некаторыя іншыя дэпутаты дэмакратычнай арыентацыі. Затое гарой паўсталі за калегу некаторыя прадстаўнікі камуністычнай фракцыі, членам якой І. Катляроў з'яўляецца. Не даў у крыўду свайго таварыша і старшыня гэтай фракцыі С. Калякін, папрасіўшы не ставіць у парадак дня гэтае пытанне, пакуль яны самі з ім не разабраліся.

Адбылася на тым жа ранішнім пасяджэнні і падзея, якая па ўсіх, як кажуць, канонах павінна была стаць сенсацыяй нумар адзін і якая тым не менш прайшла амаль незаўважанай. Маецца на ўвазе прапанова дэпутата П. Знаўца ўнесці ў парадак дня пытанні аб даверы прэзідэнту і магчымасці выканання ім сваіх абавязкаў, аб прызначэнні новых выбараў прэзідэнта на май 1997 года, аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета і датэрміновых выбарах дэпутатаў ВС.

Неяк Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка казаў, што чытае стэнаграмы ўсіх пасяджэнняў парламента. Можна ўявіць, якую радасць прынясе яму ініцыятыва спадара Знаўца (дарэчы, падтрыманая ўсяго 11 дэпутатамі). Што і казаць, гэты ці то наўмысны, ці то зроблены з-за палітычнай нявопытнасці дэпутата фальстарт можа дорага абысціся дэмакратычнай грамадскасці краіны, апазіцыйнай частцы парламенцкага корпуса, дзе апошнім часам усё больш выспявае ідэя аб'яўлення імпічмента прэзідэнту краіны. Але ж гэта патрабуе вялікай падрыхтоўкі і арганізацыі.

Вось ужо сапраўды, сем разоў адмерай...

М. ЗАМСКІ

З нагоды

ЦАНА КАМПРАМІСУ

Не так даўно прэзідэнт Беларусі заявіў у інтэрв'ю аб сваёй гатоўнасці скарэкціраваць некаторыя артыкулы свайго варыянта Канстытуцыі, калі на гэтым так настойвае парламент. Вось, нібыта, нарэшце і падстава для радасці. Хоць ты ў краму па бутэльку ідзі! Нарэшце спадар Лукашэнка ўсвядоміў, што ад канфрантацыі ніхто не выйграе, і дзеля згоды ў беларускай хаце гатовы нават "наступіць на горла ўласнай песні". Хай бы так было... Аднак прэзідэнт не ўдакладняе, у якім пытанні ён згодны на ўступкі, і, хутчэй за ўсё, мае на ўвазе што-небудзь другараднае. І яшчэ насцярожвае прэзідэнцкая заява пра тое, што няма ў Беларусі канфлікту паміж рознымі галінамі ўлады, ёсць толькі непамерныя амбіцыі шэрагу палітыкаў, якія імкнуцца захаваць любою цаною свае пасады. Былі названы і прозвішчы: Валерый Ціхіня, старшыня Канстытуцыйнага суда, і Сямён Шарэцкі, кіраўнік парламента. Былі закіды і ў адрас старшыні Цэнтрвыбаркама Віктара Ганчара.

Інакш кажучы, прэзідэнт назваў цану кампрамісу: галовы палітыкаў, якіх ён лічыць сваімі асабістымі ворагамі. Мабыць, мяркуе, што з "безгаловым" парламентам і Канстытуцыйным судом праблем не будзе...

Супрацьстаянне Вярхоўнага Савета і прэзідэнта зайшло занадта далёка, каб парламент згадзіўся аплачваць кампраміс такім чынам. Гэта было б занадта. Прымальным магло б быць узаемнае адмаўленне ад "рэдагавання" Канстытуцыі праз рэферэндум. Але на гэта не пойдзе прэзідэнт. Бо надта ж многа сіл і сродкаў укладзена ў гэтую прапагандысцкую акцыю, каб проста ўзяць і ўсё перакрэсліць. У вачах прэзідэнцкага электарату гэта будзе параза сп. Лукашэнкі. Але нават калі прэзідэнт пойдзе на "нулявы варыянт", гэта не можа быць апраўданнем адмаўлення ад імпічменту. На такі крок парламент не мае маральнага права. "Нулявы варыянт" — асобна, імпічмент — асобна. Адно другога не датычыць. "Рэферэндум" па Канстытуцыі — адна справа, а адказнасць за парушэнне Канстытуцыі — зусім іншая.

Каб у Вярхоўнага Савета не было спакусы ўхіліцца ад барацьбы, дэпутаты павінны адчуць падтрымку грамадства. Якой будзе яна і ці будзе?

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

КРОК ДА АБУДЖЭННЯ

ЗВАРОТ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСКАГА АРГАНІЗАЦЫЙНАГА КАМІТЭТА ПА СВЯТКАВАННІ 400-ГОДДЗЯ БЕРАСЦЕЙСКАЕ ЦАРКОЎНАЕ УНІІ

18 кастрычніка спаўняецца 400 гадоў з дня падпісання Берасцейскае Уніі. За ўсю больш як тысячагадовую гісторыю Хрысціянства на Беларусі, ад часу хрышчэння Полацкага й Тураўскага княства у канцы 10 ст., Берасцейская царкоўная унія — самая буйная рэлігійная падзея ў нашай краіне. Сабор, што адбыўся 8 (18) кастрычніка 1596 г. у царкве св. Міколы ў Берасці, меў на мэце далучыць Праваслаўную царкву Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага да сусветнае Каталіцкае царквы праз саюз (унію) з Рымам і, такім чынам, утварыць сваю, адзіную для праваслаўных і каталікоў, царкву на тэрыторыі старажытнае Беларусі. Праваслаўныя іерархі Княства, якія падпісалі унію, верылі, што новая Каталіцкая царква Візантыйскага абраду прынясе рэлігійны мір народу й краіне. Ролю такой царквы ва ўмацаванні не толькі духоўнага, але й дзяржаўнага адзінства краіны разумелі і найбольш прагрэсіўныя дзеячы ВКЛ, што актыўна падтрымлівалі ідэю Уніі.

Паступова Уніяцтва пашырылася на ўсю тэрыторыю тагачаснае Беларусі — у канцы 18 ст., напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай і захопу Беларусі Расейскай Імперыяй, абсалютная большасць беларусаў былі уніятамі. Гвалтоўнае знішчэнне Уніі ў 1839 г. ператварылася ў трагедыю не толькі для самое царквы, але й для ўсёй культуры беларускага народа. Бо за два з паловай стагоддзі свайго існавання Уніяцтва стала сапраўдным аб'яднаўчым фактарам духоўнага жыцця краіны. Была створаная велізарная самабытная культура, якая ахоплівала адукацыю, кнігадрукаванне, літаратуру, храмавую архітэктуру, іканапіс, ювелірнае і ўжытковае мастацтва і інш. Пры уніяцкіх кляштарах працавалі школы й друкарні, што на працягу доўгіх часоў былі адзінымі носьбітамі беларускасці ва ўмовах як паланізацыі, так і русіфікацыі.

Пасля афіцыйнай ліквідацыі Уніяцтва працягвала існаваць у некаторых асяродках Беларусі і ў наступныя паўтара стагоддзя, перажыло некалькі адраджэнняў і перыядаў заняпаду, заўсёды падзяляючы лёс свайго народа. У 1990 г. Уніяцкая царква зноў уваскрэсла на нашай зямлі як знак духоўнага адраджэння нацыі.

Мы спадзяёмся, што святкаванне 400-х угодкаў Берасцейскай Уніі стане яшчэ адным крокам на шляху духоўнага абуджэння самасвядомасці й нацыянальнага адзінства беларускага народа.

Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ,
Мікола КРУКОЎСКІ, сустаршыні
камітэта Уладзімір КОНАН,
Леанід АКАЛОВІЧ, намеснікі

Рэпліка

"ДЗЕЙНІЧАЦЬ СМЕЛА. І ПАБОЛЕЙ ЦЫНІЗМУ"

Гэты наказ неўміручага Астапа Бэндэра свайму кампаньёну, здаецца, узяты на ўзбраенне і праведзены ў жыццё. Маю на ўвазе афіцыйную агітацыю за чарговы рэферэндум.

Найперш гэтую місію ўзяло на сябе рэспубліканскае радыё. Створана спецыяльная "агітбрыгада" з супрацоўнікаў, якая вышуквае ахвочых выказацца ў падтрымку. Магутныя мысляры айчыннай філасофіі і іншых сфер дзейнасці прыводзяць неабвержныя довады на карысць таго, што толькі моцная рука можа навесці парадак у рэспубліцы, а замінаюць ёй недасканалая Канстытуцыя і "калабарацыяністы" з Вярхоўнага Савета.

Бог ведае, што кіруе гэтымі людзьмі — ці іх учарашнія перакананні, ці сённяшняя заангажаванасць на ўсялякіх палітычных і "вертыкальных" структурах, ці проста магчымасць вылезці на людзі. Дайшло да таго, што аднойчы дзяржаўны эфір прадаставілі чалавеку, які не назваў сябе. Так, ва ўсялякім разе, нам паведамілі ва ўступным слове да ранішняй перадачы. Выглядала гэта так: ішоў сабе грамадзянін па Камуністычнай ці Чырвонай дый думае: на радыё мне зайсці, ці што? Даўно душу не выліваў... Ну, заходзіць ён у памяшканне, міліцыя бярэ пад казырок і вядзе яго ў патрэбную рэдакцыю (іначай адкуль ён ведаў, куды звяртацца?). Прадставіцца ён, праўда, пасаромеўся, але яго тут жа завялі ў студыю гуказапісу. "Чалавек з вуліцы", няцяжка здагадацца, спяваў хвалу беларускаму намесніку Усявышняга. І ўсё гэта нам прапануюць з'есці не папярхнуўшыся! Мы б і з'елі мо, каб не ведалі, што на радыё і з журналісцкім пасведчаннем не заўсёды прапускаюць. І каб не мелі ўяўлення пра ўзровень сумленнасці тэлерадыёкіраўніцтва.

Братцы, ну не трымайце нас за ідыётаў! Калі вам хлусіць не гідка і няма ў душы арыенціра, то хаця б меру якую знайце. Вы і так увойдзеце ў гісторыю — тым, каму і як прыслужвалі. Вы нашчадкам сваім не пасмееце ў гэтым прызнацца. І правільна зробіце.

ЛІМАВЕЦ

Віншуем!

ПЯЦЬ ГАДОЎ НА НІВЕ АДРАДЖЭННЯ

Штотыднёвай грамадска-асветніцкай газеце "Культура" ў гэтыя кастрычніцкія дні спаўняецца 5 гадоў. Як гэта ні гучыць банальна, так і хочацца сказаць: не верыцца, што з часу выхаду першага нумара прайшло пяць гадоў. Не верыцца, бо ўсе мы добра памятаем той час, калі нястомная Вольга Іпатава, прызначаная на пасаду галоўнага рэдактара новага выдання, рабіла арганізацыйныя захады, каб яе дзецішча як мага хутчэй прыйшло да чытача.

І гэты час, нарэшце, настаў. І адразу ж, па атрыманні першага нумара, стала зразумела, што "Культура" і на самай справе — газета грамадска-асветніцкага кірунку. Яна не паўтарала выданні, што выходзілі дагэтуль. Яна дапаўняла іх, у тым ліку і тыя, якія асвятляюць пытанні нацыянальнай культуры, мастацтва, літаратуры, а гэта, як вядома, штотыднёвік "Літаратура і мастацтва", часопіс "Мастацтва", крыху пазней — "Тэатральная Беларусь" (цяперашняя "Тэатральная творчасць").

Паставіўшы перад сабой галоўную задачу — як мага больш паслядоўна і аб'ектыўна асвятляць пэўныя моманты багатай гісторыі Бацькаўшчыны, звяртаючы пры гэтым асноўную ўвагу на пытанні культурных стасункаў, "Культуры" свайму высакароднаму імкненню не здрадзіла. Асабліва гэта было відочна ў першыя гады, калі з'явіўся шэраг артыкулаў, што пазнаёмілі чытача як з выдатнымі дзяржаўнымі дзеячамі Вялікага княства Літоўскага, так і з прадстаўнікамі культуры, пра якіх афіцыйная ідэалогія доўгі час маўчала.

Па сённяшні дзень "Культура" нязменна прытрымліваецца свайго накірунку. На старонках штотыднёвіка заўсёды можна прачытаць яркія, запамінальныя матэрыялы, якія закранаюць самыя розныя аспекты культурнага жыцця нашай суверэннай дзяржавы. Газета сее на ніве нацыянальнага Адраджэння зерне разумнага, добрага,вечнага.

У дзень 5-годдзя жадаем калектыву рэдакцыі "Культуры" новых творчых поспехаў, а ўсім прыхільнікам беларускасці — заставацца шчырымі сябрамі гэтага аўтарытэтнага выдання.

ЛІМАЎЦЫ

Імпрэзы

У АДНОЙ ЗВЯЗЦЫ

Звычайна канцэртамі ў нас прынята заканчваць усе сур'ёзныя мерапрыемствы. У Беларускім універсітэце культуры з народных песень пачалася навукова-практычная канферэнцыя. Тое, што можна было ўспрыняць як паўгадзінную рэкламу музычна-песеннай установы, стала па сутнасці далікатным напамінкам для выдаўцоў — на той прадмет, дзе яны жывуць і для якога народа выпускаюць літаратуру. Бо тут ўпершыню на абсягах былога СССР абмяркоўвалася пытанне недзяржаўнай выдавецкай дзейнасці і яе ўзаемадзеяння з бібліятэкамі рэспублікі.

Іх называюць прыватнымі, незалежнымі,камерцыйнымі, і кожнае з вызначэнняў па-свойму справядлівае. Сёння на прыватны сектар прыпадае 70% усёй кніжнай прадукцыі. Вядома ж, у канферэнцыі прынялі ўдзел не ўсе 1300 зарэгістраваных выдавецкіх суполак, а толькі самыя буйныя і вядомыя. Яны, разам з Фондам Сораса, і сталі яе фундатарамі. Гэта "Поліфакт", "Тэхналогія", "Каўчэг", "Асар", "Чатыры чвэрці", "Парадокс", "Лазурок", "Эрыдан", "Красіка-прынт" і іншыя.

Прысутнасць на адкрыцці аташэ па культуры пасольства ЗША, прадстаўнікоў урада, адміністрацыі прэзідэнта, Дзяржкамітэта па друку, Міністэрства культуры, а таксама ўдзел гасцей з іншых краін надало падзеі вагу і падкрэсліла яе значэнне ў культурным і грамадскім жыцці рэспублікі.

Арганізавана канферэнцыя факультэтам бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (дэкан А. Трусаў) сумесна з Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй.

На пленарным паседжанні выдавец А. Патупа прадставіў гістаграмы, на якіх адлюстравана дынаміка кнігавыдавецкай дзейнасці ў Беларусі за апошнія гады. Ён назваў "паралельнымі светамі" дзве існуючыя сістэмы — дзяржаўную і недзяржаўную і прывёў такія лічбы. У лепшыя часы "магутная пара" — "Мастацкая літаратура" і "Юнацтва" — разам выдавалі штогод 23 млн. мастацкіх кніг. У мінулым годзе — 1 млн., сёлета выйдуць 600 тысяч экземпляраў. Праблема дастаткова сур'ёзная і звязаная з моўнай. Праўда, сп. Патупа як прафесар не даў рэцэпта адносна таго, як выжыць беларускай кнізе ў нашых умовах. Бо гаварыў ён (зрэшты, як і большасць астатніх выступоўцаў) пра кнігу ўвогуле, безадносна да нацыянальнай культуры і яе патрэб. З яго вуснаў даведаліся мы і пра тое, што ў Беларусі выдавецкая справа не ўваходзіць у сістэму вытворчасці, дае нязначны прыбытак і з'яўляецца як бы "хобі для інтэлігентных людзей".

С. Емяльянава, дырэктар навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа АН Беларусі, зазначыла, што рынкавая сістэма абвастрыла праблему камплектавання бібліятэчных фондаў. З аднаго боку, камерцыйным выдавецтвам з бібліятэкамі супрацоўнічаць нецікава, бо гэта ўстановы, мякка кажучы, небагатыя. (Прынамсі, за трэці квартал навуковай бібліятэцы грошай не выдзялялася, камплектаванне адбываецца толькі за кошт арэнды). З другога боку, канстатавалася адсутнасць тэматычных планаў у прыватных выдавецтваў, а ў многіх выпадках — і выхадных дадзеных у кнігах, што дэманструе паліграфічнае бескультур'е і ўскладняе бібліяграфію. Тым не менш, працаваць трэба ў адной звязцы.

Што выдавецтвы—бібліятэкі—гандаль — адна ўзаемазвязаная сістэма, пацвердзіў старшыня ББА У. Лазараў, які меў магчымасць азнаёміцца з гэтай сферай у ЗША. Прыярытэт там аддаецца дзіцячай літаратуры і прапагандзе чытання, нягледзячы на развіццё відэаэлектронных сродкаў. "Пачатак любога руху насустрач —' інфармацыйны абмен", — падкрэсліў ён. Мэце такога абмену, наладжванню сувязяй, падагульненню вопыту і паслужыць канферэнцыя ва універсітэце культуры.

Праца па секцыях на другі дзень завяршылася паездкай у маёнтак Дудуткі вядомага мецэната, "былога пісьменніка", як ён сам сябе атэставаў, Я.Будзінаса. Там і адбыўся "круглы стол", на якім былі падведзены вынікі.

НАШ КАР.

Варункі

НАЦЫЯНАЛЬНЫ РАМАНТЫЗМ

Зараз, у цяжкія часы для беларускай нацыі, я ўсё больш задумваюся над лёсам іншых нацыяў, якія мелі ў сваёй гісторыі і нацыянальныя катастрофы і трагічныя паражэнні, але, нягледзячы ні на што, чароўна паўставалі-адраджаліся, як сфінкс з попелу. Адразу ж прыходзяць у голаў яўрэі, армяне, чачэнцы.

Расцярушаныя па ўсім свеце, яны, тым не менш, не зніклі як народ, пастваралі свае нацыянальныя дыяспары, трымаюцца адзін аднаго, дапамагаюць і жывуць у іншанацыянальным асяродку, як рыба ў вадзе. Менавіта таму некаторыя не любяць ні адных, ні другіх, ні трэціх.

Беларусы да яўрэяў, якіх было некалі шмат на Беларусі, ставіліся спакойна, адно пакепвалі. З гумарам піша пра іх Ф. Багушэвіч:

А што жыд да немец —
дзеці адной маткі:
І мова падобна
і адны ўхваткі.
І абодва ласы
на чужую працу...

Беларускія палітыкі ж ставіліся да іх паважана. Не дарма міністрам фінансаў у першым урадзе БНР быў Г. Белкінд.

Суровыя ўмовы выжывання, непрыхільнае асяроддзе як бы абвастраюць разумовы патэнцыял такіх нацыяў. Як быццам бы ідзе ўсеагульная каманда на генетычным узроўні: выжыць! І яны мацуюцца, выдаючы безліч разнастайных талентаў.

Але цікава, што дзелавая жылка ў іх заўсёды звязана з нацыянальным рамантызмам. Гэта як два бакі аднаго медаля.

Грандыёзны праект па аднаўленні з нічога, сярод пустыні, вярблюдаў і арабаў ізраільскай дзяржавы, а разам з ёю і рэканструяванай мовы, іўрыту, для абсалютнай большасці яўрэяў перапынак ва ўжыванні якой складаў не адну сотню гадоў, — удаўся! І гэта ці не подзвіг нацыі, падмацаваны ўсеагульным рамантызмам? Тое ж тычыцца і армянаў, якія, ідучы на велізарныя страты, на працягу тысячагоддзяў захоўваюць сваю мову, веру, нацыянальную адметнасць сярод варожага мусульманскага мора. Калі нават невялікі народ з'яднаны ідэяй нацыянальнага рамантызму, як чачэнцы сёння з'яднаныя ідэяй незалежнасці, якая ў большай ступені з'яўляецца ідэяй духу, а не страўніка, тады нішто не можа спыніць такі народ і нават вялікія імперыі падаюць перад імі на калені. Такія народы — вечныя, бо іх можна знішчыць толькі вынішчыўшы ўсіх дарэшты.

А той, хто думае адно пра кілбасу (да мне ўсё раўно на каком языку, толька б каўбаса ў халадзільніку была), вельмі часта яе і не мае. І ў гэтым таксама ёсць паслядоўная заканамернасць.

Той-сёй махнуў на Беларусь рукою. Як сказаў мне адзін знаёмы паляк: заўсёды ў вас будзе т а к. Але ж нам лепей відаць, мы бачым, што ў гэтым нашым сырым тутэйшым цесце ўжо бродзіць здаровая рошчына нацыянальнага рамантызму. У ім і толькі ў ім — наш паратунак.

Алесь БЯЛЯЦКІ

Пошта

ЛІСТ З БУДАПЕШТА

Пад маім пяром злёгку пагойдваецца ды парыпвае старэнькі столкніга; быццам бумкае штосьці ў тон думкам — няйначай падбадзёрвае, унікаючы ў маё самотна-адзінокае прывыканне да новага месца, людзей, мовы. Апынуўшыся ў аддзеленым ад маёй Беларусі аж некалькімі дзяржаўнымі межамі Будапешце, змушаная па першым часе днямі маўчаць, я сваёй "хвалёнай беларускай балбатлівасці" (згадваючы незабыўнага Уладзіміра Караткевіча) знайшла выйсце ў пісьмах — іх ужо стос. І гэтае, у "ЛіМ", наўрад ці апошняе.

Калі маё пасланне прыдасца да друку, дайце, калі ласка, загаловак "Ліст з Будапешта" — па аналогіі з лімаўскай публікацыяй "Пісьмо з Ізраіля" ("ЛіМ", 23.08.1996), на якую маю патрэбу спаслацца.

Сталася так, што гэты нумар "ЛіМа" чытаўся дома — у Брэсце, гартаўся ў дарозе і дачытваўся ўжо ў Будапешце вечарам "на сон". Тады і загаварылі ва ўнісон маім думкам і перажыванням не толькі таго клопатна-дарожнага дня вершы Яўгеніі Трасковай-Крупс:

Што нарадзілася яўрэйкай —
Я не хавала.
Ды толькі мне было
заўжды цяжэй.
Калі ж лісліва мне казалі:
"Ты на яўрэйку не падобна!" —
Адказвала такім заўсёды:
"Я не падобна? Ну дык што ж?
Яўрэй на мяне падобны!"

Якая простая, дакладная падказка для годнага развязвання таго пустога кола банальных гаворак на побытавым узроўні пра нацыянальнасць, нацыяналізм ды падобнае!

Я вельмі пашкадавала, што не трапілі на вока гэтыя радкі раней. Тым днём яны мне прыдаліся б двойчы. Першы раз — на берасцейскай мытні, дзе "лыжачкаю дзёгцю" было пытанне: "Вы зачем декларацию заполнили на белорусском языке? Кому он нужен?". Не брыдзячы душу бездапаможнаю злосцю, звычайна стрымана парыруеш на такое: "Мне он нужан". Цяпер буду адказваць спакайней: "Мне і ўсім добрым людзям, на мяне падобным".

Найдаўжэй у дарозе прабыла з полькаю паняю Тарэсаю, гаваркою ды вясёлаю. Вядома ж, ёй няцяжка было выпытаць: куды я, чаго і на колькі? То на развітанне, выказваючы падтрымку, яна мне выдала літаральна той самы "камплімент", што і ў згаданым вершы: "Смялей! Вы зусім на вашых непадобная. Каб не мова, я б сказала, што полька". Добра было б і на гэта дасціпна-павучальным тонам працытаваць маёй спадарожніцы: "Я не падобна? Ну дык беларусы на мяне падобны!" І пагадзіцеся, нясціпла гэта не выглядала б.

Як думаю, не палічыш, "ЛіМе", за нясціпласць мой зварот да ўсіх, хто там, на Беларусі, "падобны на мяне", хто ведае, як і што б я рабіла ў гэтыя перадрэферэндумаўскія дні. Прашу вас, — калегі і студэнты, землякі-мікалаўцы і суседзі, усе, з кім вучылася, працавала, каго вучыла — будзьма цяпер, як ніколі, падобныя адзін на аднаго! Будзьма заадно!

Валянціна МАРОЗ,
дацэнт, кандыдат
філалагічных навук
Венгрыя, Будапешт

Марцін КОЎЗКІ

ДОЛЯ ПРАЎДЫ

Памыляўся Пётр Міронавіч: насаджаў свінагадоўчыя комплексы без ачышчальных збудаванняў, жывёлагадоўчыя комплексы без кармавой базы, сянажныя комплексы, плітка ад якіх пайшла адно што на тратуары. Застаўся толькі стыль кіраўніцтва Пятра Міронавіча — на верталёце па вёсках, стыль, аб якім марыць сённяшні прэзідэнт, — каб баяліся.

●

— Прайграліся і трацім давер, распаўсюджваецца нацыяналістычная зараза, мусім пераконваць нечым іншым цяпер, мо спасылацца, што ў нас ні нафты, ні газу? — Не, і ў іншых няма радовішчаў, а хіба ў іх такое становішча? Патрэбна нейкая новая ідэя, хутчэй нават комплекс ідэй...

Так ці прыкладна так абмяркоўваліся ў адным кабінеце падзеі, калі вырашана было прапанаваць Беларусь Расеі.

●

Граніт, кажуць, выпраменьвае радыяцыю большую за іншыя горныя пароды. Дык што — гранітныя маўзалеі шкодныя? А як жа з правадырамі народаў?!

●

Запаведнікам даведзены планы нарыхтоўкі руднічай стойкі, каштоўных парод драўніны, адстрэлу звяроў на кілбасы. — Дзе "яны" заўтра будуць паляваць? — здзіўляюцца ў суседніх калгасах. — А што як заўтра загадаюць лясы карчаваць? Пачнём паліць пушчы, бо яны вярэдзяць "ім" душы. Асушалі ж мы некалі балоты дзеля ўласнай галоты. Ці ж гэта нейкія інтэрвенты доўжаць над намі эксперыменты?

●

Жонка міністра апранаецца як жонка намесніка міністра, жонка намесніка міністра — як жонка старшыні Кабінета Міністраў — не па рэгістру. Ці то ў міністэрш густу нямашака, ці то нямашака свайго Юдашкіна. Раіса ж Максімаўна таксама была з народа, а шанавала моду. І якую рабіла пагоду! Трэба, думаю, найперш, прызначыўшы міністраў, вучыць этыкету міністэрш. А тады ўжо — тудэма-сюдэма — удасканальваць сістэму.

●

Я Леха Валенсу асуджаю. Якія прэцэдэнты ён стварае. З электрыкаў у прэзідэнты — бывае. Але з прэзідэнтаў у электрыкі — на што ён там намякае?

●

Хто сказаў, што слова — срэбра? Бачыце, якія ў журналістаў рэбры? Незалежнае слова душаць і глушаць, да пары адлятаюць журналісцкія душы. Чацвёртая ўлада — гэта гучыць горда? Вы так лічыце? Мне вас шкода! Журналістаў бэсцяць, мораць голадам. Калі шчэ моўлена: маўчанне — золата.

●

З Жюля Рэнара. Паказаў нарэшце, на што ён здатны, між сабой і класікамі зацерушыў зеўры. Піша прозу амаль што выдатную, выдае калі не шэдэўры, дык паўшэдэўры.

ПРЭМІІ ПРАФСАЮЗАЎ: ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ ПАЧАЛОСЯ

З 1989 года, кожны няцотны год да Свята працы — 1 мая, прысуджаюцца прэміі Федэрацыі прафсаюзаў у галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і самадзейнай творчасці.

Сярод лаўрэатаў прафсаюзнай прэміі — Дзяржаўны акадэмічны народны хор імя Г. Цітовіча, вядомыя ў рэспубліцы самадзейныя калектывы — "Юнацтва" з Баранавіч, "Карагод" і "Памяць сэрца" з Мінска, "Камарыкі" з Наваполацка, "Радасць" з Магілёва, паэт У. Карызна, пісьменнікі У. Дамашэвіч і А. Кудравец, кампазітары У. Буднік і В. Войцік, кінарэжысёры М. Пташук і Р. Ясінскі, мастакі У. Савіч і В. Славук, скульптар М. Байрачны, патрыярх харавой музыкі ў Беларусі В. Роўда, мастацкі кіраўнік студыі "Сябры" А. Ярмоленка, музычны кіраўнік Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі А. Шпянёў, артысты тэатраў Л. Волкава, Л. Давідовіч і У. Куляшоў і многія іншыя. Інакш і быць не можа, бо стаць лаўрэатам прэміі самай масавай арганізацыі, якая стаіць на абароне сацыяльна-эканамічных правоў і інтарэсаў працоўных, вельмі аўтарытэтна і прэстыжна.

З кастрычніка г. г. прынята рашэнне аб умовах прысуджэння прэмій за 1997 год. Іх будзе:

чатыры прэміі ў галіне літаратуры і мастацтва, у тым ліку:

— за творы прозы і паэзіі — адна прэмія;

— за музычныя творы і канцэртна-выканальніцкую дзейнасць — адна прэмія;

— за работы ў галіне тэатральнага і кінамастацтва — адна прэмія;

за творы жывапісу, скульптуры, графікі і прыкладнога мастацтва — адна прэмія;

тры прэміі за дасягненні ў развіцці самадзейнай творчасці, у тым ліку:

— за актыўную работу па развіцці народнай культуры і самадзейнай творчасці працоўных — адна прэмія;

— за высокія дасягненні ў самадзейнай мастацкай творчасці (для дзіцячага і дарослага самадзейных калектываў) — дзве прэміі;

адна прэмія за работы ў галіне журналістыкі.

На атрыманне прэміі прымаюцца творы і работы, апублікаваныя, публічна паказаныя ці выкананыя за апошнія чатыры гады, але не пазней, чым за 6 месяцаў да ўстаноўленага тэрміну вылучэння на прэмію. Не могуць быць прадстаўлены работы, якія адначасова вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прэмій іншых дзяржаў, міжнародных прэмій або якія ўжо атрымалі такія прэміі. Колькасць паборнікаў на атрыманне прэміі ў групе аўтараў не павінна перавышаць 4 чалавек.

Вылучэнне работ на атрыманне прэміі праводзіцца працоўнымі калектывамі прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, абласнымі аб'яднаннямі і рэспубліканскімі камітэтамі прафсаюзаў, органамі культуры, творчымі саюзамі і арганізацыямі, міністэрствамі і ведамствамі Рэспублікі Беларусь.

Дакументы па вылучэнні на прэміі прымаюцца камісіяй у Федэрацыі прафсаюзаў *(г. Мінск, пр. Машэрава, 21, пакой 713) да 15 снежня 1996 года. Тэлефоны для даведак: 2-23-91-18, 2-23-95-83.*

ДА ЎГОДКАЎ АДАМА БАГДАНОВІЧА

На дабрачынныя ахвяраванні, сабраныя Мінскім клубам "Спадчына", адліты бюст Адама Ягоравіча Багдановіча. Помнік знаходзіцца ў Доме літаратара. Аўтар — Мікола Несцяроўскі.

Клуб "Спадчына" звяртаецца да Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, да Мінскага аблвыканкама і Крупскага райвыканкама, да Акадэміі навук РБ, Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, да музея Максіма Багдановіча, да Саюза пісьменнікаў і Саюза мастакоў, да выдавецтваў і грамадскіх арганізацый з прапановай стварэння ў самыя бліжэйшыя дні аргкамітэта па правядзенні юбілею Адама Ягоравіча Багдановіча — 135-х угодкаў з дня народзінаў (25. 03. 1862 г.) і ўстаноўцы яго помніка ў м. Халопенічы, на радзіме пісьменніка, этнографа, фалькларыста, выдатнага дзеяча культуры Беларусі і Расіі.

Хочам нагадаць, што да юбілею Адама Ягоравіча Багдановіча рыхтуецца і мэрыя Яраслаўля. Яна дала дазвол на ўстаноўку ў Яраслаўлі бронзавага бюста Адама Ягоравіча (скульптар Уладзімір Лятун) і правядзенне ў сакавіку 1997 г. у Яраслаўскім музеі-запаведніку мастацкай выставы, прысвечанай Максіму і Адаму Багдановічам з нагоды 5-х угодкаў адкрыцця ў Яраслаўлі музея Максіма Багдановіча і 135-х угодкаў з дня народзінаў Адама Ягоравіча Багдановіча.

Анатоль БЕЛЫ,
старшыня клуба "Спадчына"

Выставы

З ВЕРАЙ У БУДУЧЫНЮ

27 верасня ў фае Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры гучала музыка, а дакладней гучалі песні: "Вы шуміце, бярозы", "Жаўраначка", "Палыновая ростань" і інш. У музеі было свята. Свята з нагоды адкрыцця выставы, прысвечанай 50-годдзю творчай дзейнасці народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча.

Павіншаваць Ніла Сымонавіча прыйшлі сябры, прыхільнікі таленту паэта, афіцыйныя асобы. Сярод іх — намеснік міністра культуры Валерый Гедройц, надзвычайны пасол Рэспублікі Балгарыя ў Беларусі Марка Ганчаў, першы сакратар пасольства Украіны ў Беларусі Анатоль Блізнюк, віцэ-прэзідэнт АН Беларусі Радзім Гарэцкі, дэпутат Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч, паэты Алесь Пісьмянкоў

і Сяргей Законнікаў, кампазітар Эдуард Ханок і многія іншыя.

У гэты дзень, можа, нават і самому юбіляру не вельмі верылася, што прайшло ўжо паўвека з таго часу, калі ў пасляваенную вёску на Лагойшчыне прыйшоў ліст з Мінска, з рэдакцыі часопіса "Бярозка". У ім былі парады пачынаючаму аўтару, а самае галоўнае — было напісана, што адзін з яго верашў будзе надрукаваны. І, напэўна, памяць вяртала паэта ў той ліпеньскі дзень 1946 года, калі трымаў у руках і чытаў свой першы надрукаваны твор. Дарэчы, тая старонка "Бярозкі" з вершам "Яблынька" захавалася ў Ніла Сымонавіча, і побач з самаробнымі сшыткамі, у якіх занатаваны першыя нясмелыя спробы пяра, заняла адпаведнае месца на выставе.

Нам, музейшчыкам, асабліва прыемна, што Ніл Сымонавіч збярог, захаваў свае сшыткі з раннімі вершамі, з першымі публіцыстычнымі і літаратуразнаўчымі спробамі, з запісамі вуснай народнай творчасці і нават з папулярнымі песнямі, што гучалі ў вёсцы ў першыя пасляваенныя гады.

Сёння, калі выстава ўжо адкрыта, хочацца выказаць словы ўдзячнасці Нілу Сымонавічу за тое, што ён пагадзіўся, даў дазвол расказаць аб пройдзеным шляху, выкарыстоўваючы матэрыялы з асабістага архіва. Яны з'яўляюцца сведкамі творчых пошукаў і дасягненняў, удач і расчараванняў. Пажаўцелыя сшыткі з вершамі студэнцкай пары і рукапісы апошніх гадоў, сучасныя і даваенныя фотаздымкі, кнігі, дакументы — усё гэта стала набыткам нашага музея.

Дзякуючы арыгінальнаму мастацкаму рашэнню, якое прапанаваў мастак Генадзь Чысты (а працуе ён заўсёды з душой і непаўторна), мы змаглі адлюстраваць асноўныя моманты жыццёвай і творчай біяграфіі пісьменніка.

Матэрыялы першай залы распавядаюць пра родную Лагойшчыну і бацькоў паэта, пра трагедыю вайны, што дасюль рэхам адгукаецца ў сэрцах цэлага пакалення, і пачатак творчасці, пра вучобу ва універсітэце і навуковую дзейнасць як фалькларыста і літаратуразнаўцы, пра Гілевіча — грамадскага дзеяча і чалавека, чый аўтарытэтны голас вядомы далёка за межамі нашай Беларусі.

Талент Ніла Сымонавіча шматгранны, але галоўнае месца ў яго творчасці, як прызнаецца сам аўтар, займае паэзія. Пра Гілевіча-паэта — публіцыста, лірыка і гумарыста, паэта, які піша для дзяцей, песенніка і перакладчыка, паэта-грамадзяніна, які на працягу амаль усяго жыцця і творчасці змагаецца за правы роднай мовы, — ідзе гаворка ў другой зале выставы. З хваляваннем чытаецца вершклятва вернасці роднаму слову, што напісаны яшчэ ў пачатку 1947. Вось радкі, што прыйшлі ў душу і сэрца пятнаццацігадовага юнака:

А задумае вораг з чужога далёкага краю
Адабраць у мяне,
знішчыць родную мову маю —
Не дазволю.
Не дам.
Не прадам.
Не змяню.
І да смерці за волю яе пастаю.

Чытаеш і пачынаеш разумець, што ўсё зробленае Нілам Сымонавічам — гэта вынік годнасці і мужнасці, глыбока перажытага і асэнсаванага. І яго словы "І ўсё ж такі я веру...", што сталі назвай нашай выставы, гучаць сімвалічна, як сведчанне таго, што Ніл Гілевіч верыў і па-ранейшаму верыць у сваю зямлю, у свой народ, у яго будучыню.

Няхай жа гэтая вера знойдзе свой водгук у сэрцах чытачоў, а зерне, кінутае ім, упадзе на спрыяльную глебу.

Лідзія МАКАРЭВІЧ,
загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела музея
Фота Г. ЖЫНКОВА

Вечарыны

ПЕСЕННЫ ПАЭТ БЕЛАРУСІ

Генадзя Бураўкіна віншуе Станіслаў Багданкевіч.

Так назваў Генадзя Бураўкіна кампазітар Э. Ханок у сваім выступленні на творчым вечары Генадзя Мікалаевіча ў Доме літаратара, дзе 1 кастрычніка адбылося адкрыццё 21-га сезона.

Як пра таленавітага паэта, вядомага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, дыпламата і аднаго з актыўных актывістаў нацыянальнага Адраджэння Беларусі гаварылі на гэтай вечарыне пра Г. Бураўкіна старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў В. Зуёнак, намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Ю. Цвяткоў, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў краіны У. Ганчарык, народныя дэпутаты Вярхоўнага Савета РБ С. Шушкевіч, С. Багданкевіч, прэзідэнт Саюза прадпрымальнікаў рэспублікі У. Карагін і іншыя.

Віталі юбіляра і госці Беларусі — вядомы грамадскі дзеяч з ЗША Пол Мор, прэзідэнт Саюза прадпрымальнікаў Літвы І. Вясулас і прадстаўнік Масквы народны артыст Беларусі Я. Еўдакімаў, які выканаў добра вядомую ўжо шмат гадоў песню "Зачарованая мая" на верш Генадзя Мікалаевіча.

Перапоўненая зала цёпла прымала вершы, напісаныя юбілярам у 90-х гадах, якія чытаў аўтар на працягу амаль гадзіны.

Вяла вечар народная артыстка М. Захарэвіч.

Песні І. Лучанка, Э. Ханка, Э. Зарыцкага, У. Будніка, В. Раінчыка, В. Іванова, У. Дарохіна, І. Паліводы і іншых кампазітараў на вершы Генадзя Мікалаевіча выконвалі студыя "Сябры", Дзяржаўны канцэртны аркестр РБ пад кіраўніцтвам М. Фінберга і іх салісты А. Ярмоленка, М. Скорыкаў, А. Ют, Т. Воранава, Г. Грамовіч, Я. Навуменка, Н. Тамела, В. Касэнка і іншыя, а таксама С. Ханок.

З задавальненнем прынялі слухачы першы беларускі рок-н-рол "Каб не ты" на словы Г. Бураўкіна ў выкананні А. Ціхановіча і Я. Паплаўскай, а добра вядомую ва ўсіх рэспубліках былога СССР "Завіруху" спявала разам з імі ўся зала.

Гэты цудоўны вечар адбыўся дзякуючы дапамозе спонсараў — Саюза прадпрымальнікаў Беларусі і вядомага прадпрымальніка краіны У. Сенатарава.

П. ГАРДЗІЕНКА
Фота У. КРУКА

Меркаванне

ЦІ БУДЗЕМ СПЯВАЦЬ?

Здаецца, вельмі хутка Беларусь стане самай дэмакратычнай краінай. Выбары ў Вярхоўны Савет носяць перманентны характар і ім канца не відаць. Складваецца ўражанне, што функцыі прэзідэнта зводзяцца ў асноўным да падборкі пытанняў да чарговага рэферэндуму.

Вяршыняй дэмакратызму ў апошні час, трэба думаць, будуць два варыянты праектаў "новых" Канстытуцый Беларусі: і прэзідэнцкай, і парламенцкай. Да ўсяго трэба мець на ўвазе, што наш грамадзянін працягвае яшчэ прывыкаць да "старой" Канстытуцыі, узрост якой аж два гады. У духу дэмакратызму і выканаўчая, і заканадаўчая ўлады пайшлі ў "народ". Прэзідэнт атрымаў такое права па той прычыне, што ён сам з народа і з цяжкім дзяцінствам. Ды і каму, як не люду паспалітаму, яшчэ кандыдатам у прэзідэнты ён абяцаў вельмі зразумелыя рэчы: выбераце мяне — дам па тэлевізару, халадзільніку, катэджы паадбіраю, заводы запушчу. Сённяшняя прэзідэнцкая тэза: калі не атрымалі абяцанага, дайце мне ад свайго народнага імя неабмежаваныя паўнамоцтвы, тады ўжо пэўна ўсё выканаю.

І дэпутаты (хоць яны матэрыяльных дабротаў падарыць народу не здолеюць), і апальныя "маладыя юрысты", і банкіры, якія наладзілі, як лічыць кіраўнік дзяржавы, сабатаж ягонаму клопату аб народзе, і прадпрымальнікі, якіх пад гарачую руку Сам называе "вашывымі блыхамі", — усе апелююць да народа.

Праўда, заканадаўчая і выканаўчая галіны ўлады выступаюць у розных вагавых катэгорыях у іх магчымасцях "дайсці да Беларусі". Калі прэзідэнт уваходзіць амаль у кожную сям'ю праз дзяржаўныя радыё, тэлебачанне, газеты і часопісы, то дэпутатаў не вельмі паважае радыётэлевізійны начальнік сп. Кісель.

Адсюль і асаблівае становішча той самай світы, якая "робіць караля". "Каралі" заканадаўчай улады каралююць толькі ў зале Вярхоўнага Савета. Світа ж Лукашэнкі, наадварот, выйшла далёка за межы прэзідэнцкай адміністрацыі і ўяўляе цяпер вельмі дзіўны кангламерат. Тут і універсальныя барзапісцы, і пустаслоўныя тэле- і радыёгаваруны, тут і дэпутаты-"ціхары", якія прыніжана праз міліцэйскі кардон ідуць у прэзідэнцкі кабінет для інструктажу. Апошнім часам да кормнай світы далучаюцца асобныя згаладалыя прафесары, якія збіраюцца на сваё "собрание", каб упрасіць галаву ўраўняць іх з палкоўнікамі (?!). Не верыцца, але факт, што цяпер вучоныя "мужыкі" (па аналогіі прэзідэнцкага азначэння дэпутатаў) будуць не толькі дактарамі, але і палкоўнікамі фундаментальных і прыкладных навук. А чым яшчэ можна аддзячыць прафесарскую брацію, што скіравала ўсю сваю "тонкую матэрыю" на працісканне прэзідэнцкага загаду "За референдум 7 ноября"? Як тут не ўспомніць легендарнага Швейка, змушанага ў пэўнай сітуацыі ўслаўляць імператара.

Яскравай прыкметай сённяшняй дэмакратыі з'яўляецца арыентацыя выканаўчай улады як на прыезджых "служак", так і на тубыльцаў. Да спрактыкаваных краснадарца Акулава, які ўмудрыўся пабыць у якасці члена шмат якіх партый і аб'яднанняў, і сваёй гадоўлі прафесара-партыйца Антановіча далучаюцца "новыя тутэйшыя": Баранкевіч і Дашкевіч.

Функцыянальныя абавязкі тав. Баранкевіча, старшыні гэтак званага Беларускага патрыятычнага руху, здаецца, зводзяцца да пошукаў "трагічных памылак" ува ўсіх, хто не хоча ісці ў светлае ўчора. Не прызнаючы аніякіх аўтарытэтаў, вайсковец-пенсіянер часта трапляе ў канфуз: то бітву з расійцамі пад Оршай пераблытае з бітвай пад Смаленскам і агучыць гэта праз радыё на ўсю краіну, то ў ідэалагічнай мітуслівасці, пачаўшы ўшчуваць вядомага творцу, пераблытвае ягонае імя (гл. "Генерал пишет писателю". "Народная газета" за 20. 06. 1995 г.).

Сп. Дашкевіч трапіў на "вертыкаль", трэба думаць, за шчыраванне на ніве славянскіх сабораў. Смела кідаючы ў эфір такія выразы, як "палітычныя бамжы", "беларусы па пашпарце" ў адрас апанентаў Аўгусцейшага, Вячаслаў Іосіфавіч на добрай беларускай мове ўкладвае ў вушы грамадзян, што ўсе нязгодныя з існуючым рэжымам ёсць найміты Лондана, Вашынгтона, Тэль-Авіва...

Дакладна немагчыма сказаць, ці стваралі праект "новай" Канстытуцыі вышэйзгаданыя тлумачальнікі прэзідэнцкіх думак і дзеянняў. Вядома другое, што ажыццяўленне, нават праз рэферэндум, прэзідэнцкага варыянта — прамы шлях да дыктатарскага рэжыму на Беларусі.

Звычайна народ вельмі суцішна і нейтральна сустракае надыход адзінаўладдзя. (Гітлер, дарэчы, пяць разоў праводзіў рэферэндумы, праз кожныя паўтара года, і заўсёды атрымліваў падтрымку народа). Але гэта адбываецца не ў сілу прымальнасці народам дыктатуры, а з-за немагчымасці разабрацца ў падзеях. Пагэтаму толькі найбольш палітычна актыўная частка насельніцтва можа перашкодзіць усталяванню дыктатуры.

Успомнім, што БНФ і ПКБ яшчэ падчас увядзення інстытута прэзідэнцтва кожны са свайго пункту гледжання адзначалі тую небяспеку, якую нясе прэзідэнцтва. Пагэтаму і цяпер усе нацыянальна-патрыятычныя сілы прынцыпова адкідваюць хітрыкі ўсталявання дыктатуры праз г. зв. волевыказванне народа. Пацвердзілі свой негатыў да "новай" Канстытуцыі і да самой пасады прэзідэнта і беларускія камуністы.

Але ПКБ і ў такіх складаных абставінах спрабуе ігнараваць тую ісціну, што традыцыя еўрапейскай дэмакратыі грунтуецца на сістэме нацыянальных каштоўнасцей. Сентэнцыя В. Новікава аб тым, што нібыта тры пытанні майскага рэферэндуму 1995 г. аб мовах, сімволіцы і інтэграцыі з Расіяй Лукашэнка ўзяў у народа і тым выявіў яго патаемныя імкненні, якраз і сведчыць, што камуністы яшчэ летуценяць аб пабудове безнацыянальнага грамадства. Пагэтаму і дзеляць рэферэндумы часоў А. Лукашэнкі на справядлівыя і несправядлівыя. Цікава было б ведаць, да якога тыпу аднясуць камуністы магчымы рэферэндум аб забароне дзейнасці ПКБ?

Гледзячы па тэлеэкране, як у Століне на дажынках прэзідэнт падцягваў голасам толькі адну песню: "цыганка наваражыла... што буду спяваць", падумалася: ці не набліжаюцца на Беларусі часы сумнавядомага Нерона? Той таксама любіў спяваць...

Мікола АНЦЫПОВІЧ

ДРОБЯЗІ, ГІГАНТАМАНІЯ, ПАКАЗУХА...

Неяк наш папулярны радыёфакт уразіў нязвыклым паведамленнем. У горадзе Жлобіне — эпідэмія! Ці не праўда, які жах! Але не хвалюйцеся. Каб уратавацца ад небяспекі, медыкі-спецыялісты непатрэбны. Тут справа лекараў зусім іншай сферы.

Сыр-бор разгарэўся з-за таго, што жыхары горада масава кінуліся ў прадпрымальніцкую дзейнасць, прычым не "куплю-прадам", што асуджаецца ўладамі, а ў самую што ні ёсць вытворчую — уласнаручны выраб так званай мяккай цацкі. Невядома, якія забаўляльныя і эстэтычна-мастацкія якасці гэтых самадзейных вырабаў (пра тое ў інфармацыі не паведамлялася), але, не ў прыклад іншай прадукцыі дзяржаўнай вытворчасці, цяжкасцей са збытам тавару не бывае. Гандаль ідзе надзіва паспяхова і на мясцовым рынку, і ля магазінаў, і на іншых людных месцах. Асабліва прываблівае прадаўцоў прывакзальная плошча. Калі прыбывае чарговы цягнік (яны тут перасякаюцца з розных гарадоў рэспублікі, СНД і нават далёкага замежжа), вагоны проста аблепліваюцца шустрымі прадаўцамі. Ідзе такі бойкі гандаль, што службовым асобам не даступіцца, каб выканаць свае абавязкі па абслугоўванні цягніка.

Той, хто хоць крышку хварэе вірусам прадпрымальнай ініцыятывы, мабыць, прыкіне: "Калі ў гэтую стыхію ўнесці арганізацыйны пачатак, скажам, утварыць кааператыў ці арцель, або, як цяпер гавораць, асацыяцыю, то з'явяцца новыя рабочыя месцы, а для мясцовай казны, у сейфах якой, па словах кіраўнікоў, заўсёды гуляе вецер, дадатковыя грашовыя сродкі... І людзям добра, і ўладам выгадна..."

А вось у Жлобіне на гэтую справу паглядзелі інакш. Мабыць, памятаючы марксісцка-ленінскае вучэнне, што "дробнапрыватніцкая стыхія спараджае буржуазію", аб'явілі вытворцам адкрытую вайну. Як гаворыцца ў інфармацыі, іх праганяюць з гандлёвых месц, ловяць і адпраўляюць у аддзяленне міліцыі, складаюць пратаколы, рэквізуюць наяўны тавар, штрафуюць, як парушальнікаў грамадскага парадку, нават пагражаюць судом. А яны не сунімаюцца — у вытворчасць самадзейную ўсё больш уключаецца людзей. Міліцыі ўжо некалі займацца сваімі непасрэднымі справамі — трэба ганяць і лавіць гандляроў цацкамі, — скардзяцца праваахоўнікі.

Чую голас: "Прычапіўся да дзіцячай справы. Дробязь гэта..."

Канечне, дробязь у параўнанні, скажам, з былымі будоўлямі камунізму. Але ці варта забывацца на тую ісціну, што вялікае пачынаецца з малога? З гісторыі ж вядома, што некаторыя вараціцы сучаснай сусветнай эканомікі пачыналі з эканамічных дробязей, напрыклад; з падмятання вуліцы. І невыпадкова сёння многім прагрэсіўным палітыкам выхад з крызісу, перш за ўсё, бачыцца ў стварэнні малога і сярэдняга бізнесу.

Здаецца, у апошні час і ўлады павярнуліся тварам да гэтай справы. Так, адбыўся з'езд дзелавых колаў: з'явіўся ўказ прэзідэнта аб падтрымцы малога і сярэдняга бізнесу. Праўда, прадпрымальнікі не ў захапленні ад намечаных захадаў, бо яны ў многім, як і іншыя ўрадавыя дакументы, носяць дэкларатыўны характар. На іх думку, усё гэта трэба лічыць толькі першым крокам.

На жаль, мабыць, па інерцыі мінулых часоў, калі перавагі аддаваліся гігантам і гмахам, куды больш канкрэтныя дзеянні ўлад у адносінах да буйных прадпрыемстваў. У якасці прыкладу можна прывесці завод легкавых аўтамабіляў, які ўзводзіцца з дапамогай амерыканцаў — сусветна вядомых фордаўцаў.

...Колькі часу жыхарам сталіцы мазолілі вочы, псавалі гарадскі пейзаж стракатыя і неахайныя ларкі і крамкі, ці, як іх часцей называюць, камкі. А ў адну раніцу гараджане прачнуліся і былі нямала здзіўлены: замест няўклюдных збудаванняў выстраіліся, як шараговыя на паверку, новенькія прыстойныя гандлёвыя кропкі. Стандартныя, выкананыя з густам, яны радавалі вока, надавалі гораду парадку і чысціні.

Паводле марксісцка-ленінскай філасофіі, змяненне формы вядзе да змянення зместу. Мабыць, гэтым і кіраваліся бацькі горада, калі ажыццяўлялі сваю перабудову. Аднак на практыцы так не атрымалася. Абрыдлае "чаўночнае" прадпрымальніцтва "куплю-прадам" па-ранейшаму квітнее і пашыраецца. І як з ім быць — невядома. Памежныя пошліны? Але яны ў многіх выпадках перавышаюць вартасць самога тавару.

Што і казаць, наводзіць знешні бляск, паказуху і лакіроўку мы заўсёды, асабліва ў перыяд "камуністычнага раю", былі мастакамі. Ад гэтай хваробы пакуль не выратоўваюць нас і рынкавыя адносіны.

Надоечы на пр. Скарыны можна было назіраць незвычайны малюнак. Дужыя хлопцы, узброеныя ламамі і рыдлёўкамі, направа і налева разбівалі і крышылі вулічныя газоны, ператвараючы бетонныя бардзюры ў друз, якому месца толькі на звалачным палігоне. Гэта яны, мабыць, выконвалі праграму добраўпарадкавання сталіцы і старое аздабленне зялёных насаджэнняў мянялі на новае. Няхай будзе так, калі гарадской казне няма куды дзяваць грошай. Але, калі па-гаспадарску, ці нельга было старыя бардзюры выняць цэлымі і непашкоджанымі з разлікам на тое, каб выкарыстаць іх у іншым месцы? Напрыклад, на вул. Я. Коласа, дзе газоны такіх жа самых зялёных насаджэнняў не маюць ніякага аздаблення. Прабачце, але атрымліваецца па-савецку, адно будуем, другое руйнуем.

Хтосьці зноў заўважыць: зноў кінуўся ў дробязі, не вартыя ўвагі. Думаецца, у адказ будзе важна прыгадаць папулярную песню "С чего начинается Родина" і яе дакладныя словы: "..А, может, она начитается с картинки в твоем букваре?.."

Ці не з падобных "дробязей" пачынаецца і гаспадар, падкрэсліваю — гаспадар-уласнік, а не гаспадар-чыноўнік?

У апошняга адсутнічае такая рашаючая якасць, як пачуццё ўласнасці, а значыць, і ашчаднасці, што робіць яго падзёншчыкам, хапугам, лаўчылам, бюракратам, карупцыянерам. І не яны выведуць краіну з крызісу, які б ні ўсталёўваўся над імі кантроль. Сапраўдны выхад з цяжкага становішча, у якім знаходзіцца наша грамадства, распачнецца тады, калі ўрэшце будуць створаны ўмовы для фарміравання гаспадара-ўласніка: у вёсцы — на зямлі, у горадзе — у прамысловай вытворчасці. Ці не тады створыцца малы і сярэдні бізнес, пра які ўжо шмат гавораць, але мала што робяць? Замест гэтага чамусьці ўсімі шляхамі і сродкамі ўмацоўваюць уладу, быццам ёю можна замяніць вытворчую сферу.

А што датычыцца гігантаў, накшталт Апчацкага завода легкавых аўтамабіляў, напалавіну амерыканскага, то, здаецца, краіна насычана імі па горла. Цяпер з імі адны пакуты — ні прыватызаваць, ні нават прыхватызаваць. І невядома, як з імі быць.

Яўхім ІВАНОВІЧ

ВЕНІЯМІНУ АЙЗЕНШТАТУ — 75

Веніямін Айзенштат (друкуецца таксама пад псеўданімам Веніямін Блажэнных) родам з Копыся, што на Аршаншчыне. У 1920-х гадах сям'я пераехала ў Віцебск. Там напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны Веніямін скончыў першы курс гістарычнага факультэта Настаўніцкага інстытута. Разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў г. Багародск Горкаўскай вобласці (Расія).

Па інваліднасці ў арміі не служыў — настаўнічаў у школах Горкаўскай вобласці. У 1946 годзе з сям'ёй вярнуўся на Беларусь. З 1946 па 1953 год В. Айзенштат працаваў пераплётчыкам, быў мастаком камбіната бытпаслуг (1953—1974), а да выхаду на пенсію ў 1981 годзе працаваў у арцелі інвалідаў.

Пісаць пачаў у 1940 годзе, але друкуецца з 1982 года. Выступаў у маскоўскіх часопісах "Новый мир", "Знамя", ленінградскай "Звезде", латышскай "Даугаве", у калектыўных зборніках, у рэспубліканскай перыёдыцы. У 1990 годзе выдаў дзве кнігі: "Слух сердца" (Мінск) і "Возвращение к душе" (Масква). У 1996 годзе выйшла кніга "Сораспятие".

Віншуем Веніяміна Міхайлавіча з днём нараджэння! Жадаем яму доўгіх год жыцця, паэтычнага натхнення!

У "ШКОЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ"

Гэтая серыя, адрасаваная найперш вучням, папоўнілася кнігай Івана Пташнікава (выпушчана выдавецтвам "Мастацкая літаратура"). З ёй з цікавасцю пазнаёміцца і масавы чытач, бо змест зборніка склалі такія шырокавядомыя творы пісьменніка, як аповесці "Найдорф", адзначаная ў 1978 годзе Дзяржаўнай прэміяй імя Якуба Коласа, і "Лонва". Для аповесцяў, як і для ўсіх твораў І. Пташнікава, характэрны надзіва глыбокі псіхалагізм у абмалёўцы персанажаў. Напісаны яны з думкай пра народ і даюць нямала карыснага ў сэнсе маральнага, духоўнага ўзбагачэння чытача.

"ПОЛАЦАК", N 2

На развароце змешчаны партрэт Л. Геніюш, выкананы С. Герусам, і прыводзяцца яе словы: "Бацька і маці і родная мова для беларусаў — пытанне жыцця". Адкрываецца ж нумар словам галоўнага рэдактара часопіса С. Белай "Лісты з будучыні", што папярэднічае вялікай падборцы чытацкіх пісем, дасланых у рэдакцыю. Змешчаны артыкулы С. Белай і А. Белага "Вясна-96", Р. Завістовіча "Вялікі Сакавік", А. Грыцкевіча "Слуцкі збройны чын 1920 года: арганізатары, асноўныя чыннікі, маштабы і ягонае значэнне ў акрэсе гістарычнага лёсу Беларусі пачатку XX стагоддзя", В. Пуцко "Сакральнае мастацтва Беларусі XV—XVI стст. і еўрапейскія мастацкія стылі", А. Каўкі "У вянок Адраджэнцу" ("На 90-ыя ўгодкі Мікалая Улашчыка"). Пад рубрыкай "З архіваў КДБ" прапануюцца "Паказанні Яўхіма Кіпеля", падрыхтаваныя да друку У. Міхнюком. Перадрукавана з часопіса "Беларуская думка" (1969—1979, N 12—13) слова С. Жамойды "Светлай памяці Яўхіма Кіпеля".

Публікуюцца новыя вершы М. Сяднёва. Сам жа М. Сяднёў прадстаўляе вершы пенсіянеркі з Мінска, эканаміста па адукацыі Г. Хвель. Ёсць у нумары рубрыкі Згукі Бацькаўшчыны", "З жыцця эміграцыі", "Далёкае і блізкае".

***Пра адрозненне крытыкі і літаратуразнаўства неаднойчы гаварылася і нават дыскутавалася.- Якім чынам павінна весціся гаворка пра кнігі на старонках перыядычных выданняў — з пазіцыі акадэмічнага літаратуразнаўства ці "новай крытыкі"? І якой-такой мусіць быць "новая" крытыка? Можа быць, як самастойныя мастацкія творы? Відаць, правільным будзе пагадзіцца, што літаратурная крытыка мусіць утрымліваць у сабе розныя жанры.*

Сёння прапануем увазе чытачоў "ЛіМа" два матэрыялы, якія відавочна адносяцца да розных жанраў. Гэта рэцэнзія навукоўца Міхася Жураўлёва і "Крытычныя маналогі" маладога крытыка Ірыны Шаўляковай у сувязі з прачытаннем ёю зборніка эсэ Рыгора Барадуліна. Усё, так бы мовіць, "крытыка на крытыку", такім чынам маем адразу чатыры ўзоры крытычнай стылістыкі. Якой чытач аддасць перавагу — справа яго густу. І хаця пра густы не спрачаюцца, мы не супраць працягнуць размову пра тое, якую крытыку хацелі б вы чытаць на старонках нашай газеты. І, магчыма, атрымаць ад вас арыгінальныя ўзоры яе.

СІГНАЛЫ ВЯЛІКАЙ ТРЫВОГІ

Сучаснае літаратуразнаўства — навука комплексная. Для вывучэння мастацкіх твораў усё часцей прыцягваюцца катэгорыі і метады сумежных навук. Шырока прымяняюцца для аналізу мастацкай творчасці сацыяльна-палітычныя, маральна-этычныя, ідэалагічныя паняцці. Часам гэтым імкнуцца кампенсаваць недахоп паўнацэннага тэарэтыка-літаратурнага разгляду мастацкіх твораў, пакрысе змяншаецца ўвага даследчыкаў да праблем жанру, стылю і паэтыкі.

Сярод даследчыкаў, што імкнуцца пераадольваць такую заганную тэндэнцыю, вызначаецца актыўнасцю В.Жураўлёў. Гэта выразна праглядваецца ў яго новым навуковым даследаванні "На шляху духоўнага самасцвярджэння" (1995), якое ўскрывае істотныя прычыны недастатковай, альбо скажонай ацэнкі літаратурных з'яў мінулых гадоў. Даследчык умела пазбягае фармальна-структурнага альбо сацыялагічнага напрамку ў літаратуразнаўстве, умела суадносіць структурныя асаблівасці твораў з жыццёвай рэальнасцю.

В.Жураўлёў звяртаецца да ідэйна-эстэтычнага багажу лепшай, найбольш сумленнай часткі айчыннай літаратуры. Характарызуючы імкненне Якуба Коласа глыбей пранікнуць у сутнасць трагедыі селяніна-гаспадара, В.Жураўлёў адшукваe ў кантэксце "Новай зямлі" глыбокія асацыятыўныя думкі і не разгаданы раней сэнс.

Падрабязна характарызуецца цікавая і па-філасофску глыбокая ідэя алегарычнай навелы пра промень-неслух у паэме "Сымон-музыка". В.Жураўлёў спрабуе настроіць сімвал і алегорыю на ўзаемаадносіны з рэальным жыццём, звязваць іх з праблемамі гуманізму і ў сферы канкрэтных, непасрэдна практычных рашэнняў, і ў сферы глабальных і маштабных дзяржаўных інтарэсаў. Звяртаецца ўвага на тое, што коласаўская думка мае пэўнае дачыненне да пушкінскай традыцыі. Герой паэмы "Медны коннік" (1833) Яўген, як і промень-неслух, выяўляе аднолькавае стаўленне "да той вышэйшай і аўтарытэтнай волі і сілы, што быццам бы ўжо наўперад, без якіх бы там ні было разваг і хістанняў абавязвае ўсіх звычайных і смяротных людзей паслухмяна падпарадкоўвацца ёй і быць паслухмянымі выканаўцамі ўсіх яго загадаў". Праблема правадыра і натоўпу, дыктату і свабоднай волі чалавека наглядаецца і ў "Казках жыцця", у апавяданнях "Чыя праўда" (1921),

З ЖЫЦЦЯ ГАРОТНІКА

КРЫТЫЧНЫЯ МАНАЛОГІ З ПРАЛОГАМ І ЭПІЛОГАМ

Заўжды ўва мне,
наколькі мог спасцігнуць,
Дзве-тры душы
ў адным жывуць абліччы...
Джордж Гордан БАЙРАН

ПРАЛОГ

Каго з нас не "раздзіралі" пачуцці з нагоды таго ці іншага здарэння ці проста нейкай грымасы жыцця? Хтосьці ж сур'ёзна пакутуе на раздваенне асобы. Наш герой — адзін з такіх пакутнікаў, у душы ягонай таўчэцца цэлая плойма "кватарантаў", якія ніяк не могуць прыйсці да згоды. Адзначым адну асаблівасць: герой мае слабасць да літаратуры, а паколькі грубы свет не ацаніў ягоных тонкіх душэўных памкненняў, то слоўныя баталіі наконт лёсу літаратуры не выходзяць за межы "ўнутранага рынгу".

Такім чынам, дзеянне адбываецца ў самім героі. Дэкарацый — ніякіх. Мяняецца толькі асвятленне — у залежнасці ад настрою прамоўцаў. На гэты раз усе "маскі" завяліся з-за кнігі Рыгора Барадуліна "Аратай, які пасвіць аблокі". "Увасабленні" герояў змяняюць адно аднаго: падчас маналога выступаюць на авансцэну, а потым знікаюць у цемры. Заўважым, што пераўвасабленне павінна быць поўным, каб стваралася ўражанне мноства самастойна-адчужаных асоб.

МАНАЛОГ ПЕРШЫ
МІЗАНТРОП

Усе займаюцца не сваёю справаю. Калі ты паэт — дык і пішы вершы ці хоць бы паэмы, а яшчэ лепш —філіпікі. Дык не — цягне на "мемуары". Ізноў жа — "Аратай, які пасвіць аблокі". Чаму гэта ён, каб яго хто папытаў, замест таго, каб зямлю араць, пацёгся пасвіць аблокі? Ці пастухоў мала?

Што ж, назву гэтую хоць зразумець таксяк можна, прачытаўшы "сяброўскае слова" "Каб араллёю пахлі аблокі": "І дбае Кастусь Цвірка — аратай, які пасвіць аблокі, пра хлеб надзённы і пра хлеб духоўны, хоча, каб **Аблокі раллёю пахлі.**"

Рыгор Барадулін. Аратай, які пасвіць аблокі. Сяброўскае слова, эсэ і неканані-заваныя ўспаміны. Мн., "Мастацкая літаратура", 1995.

А як зразумець жанравыя вызначэнні асобных тэкстаў кнігі? "Сяброўскае слова, эсэ і неканані-заваныя ўспаміны"... Як, скажыце, суадносяцца з essai адказы на анкету часопіса "Нёман" 1991 года "Ці цяпер адродзімся, ці ніколі!", інтэрв'ю газеце "Комсомольская правда" 1993 года "Калі нямому вяртаюць мову..."? Слушна на гэты конт выказаўся Уладзімір Бярэзін у "Литературной газете" за 26 траўня 1996 года: "Паміж Мантэнем у круглым каўнерыку, бібліятэкай, кнігамі на мёртвых мовах і намі занадта вялікая дыстанцыя". Безумоўна, жанр эсэ перацярпеў прыкметныя змены і ўвайшоў у эпоху Пост са слядамі "пластычных аперацый", але згаданыя тэксты Рыгора Барадуліна не надта стасуюцца і з сённяшнім напаўненнем гэтага літаратуразнаўчага тэрміна.

Адзін са скразных матываў "Аратая, які пасвіць аблокі" — пакепліванне з маладых. Не раз і не два падпускае "хрэстаматыйны" шпількі "маладзейшай змене, якая ўсё і ўсіх адмаўляе" ("Будуць!"); змена гэтая настойліва сцвярджае сваё права "на калькаваную, сінтэтычную мову" ("Першы склад перад націскам") і да таго ж яна празмерна смелая і ўпэўнена дзёрзкая ("Ранішні і безабаронны"). Часам складаецца ўражанне, што ўпіканне маладых становіцца правілам "добрага тону" ў старэйшых літаратараў, хоць асабіста я маю вялікія сумненні, каб усе сталыя пісьменнікі чыталі творы "літаратурнай змены" з той жа рэгулярнасцю і грунтоўнасцю, з якой чытаюць саміх сябе, сваіх сяброў і даўніх апанентаў. А між тым, у выпадку з эсэ Рыгор Барадулін ідзе следам за некаторымі маладымі, якія "называюць" тую ці іншую форму іменем, якое абсалютна яе не датычыцца.

У чужым воку...

МАНАЛОГ ДРУГІ
ЛІРЫЧНА НАСТРОЕНЫ АЛЬТРУІСТ

Ах, якія гэта ўсё дробязі! І на Сонцы можна знайсці плямы, асабліва калі іх знарок шукаеш? Магчыма, і не супадаюць творы Рыгора Барадуліна з дакладна вызначанымі рамкамі эсэ, але ж у эсэістычнасці стылю яму ніхто не адмовіць. Уласцівыя гэтаму стылю вобразнасць, афарыстычнасць, суб'ектыўнасць, індывідуальныя аўтарскія інтанацыі хіба не дамінуюць у "Аратаі, які пасвіць аблокі"?! Каштоўнасць кнігі ў тым і заключаецца, што аўтар яе — найперш Паэт. Калі да "сяброўскіх слоў" падыходзіць як да тэкстаў уласна літаратурнай крытыкі, то, можа, некаму і не хопіць "аналізу", класіфікацый ды іерархічнасці. Але пісьменнік і не імкнецца штампаваць літаратуразнаўчыя "ісціны". Паэтавай душы люстра нібы "запамінае" адбіткі дарагіх людзей, кранальна-шчымлівых слоў, пакутлівых лёсаў. неспраўджаных вершаў і мараў. Адыходзяць сябры — губляеш частку сябе, паміраеш з кожным з іх. І хочацца данесці да тых, хто прыйдзе потым, святло, якім падзяліліся некалі з табою. Таму і "падсвечваецца" ледзь не кожны радок метафараю, эпітэтам; таму і завяршаюцца найбольш пранікнёныя празаічныя "словы" вершамі. Падзеі, факты, даты, пералік твораў — быццам толькі подступы да галоўнага, якое не можа Рыгор Барадулін выразіць паза гармоніяй паэтычнага радка. "Трыпціх", "Смяяўся, язык прыкусіўшы...", "Як у п'янку, уцягваешся ў Парыж" — роздумы-размовы з Васілём Быкавым, Міколам Хведаровічам, Барысам Заборавым, што часам "пераліваюцца" ва ўспамін, а часам поўняцца надзеяй на новую сустрэчу. Ды абавязкова пакідае пісьменнік сваім сябрам своеасаблівы вершадар, які нібы кандэнсуе паэтавы пачуцці. Нехта сам парадуецца гэтым радкам, а некаму з суразмоўцаў пачуюцца яны толькі рэхам былога шчасця: "Хоць гэта трэба было рабіць пры жыцці, напісаў я радкі, прысвечаныя Ларысе Геніюш.

...Птушка дакору, адчаю і жалю,
Вы цішыню распазнаеце ў гуле.
Нашай віны сняжалелую шалю
Вы сваім лёгкім крылом
Зварухнулі."

("Унучка Францішка Скарыны, альбо Зэк N 0-287).

Кожны інтэрпрэтуе рэальнасць у тых тэрмінах, якія найбольш адпавядаюць ягонай сутнасці. Парадаксальнасць мыслення, уласцівая Рыгору Барадуліну, — і ёсць крыніца адметнай, уласна "барадулінскай" метафарычнасці. Гэтая метафарычнасць не траціць сваёй унікальнасці, "адзінкавасці" і тады, калі аказваецца вынесенай за межы звыклай стыхіі верша і змешчанай у больш "рахманае" празаічнае асяроддзе. І пачы-

у алегорыі "Купальскія светлякі" і іншых. В.Жураўлёў слушна сцвярджае, што пісьменнік заўважыў паслабленне ў псіхіцы і свядомасці нашых людзей пачуцця нацыянальнай годнасці, памяці і іншыя павевы гістарычнага часу, пашыраў важнае кола агульначалавечай праблематыкі. Гэта асабліва выразна выявілася ў палемічным супрацьпастаўленні вобразаў Лабановіча і Рыгора Нязвычнага, галоўнага героя рамана Ц.Гартнага "Сокі цаліны". Розныя погляды на творы Якуба Коласа і Цішкі Гартнага як з'явы ў значнай ступені супрацьлеглыя выразна бачацца ў вырашэнні праблемы вучнёўства і настаўніцтва. Імкненне Лабановіча, навучаючы сялянскіх дзяцей па абавязку службы, дапамагаючы сялянам з меркаванняў высокай грамадзянскай адказнасці, унутранай культуры, вучыцца самому, думаць пра сваё самаўдасканаленне, вельмі перспектыўнае, арыентавана на будучыню. Ц.Гартны ж у паказе самога працэсу настаўніцтва і вучнёўства прытрымліваецца зусім іншай пазіцыі. В.Жураўлёў намагаецца зразумець, адкуль у героя Ц.Гартнага з'явілася універсальнае настаўніцкае права "вучыць, а не вучыцца", якая роля гэтага права ў рэальнасці. Рыгор Нязвычны дзейнічае ў межах вядомай бальшавіцкай тэорыі "пра бясспрэчны авангардна-настаўніцкі прыярытэт рабочага класа ў рэвалюцыйна-перабудовачных працэсах". Галоўная загана героя — настаўніцтва, месіянства, жаданне стварыць уласную тэорыю паводзін і ва ўсіх яе ўкараняць.

Адначасова з раскрыццём эксперыментатарскага духу рамана "Сокі цаліны" закранаецца праблема няпростага і нялёгкага шляху першапраходчыкаў у літаратуры, да ліку якіх адносіўся і Ц.Гартны, асвятляецца логіка лёсаў пісьменнікаў 20—50-х гадоў, якія вымушаны былі прытрымлівацца ідэалагічных установак у ацэнцы з'яў грамадскага жыцця і класавай барацьбы, натыкаліся на розныя іншыя заганныя тэорыі, міфы, ілюзіі і значна змяншалі патэнцыяльныя магчымасці талентаў.

Стваравуся ў час, калі ўжо закладваўся "трывалы падмурак" класавага падыходу да ацэнкі чалавека, і раман К.Чорнага "Сястра" (1927). Гэты твор К.Чорнага В.Жураўлёў разглядае ў суаднесенасці з такімі творамі рускай літаратуры, як раман Я.Замяціна "Мы" (1920) і аповесць А.Платонава "Катлаван" (1930), у якіх "вялікая аперацыя" расчалавечвання асобы паўстае як цалкам рэальная альтэрнатыва гісторыі, адчуваецца чаканне адкрытага супраціўлення націску на індывідуальны духоўны свет чалавека.

В.Жураўлёў прыходзіць да вываду, што раман К.Чорнага "Сястра" сведчыць пра наватарства пісьменніка і самастойную выпрацоўку маладой беларускай літаратурай уласнага вопыту, здольнасці чуйна настройвацца на праблематыку, без асэнсавання якой нельга было разлічваць на высокацывілізаваны, духоўна-гуманістычны і сацыяльна-эканамічны прагрэс грамадства. Раман несправядліва быў адсунуты на абочыну літаратурнай гісторыі, бо ўтрымліваў нешта вельмі істотнае для разумення нацыянальнай спецыфікі беларускай літаратуры, для развіцця нацыянальнай мастацкай думкі.

Небескарысным выглядае зварот В.Жураўлёва да добра вядомых беларускаму чытачу аповесцей Якуба Коласа "Адшчапенец" і К.Чорнага "Лявон Бушмар". Даследчык імкнецца звярнуць увагу на так званую падводную частку айсберга — унутраны сюжэт, сатканы з дэталяў, падрабязнасцей, з глыбокім і шматзначным падтэкстам. Дзякуючы гэтаму творы выходзяць з вузкага сюжэтна-фабульнага поля на больш шырокую эпічна-універсальную ўзаемасувязь з іншымі жыццёвымі пытаннямі. Тут і здольнасць, унутраная падрыхтаванасць чалавека з інстынктам індывідуаліста-ўласніка думаць і дзейнічаць, выбіраць жыццёвыя шляхі самастойна, і крытычны падыход да калгаснага і аднаасобніцкага жыцця, да праяў валявога і катэгарычнага націску на індывідуальную самабытнасць чалавека.

І ў першым раздзеле кнігі "Дыялог паміж "я" і "мы", і ў другім "Відушчая сіла сумнення" шматлікія ідэйна-эстэтычныя, светапоглядныя і метадалагічныя праблемы і катэгорыі В.Жураўлёў вырашае ў першую чаргу на беларускім матэрыяле. Праблему падаўлення творчай самастойнасці пісьменнікаў ён разглядае не толькі на прыкладзе лёсаў Я.Коласа і К.Чорнага, але і шматлікіх іншых пісьменнікаў (Янка Купала, М.Зарэцкі, Ц.Гартны, А.Мрый, Э. Самуйлёнак, З.Бядуля), якія, прымаючы ўдзел у стварэнні літаратурных міфаў і стэрэатыпаў, нягледзячы на таталітарны націск жорсткага кантролю і ўказанняў, усё ж знаходзілі ўдалыя мастацкія хады і сюжэтныя павароты, скіраваныя на шматмернае ўспрыманне рэчаіснасці. Як новы ўзровень гуманістычнасці ў дачыненні да чалавека-працаўніка разглядаюцца раман А. Чарнышэвіча "Засценак Малінаўка", аповесць А.Кулакоўскага "Дабрасельцы", трылогія М.Лобана "Шэметы", аповесць В.Быкава "Мёртвым не баліць" і іншыя творы, аўтары якіх адчулі моцны прэсінг просталінейнай і зневажальнай крытыкі ў 50—70-я гады.

Аб шырокім дыяпазоне назіранняў В.Жураўлёва сведчыць і тое, што ён памятае пра неабходнасць вывучэння айчыннай літаратуры ў святле агульных заканамернасцей гісторыі і тэорыі мастацтва. Асабліва часта прыцягваецца да аналізу творчы вопыт рускіх пісьменнікаў. Даследчык звяртаецца да прарочага слова геніяльнага Ф.Дастаеўскага аб вялікім і "боскім" у чалавеку (раман "Бесы"), аб відавочным уплыве яго мастацкай традыцыі, якая ацэньвае чалавека як найгалоўнейшае вырашальна-філасофскае звяно ў свеце і як тую сілу, што здольная выстаяць у самых жорсткіх абставінах.

У кнізе В.Жураўлёва настойліва падкрэсліваецца думка, што для паспяховага развіцця мастацкай творчасці неабходна пашырэнне дружбы паміж літаратурай і філасофіяй, якая з'яўляецца традыцыйнай у сусветнай літаратуры. Буйныя пісьменнікі заўсёды выступалі адначасова і арыгінальнымі філасафамі. Беларуская філасофія унікальная ў тым сэнсе, што не стварыла закончанага вучэння, не мае ніводнай завершанай сістэмы поглядаў. Можа, і адсюль у В.Жураўлёва назіраецца багацце доказаў і аргументаў, узятых з прац вучоных свету — рымскага імператара, военачальніка і мысліцеля Марка Аурэлія, французскіх філосафаў Ж.П.Сартра, М.Я.Гелера, рускіх філосафаў розных арыентацый А.Лосева, М.Устралава, І.Паўлава, М.Амосава, В.Несцярэнкі і іншых.

Працу В.Жураўлёва пранізвае ідэя, што рацыяналістычная тэндэнцыя ў беларускай літаратуры не спыняла гуманістычна-пошукавы рух і ва ўмовах, відавочна неспрыяльных для яе развіцця, хоць часам і мусіла звужаць сваю пазнавальна-эстэтычную функцыю. Больш таго, неспрыяльная абстаноўка ў нейкай меры нават спараджала тэндэнцыю абвостранага рацыяналізму і падтрымлівала яе адпаведны мастацкі тонус. Беларускія празаікі імкнуліся да патрэбнага майстэрства і смеласці ў галіне гістарычнай праўды. Аднак у літаратуры савецкіх гадоў глыбінныя пытанні прычынна-выніковых сувязей мастацкага дзеяння выяўляліся слаба, прычыны і вынікі ў працэсе асваення рэчаіснасці працяглы час адасабляліся і супастаўляліся паміж сабой толькі знешнім чынам або заўважаліся ў падтэксце. У сувязі з гэтым вельмі цікавым і карысным выглядае позірк В.Жураўлёва на літаратурны рух савецкай эпохі ў ракурсе прычынна-выніковай залежнасці паміж падзеямі і ўчынкамі людзей, у святле ўзаемаадносін паміж асобай і грамадствам.

Міхась НЯХАЙ

наеш разумець, што ёсць рэчы, якія **настойліва патрабуюць** спасціжэння. Але па тых ці іншых прычынах яны не могуць існаваць у прасторы верша. Паэту адкрываецца незнаёмая гармонія — гармонія прозы, што на першы погляд здаецца звычайнай, а на самай справе тоіць у сваёй "звычайнасці" пастку для неразумных і саманадзейных. Мудрых жа і ўдумлівых чакае трыумф: "Ля берага, воддаль ад мяне, стаіць па плечы ў вадзе бутэлька з-пад ліманаду, але з невыводным гарэлачным духам: акругліла пасінелы рот і гаворыць: "Усіх уцягну-у-у". Вецер, які набяжыць, хіба што зможа дадаць моцы яе голасу.

Пергаментна-сухі — леташні чарот" ("Каму пазваніць?").

"Аратай, які пасвіць аблокі" — кніга, існаванне, якой стала магчымым дзякуючы сінтэзу паэзіі і прозы. Менавіта гэты сінтэз увасабляе для Рыгора Барадуліна найбольш поўна і суладна выражаную праму пачуццяў, як некалі сінкрэтызм першабытнага мастацтва набліжаў першапродка да неспасцігальнага.

Незвычайная форма не будзе выглядаць штучнай толькі тады, калі яна напоўніцца зместам без ценю павярхоўнасці і паху цвілі. "Неканонізаваныя ўспаміны" Рыгора Барадуліна адразу ж уражваюць сваёй інфармацыйнай ды эмацыянальнай насычанасцю. Калі для самога паэта ўспаміны, напрыклад, Станіслава Пятровіча Шушкевіча былі "жывой гісторыяй" ("А ведаеце..."), то цяперашнім юным ужо зборнік "Аратай, якія пасвіць аблокі" распавядае пра людзей, што ўяўляюцца хутчэй легендамі, а не рэальнымі асобамі: амаль міфічнымі здаюцца сёння Уладзімір Караткевіч ("І коскі з месца не зрушу!..") і Міхась Стральцоў ("Конь гуляў па волі..."), Рыгор Бярозкін ("А пісаць Грыша ўмее...") і Анатоль Анікейчык ("Чорначупрынны, чорнабароды, дужы"). Міфы ж, як вядома, гучаць парознаму ў кожнага апавядальніка. Рыгор Барадулін бачыць сваіх сяброў такімі, якімі **ён хоча** іх бачыць. Таму так многа ў ягонай кнізе асабістага, суб'ектыўнага...

МАНАЛОГ ТРЭЦІ

СКЕПТЫК

Ну-ну, "суб'ектыўнага"!.. Я б сказаў — падкрэслена-суб'ектыўнага, з'едлівага і нервовага. А тая славутая "парадаксальнасць мыслення" ператвараецца часам у максімалізм, непрымірымасць, недаравальнасць. не перагорнеш і дзесяці старонак, як у каторы ўжо раз спатыкнешся аб "ЦК", "партыю", "марксізм", "дасье", "сталінска-чэкісцкі сацрэалізм", "ленінска-сталінскі рэжым". Яно, здаецца, і правільна: гаворка ідзе пра часы, якія проста немагчыма ўявіць без згаданых "рэалій". Але літаратура не даруе "перабору". Няхай сабе **справядлівыя** крыўда і гнеў прымушаюць пісьменніка вяртацца ўвесь час у думках да аднаго і таго ж. Ды нават "суб'ектыўны" жанр патрабуе цвёрдасці і разважлівасці. Інакш самыя пранізлівыя радкі, якія аўтару здаюцца надзвычай яркімі, ашаламляльнымі, атрымаюцца драбнавата-злоснымі, нематываванымі, не зусім лагічнымі, адным словам — "дзіўнаватымі": "Дасье ні на кога не пісаў. На сяброў тым болей. Таму і ўспаміны не могуць быць датавана дакладнымі. Дасьетчыкам лацно. Цэлыя кнігі атрымліваюцца" ("І коскі з месца не зрушу!..). Гэткае катэгарычнае выказванне далучае да "дасьетчыкаў" і людзей педантычных, якія па трыццаць-сорак гадоў вядуць дзённікі і таму могуць "дакладна датаваць" падзеі свайго жыцця, багатага не менш за барадулінскае на таленавітых сяброў і невымерныя страты.

Ці не ў кожным тэксце ўзгадваецца і Кніга ўсіх (ці, прынамсі, вельмі многіх) часоў і народаў — Біблія. Цяжка сёння звяртацца да яе, бо надта ўжо зашмальцаваная яна агульным "захапленнем". Колькі вякоў цытуюць людзі Біблію, але, відаць, толькі нашае стагоддзе здолела за досыць кароткі час расцягнуць яе па цытатах і цытатках, прыкрыць просты і невычэрпны сэнс моднымі лахманамі, якія імітуюць глыбокую Задуменнасць.

Рыгор Барадулін піша ў "Пастаяльцы нябёсаў", што "Біблія, у аўры якой спасцігаў свет Марк Шагал, дыктавала яму вобразы, давала апратку слоў фантазіі мастака". "Слова" пра Максіма Багдановіча — "Не разбіць, не спыніць, не стрымаць..." — завяршаецца своеасаблівым рэзюме: "Усё, як у Бібліі". Тут, здаецца, "біблейскія матывы" да месца. Але міжволі скептычна ўчытваешся ў радкі, дзе ў тым ці іншым выглядзе прысутнічае Кніга, — ці не сімптомы гэта "бібліяманіі"? Хочацца верыць, што не...

МАНАЛОГ ЧАЦВЁРТЫ

АПТЫМІСТ

Хочацца, дык і верце! Вам бы ўсё ныць ды плакацца. Самі ўсё ўздыхаеце, што вельмі цяжка спасцігнуць душу пісьменніка, прабрацца ў ягоную творчую лабараторыю. З вамі Рыгор Барадулін, можна сказаць, самым патаемным дзеліцца, а вы яшчэ носам круціце! Паслухалі хоць бы Уладзіміра Арлова, які лічыць, што "прыватнае жыццё пісьменніка заўсёды ўяўляе сабою каштоўны каментар да яго мастацтва" ("Нёман", 1996, N 6). "Аратай, які пасвіць аблокі" захоўвае сцэны з прыватнага жыцця не толькі Рыгора Барадуліна, але і вялікай колькасці тых пісьменнікаў, чые загадкі хвалююць нас сёння і з цягам часу будуць хваляваць яшчэ больш. Аўтар прапануе свае версіі "разгадак" некаторых лёсаў: "Цяпер, калі не стала Міхася, ці Мішы (як каму пяшчотней было называць), некаторыя калегі, каб хоць як узвысіцца ў сваіх жа вачах, пачынаюць крычаць пра сваё ледзь не мецэнацтва, падкрэсліваць любоў Стральцова да чаркі. Гэтак жа плявузгалі і пра Караткевіча. У так званыя застойныя часіны ў застолле ішлі, як у партызаны, уцякалі ад хлусні, ад маны, ад абавязку славіць догмы, уцякалі, душу ратуючы" ("Конь гуляў па волі..."). Напісана, можа, і крыўдліва, злосна ў адносінах да "мецэнатаў", аднак шчымліва-шчыра, нават пакутліва.

Шчыры Рыгор Барадулін да нястрыманасці. Ад трагічнага да смешнага ў "Аратаі, які пасвіць аблокі", нібы ў жыцці, — адзін крок. Побач з асобнымі "сяброўскімі словамі" і ўспамінамі, якія сапраўды можна назваць па-барадулінску "Евангеллямі жаху", — няхрыўдна смешныя, хоць часам і кплівыя "Прыбабунькі". А "прастакаватае і хітраватае, вясёлае і сумнаватае" "Здубавецця" пераконвае, што беларуская Ушаччына ні ў чым не саступае славутаму ці не на ўвесь свет балгарскаму Габраву.

Атмасфера "Здубавецця", дарэчы, нагадвае пра тое, што мудры смех чалавецтва не мае ўзросту: ён адначасова стары, як Сусвет, і неверагодна "юны", бы немаўля, якое толькі што нарадзілася. Так, наздвычай распаўсюджаная ў антычных камедыях сітуацыя "qui pro quo" дае плён і ў жыццёвай камедыі беларусаў:

"Жылі суседзямі мужык з яўрэем. Мужыкоў кнораз убіўся ў гарод да яўрэя. Той з прэтэнзіяй:

— Іван, а Іван! Твой свіны бык парыў мая ўся бульба.

— У мяне няма ніякага быка. Ёсць толькі кнур.

— Пад які там шнур. Ён парыў абы-як — і ўздоўж і ўпоперак".

("Свіны бык")

Многа ў "вушацкіх запісах" смешнага, многа і грэшнага, фрывольнага. Дык і мы гэтак жа жывём: бывае — цяжка, калінікалі — весела, а зрэдчас — і ў грэх які ўлезеш...

МАНАЛОГ ПЯТЫ

МАРАЛІСТ

"Зрэдчас"!.. Якая крывадушнасць!.. Як пачытаеш таго "Аратая...", дык складваецца ўражанне, што вакол Рыгора Барадуліна свет "піў, як у бот ліў" ды блудзіў.

"Фрывольны фальклор"!.. Гэтак сказаць — нічога не сказаць. Нават да фалічнага фальклору аднесці вакханаліі, апісаныя Рыгорам Барадуліным, можна з нацяжкаю. Вавілон! Садом і Гамора! Чым, вы думаеце, займаліся некалі пяцікласнікі ў школе?! "Расла цікаўнасць, расло неакрэсленае нецярпенне. Усё расло. І не дзіва, што недзе ў пятым класе мы, пераросткі, на задняй парце на ўроку фізікі адпаведна лінейкамі мералі свае агуростачкі. І тут кожнаму хацелася быць наперадзе. Да сорамнага смешна ўспамінаецца, што мы з суседам Сарокіным былі горда задаволеныя" ("На таку майго веку"). Магчыма, для кагосьці перамога ў падобных "спаборніцтвах" сапраўды ганаровая, але навошта пра гэта абвяшчаць усяму свету?!

А моўнае крэда Рыгора Барадуліна чаго вартае: "...у натуральнай гаворцы ў побыце моцнае слова стаяла з самым узвышаным і не было чыстаплюйства"... Няхай падобная "мешаніна" і выглядае бяскрыўдна дзенебудзь на вясковай лаўцы, а ў надрукаваным выглядзе яна проста шакіруе цнатлівыя душы.

Хоць у нечым тыя "Прыбабунькі" маюць рацыю — "які груган, такая і песня"...

МАНАЛОГ ШОСТЫ

ФЛЕГМАТЫК

І навошта так крычаць?.. Барадулін як Барадулін. Кніга як кніга. Не першая ў яго і не апошняя. Вось я шчэ яе не чытаў — і нічога, жывы, нават вельмі нядрэнна сябе адчуваю. Можа, пагартаю калі таго "Аратая...", а можа, — і ў рукі не вазьму. І вы як сабе хочаце... Толькі ў спрэчку навошта кідацца? Усё роўна кожнаму свая праўда бліжэйшая і раднейшая. Я таму і не чытаю нічога, каб спакусы не было падзяліцца ўражаннямі — за іх могуць і па шыі. Асцярожны я, прадбачлівы. Нашто сабе ворагаў нажываць? Ат, праўду кажуць: "Не столькі брагі, колькі звягі"...

...А з другога боку — не чытаўшы, дык у патрэбны час і не пахваліш — ізноў па шыі атрымаеш. Можа, і пачытаць таго "Аратая..." на ўсялякі выпадак?..

ЭПІЛОГ

Нашага героя супярэчнасці раздзіраюць і дагэтуль. Хутчэй за ўсё, ён так і не набудзе гнуткасці ды пластычнасці, не навучыцца жыць па законе "плаўных пераходаў". Колькасць ягоных "кватарантаў" змяняецца ў залежнасці ад абставінаў, але іх ніколі не бывае менш двух, адзін з якіх абавязкова не згодны з другім. Свабода думкі, што называецца...

P. S. Мараль: "Пашкадуйце гаротнага пакутніка!..".

Ірына ШАЎЛЯКОВА

ЦЯПЛО КУПАЛАЎСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ

1 кастрычніка ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Янкі Купалы, адбылося святкаванне Міжнароднага дня пажылых людзей. Супрацоўнікі бібліятэкі запрасілі да сябе старэйшых са сваіх пастаянных чытачоў, для якіх бібліятэка не проста месца, куды людзі ходзяць, каб самастойна набыць веды або іх удасканаліць, а для якіх бібліятэка стала "другім домам". Тут супрацоўнікі бібліятэкі ведаюць імя і імя па бацьку кожнага з іх і старыя людзі адчуваюць добразычлівасць і павагу да сябе. І дзякуюць за гэта. Дораць бібліятэцы ўласна створаныя карціны, перадаюць рэдкія кнігі, дапамагаюць рэстаўраваць старыя.

На вечарыну былі запрошаны паэт Уладзімір Карызна і яго сын кампазітар, таксама Уладзімір. Дарэчы, паэт з'яўляецца сябрам бібліятэкі і нярэдка прысутнічае на культурных мерапрыемствах, якія праводзяцца тут. На свяце ў зале бібліятэкі імя Купалы прагучалі вершы ў выкананні Карызны-старэйшага і песні Карызны-малодшага.

Купалаўская бібліятэка — гэта святло і цяпло душы ў сучасным халодным свеце.

А. АНЦАЛЕВІЧ

НЕ ДАЕ СПАКОЮ ПАМЯЦЬ

"Па дарогах памяці" — так назваў сваю кнігу вершаў Уладзімір Бараноўскі, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, былы партызан і салдат-франтавік.

Уладзімір Пятровіч — мой аднапалчанін, і прыемна, што зборнік ён пачынае са "Святла дружбы", верша, прысвечанага нашай роднай 348-й Бабруйскай стралковай двойчы ардэнаноснай дывізіі, якая прайшла шлях ад Масквы, дзе атрымала ў сорак першым сваё баявое хрышчэнне, да Берліна ў пераможным сорак пятым:

Кто с боями день и год
Шел к Победе честно,
Кто упал, шагнув вперед,
К высоте безвестной...

У. Бараноўскі — не прафесійны паэт. Проста — аматар паэзіі. І піша "ў сілу сваіх магчымасцей", час ад часу, калі прыходзяць настрой і натхненне. Асноўная тэма, вядома ж, франтавая. З вялікім жалем і горыччу піша былы воін аб таварышах па зброі, якія не дажылі да Перамогі. Сам Валодзя Бараноўскі ў 1944 годзе, тады зусім яшчэ бязвусы юнак, быў цяжка паранены пад Беластокам і толькі цудам застаўся жывым, хоць і страціў у рэшце рэшт левую руку.

Ці то ўсявышні дапамог, ці лёс,
Хоць кулі разрывалі гімнасцёрку, —
Я не застыў навек каля бяроз
Слупком фанерным
з пяцікутнай Зоркай...

У кніжцы аўтара-байца вершы на рускай і беларускай мове. Застаецца дадаць, што У. Бараноўскі да самай пенсіі, аж 35 гадоў, працаваў тэхнолагам, а потым галоўным мастаком-тэхнолагам Мінскай шпалернай фабрыкі.

Р. ТАРАСЕВІЧ

КОШТАМ КАЛГАСА

Сваю першую паэтычную кніжку "Родныя мясціны" выдаў былы настаўнік беларускай мовы і літаратуры Генадзь Козел. Нарадзіўся ён 30 мая 1930 года ў вёсцы Задзвея цяперашняга Баранавіцкага раёна, дзе жыве і па сённяшні дзень. Друкаваўся ў баранавіцкай аб'яднанай газеце "Наш край", у "Знамени юности". "Беларусі". "Вялікай славы мне не трэба", "Дружба з лесам", "Зямля", "Пачуй мяне, мой родны краю!", "Прапіска", "Не плачце, белыя бярозы", "Люблю пасевы аглядаць" — вось найбольш цікавыя творы Г. Козела.

Фундаваў зборнік паэзіі свайго земляка калгас "Шлях Леніна", а выдала яго накладам 500 экземпляраў Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня.

Міхась МАЛІНОЎСКІ

ЖЫВІЦЫ ПАХ І СВЕЖЫ ВОДАР МОВЫ

У аўтаркі, з якою ахвотна знаёмлю чытачоў "ЛіМа", ужо немалы жыццёвы і творчы вопыт. Нарадзілася Вольга Міхайлаўна ў Ташкенце ў сям'і вайскоўца-афіцэра. Школьныя гады правяла ў Расіі, двойчы сялілася ў Брэсце, пакуль нарэшце зладзіла тут сталае сямейнае гняздо. Не адразу, як і свой кут, прыдбала паэтка мову сваіх продкаў па маці. Доўгі час мы, берасцейцы, ведалі яе як аўтарку рускамоўных дзіцячых вершаў, прычым вершаў цікавых, напісаных з любоўю (Вольга Міхайлаўна выхоўвае з мужам пяцёра сыноў і пяцёра дачок). Па-беларуску пісала зусім рэдка і вершаў тых амаль нікому не паказвала. Сталае ж, канчатковае рашэнне перайсці на матчыну мову прыйшло год назад, пасля... майскага рэферэндуму. Заадно Вольга Міхайлаўна выйшла з літаратурнай суполкі "Полоцкая ветвь", з яе берасцейскага адгалінавання.

Не сумняваюся, што вершы, якія падаюцца ніжэй, будуць з цікавасцю ўспрыняты чытачамі. Вольга Беражанка ідзе ў паэзіі ад нацыянальнай міфалогіі і фальклору, ад шчодрай і шчырай жаночай душы.

Алесь КАСКО

Вольга БЕРАЖАНКА

ЗАМОЖНАСЦЬ

За пазухай каменне прынясу,
Вуглы пазначу сваёй хаты новай.
Ад воч чужых дзявочую красу
Схаваю і займуся пабудовай.
Нячысцікаў у хату не пушчу.
Хаціну пабудую выбітную,
Саўю вянок з валошак і хвашчу,
Улазіны да поўні прымяркую.
Не ўплішчыцца нячысцік: пеўня спеў!
Заможна зажыву, тут ёсць умовы:
Палескі ветрык, што ў акно ўляцеў,
Жывіцы пах і спелы водар мовы.

ВЕЧНАЕ ДРЭВА

Я дуб, я волат, я... зямное дрэва.
Вакол — маланкі, а ўгары — залева.
Куй зброю, Жыжаль, у падзем'і куй!
Пярун, маланкай бі ў яго, лютуй.
Так, кожнаму сваё: вам вечна біцца
(Хаця ніколі й не перамагаць),
Мне ж, волату, — трымацца і стаяць
Ад першай да апошняй навальніцы.

●

Палова жніўня.
Таямніча зіхацяць вялесавы дзянькі.
Іду ў зарэчны лес, на хутар, нацянькі.
Лягчэй за ўсё мне сёння перакінуцца
ў ваўка.
Я ледзь не выю.
Тугі кашчавая рука
Абхоплівае шыю.
Адно паўкроку да адчаю.
Якая справа да ўраджаю?
Хай ім жывуць вясковыя дзядзькі.
Павольнаплынная рака
Нясе вялесавы дзянькі.
Плыве сівое павуцінне.
Перакулюся я ў ваўка
Апоўначы ў той вунь адрыне.

●

Калі нуда, ці смутак, ці яшчэ якое ліха,
Шапчу сабе з усмешкай ціха-ціха
Заўсёды словы гэткія найперш:
— Мне хораша, ды будзе — лепш.
Калі на сэрцы і шчымліва, і трывожна,
Калі, здаецца, жыць ужо няможна,
Жыўлюся словамі такімі тым не менш:
— Мне хораша, ды будзе — лепш.
Калі баюся: не мінуць мне згубы,
Калі схіляюся, "Мне блага, любы..." —
За вуха ты мяне, жартуючы, бярэш:
— Нам хораша, ды будзе — лепш.

●

Як жыццё? Барані мяне Божа
Адказаць на пытанне ўсур'ёз.
Перакладваць на блізкіх ці можна
Нагрувашчаны цяжкасцей воз?
Знервавана. Іду. Снег — бы сажа.
Ды чамусьці ўсё марыцца, што
Нехта блізкі, спагадлівы скажа:
— Як жыццё? Зашпілі паліто...

●

На Крушынскай няма больш крушыны,
А на сэрцы спакою няма.
Кучавыя нясе аблачыны
Над настылай зямлёю зіма.
Высакоснай зімою трывожнай
Выпадаць і сыходзіць снягам.
Мусіць, гэтай парой бездарожнай
Непазбежнае выпадзе й нам...

●

Снег утаптаны, неглыбокі.
Гляджу ў збялелы твар зімы,
А бачу веснія аблокі
Ды чую сінія грамы.
Яны ўздымаюцца ўрачыста
Над гэтым тлумам гарадскім,
Над гэтым шэрым днём іглістым,
Жыццём імглістым, над усім.

●

Аслабелае сонца амаль што не грэе.
Зацяпліўся ліхтар у сутонні.
Я чытаю сынам Дарыяна Грэя.
Абапёрся Пятрусь кулачкамі на скроні.
Сын мой тварам — такі прыгажун...
За акном узнялася завея.
На крывінку сваю гляджу:
Гэта ён, гэта ён сэрца грэе...

ГАРЫ, ДУША МАЯ, БЯСКОНЦА!..

Імя Лявона Неўдаха не было для мяне навіной, я ўжо сустракаў яго пад даволі цікавымі публікацыямі прозы, а вось перададзеныя мне вершы Лявона прачытаў упершыню. Наваполацкі журналіст, інжынер па першай сваёй спецыяльнасці, шчыра ўзрадаваў мяне і адметным светаўспрыманнем, і непаказной філасафічнасцю, і ўпэўненым абыходжаннем са словам. Пасля знаёмства з вершамі ў мяне нават і не ўзнікла сумнення, што ў літаратуру прыйшоў цікавы паэт з адметным голасам, з чуйнаю душою, нераўнадушны і ўдумлівы...

Урэшце, чаго гэта я так узрушана даю ацэнкі? Самі пачытайце вершы Л. Неўдаха — і я веру, што і вам захочацца прывітаць новы талент.

Я ж ад усяго жадаю Лявону заставацца самім сабой, не спыняцца ў творчай дарозе і шчодра дзяліцца з намі сваёй паэтычнай споведдзю.

Генадзь БУРАЎКІН

Лявон НЕЎДАХ

ЗОРКА

Дзень памёрлы,
Хоць ён быў суровы,
Памяну па-людску, у журбе.
Хай цікуе зорка вечаровая —
Як агент сакрэтны КДБ.

Я наўмысна адхіну фіранку,
Буду піць з бутэлькі пакрысе...
А яна няхай блішчыць да ранку —
Пра мяне ўсё Богу данясе.

І зямлю, і воды, і нябёсы
Захінае цемра недарма.
Памяну радзіму безгалосую,
Што і ёсць, і ўжо нібы няма.

Мне б паставіць трэба Богу свечку
Без паклонаў гладкім святарам.
Мне б не быць пакорлівай авечкай
Ні дзяржаве,
Ні яе царам.

Памяну сябе, пакуль не згінуў.
Пашкадую сам сябе ў журбе.
...Што ж ты, зорка, мне глядзіш у спіну?
Памяну, дурніцу, і цябе.

ЛЕТА

Вось яшчэ раз да лета дажыў...
На змялелай Дзвіне састарэлай
Налятаюць на бераг дажджы
І туманам становяцца белым.

Што ж ты, сум мой, так рады яму?
Што ж ты, радасць, не любіш спякоты?
Дайце я вас мацней абдыму —
Вязні горкай маёй адзіноты.

Каб са мною сябе не губіць,
Ад мяне вы ўцякайце на волю.
Мне пара ўжо радзіму любіць,
Ды яе палюбіць я не здолеў.

Мне не страшна адрынута жыць.
На Дзвіне, дзе і я састарэлы,
Налятаюць на бераг дажджы
І туманам становяцца белым.

БАЦЬКА

Светлы хлопчык стаў маім сыночкам.
Светлае дзяўчо мне стане доняй.
Выкупаю іх у дзвінскіх ночвах
І спаўю на сон палескім лёнам.

Не трывожце вы маёй малечы:
Я цяпер нікому ўжо не веру —
Каб не толькі дроў на дзень насекчы,
Я трымаю вострую сякеру.

Баю-Бай:
...Чарнобыль сон трывожыць...
Люлі-Люлі:
...Я таксама грэшны...
А-а-а...
Усемагутны Божа,
Дай мне міг,
А дзеткам маім — вечнасць!

ТУМАНЫ́

Табунамі туманы
па лузе скошаным.
Я таксаам, як яны,
устрывожаны.
Імчу ў тайну, як у грот,
ночы вугальнай.
Не прымаю я аброць
з яе цуглямі.
Улагоджу цябе, смерць,
сваім сконам я.
Толькі дай ты мне займець
жытку вольную.
Непатрэбен мне курган
фараонавы
Стану белы, як туман,
па-над ворывам.
Не спасціг цябе, зямля
Беларусі,
Але ў пояс табе я
пакланюся,
За жывыя туманы
боскай літасці —
Ад Заходняе Дзвіны
і да Прыпяці.

ВЫГНАННІК

Мне шмат што ў свеце трэба зразумець.
Хачу душы пакрыўджанай здароўя
І болей да радзімы не хварэць
Хранічнаю сярмяжнаю любоўю.

Хачу на роўных з Богам гаварыць.
Аднак і тут ці буду я пачуты?
Паўвека ўжо як ён дае мне жыць.
А дзе жыццё?..
Усё — адны пакуты.

Мне скажуць, што я гэтакі блюзнер!
А хто ёсць лепшы у дзяржаўнай хаце?
Радзіма ледзьве дыхае цяпер —
Сыны і дочкі разграблі багацце.

На плошчы Вольнасці стаю я сярод іх
Выгнаннікам без роду і рахункаў
І з вуснаў злізваю засохлы след крыві,
Як успамін ад даўніх пацалункаў.

Я свечку на Дзяды для ўсіх зраблю —
Не згашаны яшчэ драбочак сонца
Ад Бога —
за радзіму,
за зямлю!..
Гары, гары, душа мая, бясконца!

г. Наваполацк

Цяпер, вядома, можна сцвярджаць што заўгодна: суадносіць дату на паштовым штэмпелі з загадкавай смерцю аднаго літаратара, якога ў тыя самыя дні знайшлі павешаным ва ўласнай кватэры; спрачацца, жаночай ці мужчынскай руцэ належыць буйны круглявы почырк, што не пакінуў на прысланым мне пульхным зялёным канверце зваротнага адрасу; строіць кпіны з маёй знаёмай, якая дагэтуль перакананая, быццам той канверт сапраўды захоўваў пах добрых ментолавых цыгарэтаў, хоць ускосныя дэталі дазваляюць датаваць рукапіс канцом 80-х ці самым пачаткам 90-х гадоў... Што да вядомага псіхіятра, якому я прапанаваў выступіць у якасці эксперта, дык ён, вяртаючы гэтыя чатыры дзесяткі драбнютна спісаных старонак, абмежаваўся цьмянай фразаю пра суму выпадковых велічыняў, дзе дапускаецца літаральна ўсё. Магчыма, якраз згаданая акалічнасць і схіліла мяне да публікацыі рукапісу без усялякіх купюраў і каментарыяў.

Уладзімір АРЛОЎ

КРАЯВІД З МЕНТОЛАВЫМ ПАХАМ

РУКАПІС ПРЫСЛАНЫ Ў ЗЯЛЁНЫМ КАНВЕРЦЕ

Апошнімі днямі я часта вяртаюся да свайго з'яўлення тут, у старой аднапакаёўцы, якая... Мне хацелася напісаць нешта накшталт "якая адыграла ў маім жыцці такую ролю", аднак роля працягвае іграцца, і я магу памыліцца ў вызначэнні парадкавага нумара дзеі. Урэшце, сама зацягваная метафара тэатра выглядае тут недарэчнай, хоць я і маю падставы называць гаспадара кватэры акторам. Але цяпер, калі падзеі таго дня, а дакладней той размовы, адрэстаўраваныя да паўтаноў і запісаныя ў памяці нібыта на відэастужку, якую можна спыняць, адкручваць назад альбо пускаць на запаволенай хуткасці, я магу сказаць, што актор ён быў кепскі. Ужо адзін спалоханы ўздрыг, калі на кухні ўключылася лядоўня...Альбо мізансцэна з трэцяй параю ключоў... Хоць гэта яшчэ як паглядзець...

Ён стаяў вось там, каля майго адзінага вакна. Няўжо ён імкнуўся захінуць тыя глыбокія сляды, пакінутыя на падваконні лапамі вераўчанае лесвіцы? А мо спадзяваўся схаваць іх ад самога сябе, як, дарэчы, і пакінуты мне ў спадчыну прайгравальнік? Наогул, цяпер мне здаецца, што — абдумана або інтуітыўна — ён рухаўся па кватэры дакладна вызначаным маршрутам, што дазваляў яму не сарвацца і давесці гаворку да канца, каб ніколі больш са мною не бачыцца.

Ён быў прыкладна майго веку, меў нервовы твар і раннюю сівізну. Я чамусьці падумаў, што такія людзі схільныя да інфарктаў. Дадаць да гэтага невыразнага партрэта мне, бадай, няма чаго. Ну, можа, яшчэ ягоную худзізну, якую я, памятаецца, спачатку з прыхільнасцю назваў сам сабе шляхетнаю.

Сустрэўшыся з ім на вуліцы, я прайшоў бы міма — не пазнаўшы, ці не захацеўшы пазнаць яго.

Кватэра, якую я вырашыў наняць, знаходзілася ў тым раёне, дзе з сучаснай забудоваю суседзілі зялёныя выспы старога патрыярхальнага горада. Няроўны брук з чародкаю козаў і цяпер успрымаецца там больш натуральна за асфальт з тралейбусам. Відаць, гарадская геаграфія і сталася галоўным аргументам, бо ў тыя дні я меў цвёрды намер бараніць сваю адзіноту і найперш шукаў спакою.

— Там, за паркам, — гаспадар кватэры паказаў у вечаровае вакно, — мяжа горада.

— Мяне гэта не палохае. Вальтэр пісаў, што літаратар павінен жыць паблізу мяжы, каб зручней было ратавацца.

— Вы літаратар? — не падтрымаў майго тону, але відавочна зацікавіўся ён.

Вылаяўшы сябе за легкадумна рассакрэчанае інкогніта, я няпэўна кіўнуў. Згадка пра род маіх заняткаў, безумоўна, была лішняю.

— У такім разе... — з выцвілай усмешкаю загаварыў ён і не скончыў.

Яго манера размовы пачынала раздражняць. Грошы ўжо ляжалі ў ягонай кішэні, а брыжык з ключамі — у маёй. Я атрымаў дазвол без абмежаванняў карыстацца кнігамі і пастараўся запомніць колькі непазбежных у такіх выпадках дробных парадаў наконт замкоў, ваконных зашчапак і талонаў на электрычнасць. Усе інструкцыі былі прамоўленыя скорагаворкаю, а заплачаныя мною грошы засталіся непералічанымі. Яшчэ хвіліну ён выдаваў чалавекам, што хоча як найхутчэй развязацца з не надта прыемным клопатам. Але зараз загучала новая, незразумелая мне нота.

— Увосень парк вельмі прыгожы. Асабліва клёны...

Жывучы тут, ён павінен быў ведаць, што гэта не зусім парк, а — старыя лютэранскія могілкі, па якіх гадоў дваццаць назад праехаліся бульдозеры. Я не палічыў патрэбным дзяліцца сваімі ведамі і конча ўпэўніўся, што нашая размова здоўжыцца.

— Вы збіраецеся жыць адзін? — запытаўся ён і папрасіў дазволу закурыць.

Просьба падкрэслівала мой новы статус і таму спадабалася, пытанне — не.

Ён зняў з кніжнай паліцы масіўную металёвую попелку — змрачнаватую чортаву галаву з адбітым рогам і глыбокімі пустымі вачніцамі.

— Гэта для вас істотна? — вярнуўся я да пытання, з кім збіраюся жыць.

— Ва ўсякім выпадку не ў такой ступені, як для вас, — адказаў ён і, адчуўшы сваю абсалютна неадпаведную сітуацыі рэзкасць, перапрасіў.

Якраз і тут уключылася лядоўня. Ён зацікавана здрыгануўся і, спалатнеўшы, выпусціў з пальцаў цыгарэту. Гэтага было дастаткова, каб уся мая ўквеленасць знікла, і я, як са мною часам здараецца пры сустрэчы з чалавечай слабасцю, адчуў такі прыліў шкадавання, што не прыдумаў нічога лепшага, чым паведаміць пра свой развод і прагу самотнага супакою.

— Як вы сказалі? Не хочаша пражываць чужое жыццё? — з дзіўнай інтанацыяй паўтарыў ён і строс попел у адну з чортавых вачніцаў. У ягоных тонкіх нервовых пальцах яшчэ жыла дрыготка. — Ну, тады ў вас...

Паводле сваёй завядзёнкі ён абарваў фразу і нечакана выняў другі камплект ключоў.

— Ведаеце, я пакіну вам і іх. Магчыма, у вас усё-такі хто-небудзь з'явіцца.

Пасля маіх слоў пра пошукі спакою гэтае дапушчэнне выглядала не зусім лагічна, аднак значна больш нелагічны быў яго наступны ўчынак. У нервовых пальцах з'явіўся ўжо трэці брыжык з ключамі. Гаспадар патрымаў іх на далоні і працягнуў мне.

— Няхай усе ключы будуць у вас. Дакучаць вам візітамі я не збіраюся. Калі спатрэбіцца, патэлефануеце. Цяпер толькі сакавік, значыць, засталося... Не думаю, што вы заўважыце нешта такое...

Я спачувальна выслухаў яго няўцямна-блытанае мармытанне і не звярнуў на апошнія словы амаль ніякае ўвагі. Што я павінен быў заўважыць? Што ў яго праблемы з псіхікай?

Апускаючы два дадатковыя камплекты ключоў у кішэню, я не сумняваўся, што візаві адчувае з гэтае прычыны палёгку. Разгадка магла быць досыць простаю: цяжкія успаміны, звязаная з кватэраю асабістая драма... Ці не алтуль, падумаў я, і ранняя сівізна.

Якімі наўна-трывіяльнымі выглядаюць мае тлумачэнні сёння...

— Ну вось, здаецца, і ўсе фармальнасці. — Патушыўшы ў вачніцы ў чорта недапалак, ён падняўся з канапы, аднак няўпэўнены тон сведчыў, што запас дзіўнаватых пытанняў і прапаноў не вычарпаны.

У такіх сітуацыях прадчуванне рэдка падманвае мяне. Ён прайшоўся ўсцяж сцяны з кніжнымі паліцамі, правёў рукой па запыленых карэньчыках і, няўдала зрабіўшы выгляд, нібы толькі зараз успомніў штосьці важнае, зноў загаварыў:

— Скажыце, у вас ёсць прайгравальнік?

— Не, я аддаю перавагу магнітафону.

— Прайгравальнік таксама добрая рэч. — У ягоным голасе прысутнічаў яўны водцень просьбы.

— Вядома, — суха пагадзіўся я. Да мяне вярталася раздражненне.

— Я хачу пакінуць вам прайгравальнік. Лічыце гэта падарункам.

Я стрымана падзякаваў і абвёў пакой вачыма, аднак неспадзяванага прэзента нідзе не заўважыў.

Нічога не ўдакладняючы, я выразна паглядзеў на гадзіннік, потым на дзве валізы з гаспадаровымі рэчамі і прапанаваў паднесці іх да тралейбуснага прыпынку. Ён адмовіўся. Псіхічная стома ад недагаворак умацавала ўва мне рашучасць. Заплачаныя за год наперад грошы давалі права зноў кінуць падкрэслены позірк на гадзіннік.

Ён паважыў у руках валізы і заміж таго, каб рушыць да выхаду, паставіў іх назад.

— Скажыце... вы любіце... Шапэна?

Цяжка было даць веры, аднак у яго словах мне пачуўся відавочны страх.

— Вы кампазітар? — холадна ўдакладніў я. Усе гэтыя неабавязковыя пытанні з зацягнутымі пярэрвамі і няўцямнай эмацыйнай падкладкаю імкліва падвышалі градус майго раздражнення.

— Кампазітар?.. Не зусім. Я проста хацеў...

— У Шапэна мне найбольш падабаюцца прэлюдыі, толькі вельмі прашу нічога больш мне не дарыць.

Адкуль я мог ведаць, што ў тыя хвіліны было сказана самае істотнае за ўвесь вечар.

Перад дзвярыма гаспадар яшчэ раз апусціў валізы на падлогу.

— Ён там, у шафе.

— Хто? — Ува мне падымаўся калючы жоўты клубок злосці.

— Прайгравальнік, — прабачліва, нават лісліва растлумачыў ён. — У сценнай шафе каля ложка.

Я адчуў тое самае, што і ў выпадку з ключамі: немаведама чаму ён імкнуўся пакінуць гэты прайгравальнік на старой кватэры.

Зачыніўшы нарэшце дзверы, я сеў за стол, паклаў перад сабою ўсе тры камплекты ключоў і з затоенай радасцю падумаў, што прынамсі год буду пазбаўлены візітаў чалавека, што мае схільнасць без дай прычыны дарыць прайгравальнікі і пытацца, ці любіце вы Шапэна.

Назаўтра я прывёз на таксоўцы сумкі з рэчамі, а ўвечары адкаркаваў пляшку сухога херасу і аддаўся ціхамірным лятункам аб тым, як за год перачытаю тут штабель чужых кніг і напішу адну сваю. Я прадбачыў, што атрымаецца зборнік апавяданняў свабоднага саракагадовага мужчыны, які своечасова звёў падрахункі з мінулым. Памятаючы Борхесава папярэджанне пра непрадказальнасць гэтага ўзросту для мужчыны наогул і для літаратара — асабліва, зазіраць далей не хацелася.

Віно скончылася нечакана хутка. Дапіваючы апошні глыток, я сустрэўся вачыма з масянжовай стодкаю Шывы на кніжнай паліцы. Напэўна, гэта чатырохрукае стварэнне і падкінула мне ідэю правесці ў новым жытле інвентарызацыю.

Стараючыся не згадваць самога гаспадара, я прызнаў, што інтэр'ер ягонае кватэры можа прэтэндаваць на пэўную неардынарнасць і найперш — дзякуючы сцяне, якую ад столі да падлогі займала геаграфічная мапа Еўропы. Прычым яна, гэтая жоўта-брунатная з плямамі блакіту мапа, была не проста наклееная на тынк накшталт шпалераў, але ўзятая, нібы жывапіснае палатно, у адмысловую драўляную асаду, што па пару пядзяў адступала ад паверхні, ствараючы своеасаблівую перспектыву. Мапа як быццам адкрывалася воку з шырокага акна, куды злева не трапляла толькі Пірэнейская паўвыспа, а справа — Уральскі хрыбет. Унізе лінія абрэзу праходзіла прыкладна на шыраце Крыму, пад якім уладкаваўся стол-кніжка. Праваруч гэтага "вакна" цягнулася сцяна, цалкам занятая самаробнымі паліцамі з кнігамі ды двума-трыма тузінамі пустых рознакалібравых пляшак з размаітымі налепкамі, што захапілі ўвесь верхні ярус. На трэцяй зверху паліцы ў атачэнні дзесятка шматкалёрных бляшанак з-пад піва і атабарыўся чараваты шматрукі бажок з круцельскім выразам на льняна-тлустым твары. Бажок пазіраў у сапраўднае вакно. Суседні дом стаяў вельмі блізка, і шчытная чорная штора, якая спадала ніжэй за падваконне, не выглядала лішняй.

Годнае месца ў пакоі належала шырокаму ложку-канапе злева ад дзвярэй. Сцяну над ложкам закрывалі панелі з бардовай скуры. (Таго разу я не звярнуў увагі, што сям-там скура падрапаная нечым вострым кшталту кашіных кіпцюроў.) Збоку ад вакна, над спальным кутком, сцяну аздабляў гадзіннік у адмысловым драўляным корпусе з вакенцамі і вежачкамі. Праўда, сам гадзіннік быў электронны і мераў час не стрэлкамі, а зялёнымі лічбамі.

Не падымаючыся з ложка, можна было націснуць на некалькі* ўштукаваных у панель жоўтых клавішаў. Першая ўключала дабіты чорна-белы тэлевізар, другая — люмінісцэнтную лямпу над пісьмовым сталом паміж вакном і мапаю, трэцяя — вентылятар на століку-кніжцы, дзве наступныя сваіх функцыяў аніяк не выявілі, а апошняя прынесла прыемную неспадзяванку: дзесьці пры падлозе ўтульна запалілася мяккая падсветка мапы. Калі патушыць у пакоі астатняе святло, "вакно ў Еўропу" глядзелася асабліва маляўніча.

Дзверы ў пакой мелі матавае шкло і адчыняліся ўсярэдзіну. Выхад у пад'езд вартаваў, седзячы на пыльнай антрэсолі, памаранчавы плюшавы сабачка. Я выйшаў на лесвічную пляцоўку і націснуў гузік званка. Сабачка заскакаў і зайшоўся вясёлым брэхам. Дзверы зачыняліся на ланцужок і на тры замкі. Я падумаў, што гэта занадта і наважыў карыстацца двума. У сумешчанай з туалетам ваннай нічога прыкметнага, апрача вялікага павука, не сустрэлася.

Усё, што я пішу зараз, можа здацца занудліва-неістотным, але я адчуваю неабходнасць зафіксаваць гэтыя дробязі, бо неўзабаве літаральна кожная з іх набудзе велізарную значнасць.

Канец вечара быў далёка, і я прыступіў да больш блізкага знаёмства з пакінутымі мне аматарам Шапэна рэчамі.

У сценнай шафе пры ложку ляжалі дзве коўдры і дзве падушкі. На ніжняй паліцы стаяў прэзентаваны мне прайгравальнік. Падбор кружэлак выглядаў досыць стракатым: Вівальдзі, сярэднявечная лютнявая музыка, "The Beatles", санаты Чурлёніса, "Песняры" і два маленькія дыскі дзіцячых казак. Запісаў Шапэна насуперак чаканню не аказалася.

У дадатак да мапы і гадзінніка ў кватэры прысутнічала яшчэ адна рэч з прэтэнзіяй на арыгінальнасць. Паміж дзвярыма і кніжнымі паліцамі месціўся акаваны медзяю куфар, зроблены, відавочна, не вясковым майстрам, а гарадскім імітатарам, якому не хапіла густу, і ён прымалаціў на пярэдні бок пяць медных літараў: SEZAM. (Светлыя драпіны на фарбаванай драўлянай падлозе, якія сведчылі, што гэтую частку абсталюнку — і няраз — падцягвалі да дзвярэй, я заўважу значна пазней.)

Куфар быў пад самае вечка наладаваны розным жалеззем і інструментамі, паўзверх якіх ляжала вераўчаная турыстычная лесвіца з жалезнымі кіпцямі-зачэпкамі. З выгляду яна наўрад паспела паўдзельнічаць у сур'ёзных падарожжах. Пакруціўшы знаходку ў руках, я змеціў заводскую налепку з даўжынёю — 10 м і механічна адзначыў, што гэтага якраз хапае, каб спуціцца па сцяне з майго трэцяга паверха.

Пакінуўшы ў спакоі куфар, я заняўся кнігамі. Перад сном заманулася пачытаць, і я зняў з паліцы лімонавы том Акутагавы Руноске. Паміж старонак "Жыцця ідыёта" знайшоўся лісток з вучнёўскага сшытка ў кратку. Дзіцячая рука фламастэрам намалявала на ім пяціпавярховік з жаночым тварам у вакне трэцяга паверха. Малюнак не меў у сабе нічога незвычайнага, а вось надпіс збянтэжыў і нават трохі занепакоіў мяне. "ГЭТА НЕ МОЖА БОЛЬШ ПРАЦЯГВАЦЦА НЕ МОЖА". Словы, дзе хавалася трывога, а мо і роспач, належалі відавочна не дзіцёнку, хоць і былі напісаныя буйнымі друкаванымі літарамі, што тоўпіліся і, як сляпыя, натыкаліся адна на адну. Так мог пісаць чалавек на моцным падпітку альбо ў скрайняй расхваляванасці.

Тут, безумоўна, таілася нейкая загадка, і яе бударажлівае адчуванне абяцала пераўтварыцца ў сюжэт, а потым у навелу.

Паляжаўшы колькі хвілінаў у цемры, я павярнуўся да сцяны-мапы і ўключыў падсветку. На жоўта-зялёнай прасторы хутка ўдалося знайсці Парыж, а за ім — Лондан, Стакгольм. Дом аддзяляла ад вуліцы такая адлегласць, што шум транспарту сюды не далятаў. Чорныя кропкі з назвамі еўрапейскіх сталіцаў зрушыліся з месца і закружыліся ў карагодзе. Я дрымотна націснуў клавішу на панелі і засынаючы паспеў усцешана падумаць, якія ціхія вечары чакаюць мяне напярэдадні.

Другі камплект ключоў спатрэбіўся нашмат раней, чым я меркаваў.

Я наняў кватэру ў сакавіку, а на пачатку наступнага месяца яна ўжо чула жаночы голас.

Як і абсалютная большасць такіх знаёмстваў, нашае — ад сустрэчы на прыпынку таксі да пакінутага нумара тэлефона — было наборам банальных слоў і ўчынкаў.

(Працяг на стар. 11)

Цалкам тэкст будзе надрукаваны ў адным з бліжэйшых нумароў часопіса "Крыніца".

МАСТАК І ГІСТОРЫК

З кастрычніка споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння мастака Мікалая Васільевіча Дучыца. Яго імя, на жаль, зараз амаль што забыта. А дарэмна, таму што творчасць майстра сёння можа служыць добрым прыкладам нягучнай, але па-сапраўсднаму шчырай любові да Бацькаўшчыны.

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны экспануецца унікальная серыя работ мастака пад назвай "На руінах Мінска". Яны былі напісаны ў 1941—1944 гг., таму ўяўляюць адначасова мастацкія творы і каштоўныя гістарычныя помнікі аднаго з самых цяжкіх для Беларусі перыядаў. Як тысячы іншых простых мінчан, М. Дучыц не здолеў своечасова пакінуць палаючы Мінск і апынуўся пад нямецкай акупацыяй. Сюжэтную канву серыі "На руінах Мінска" складаюць выявы вуліц, плошчаў, асобных будынкаў горада, па якім прайшлася жудасная маланка вайны. Уражвае рэзкі кантраст паміж яркімі, сочнымі фарбамі карцін і сумнай рэчаіснасцю іх зместу. Здаецца, што такім чынам мастак імкнецца нагадаць пра колішнія мірныя дні Мінска і адначасова спадзяецца на яго адраджэнне ў будучым.

Усіх прыхільнікаў добрага жывапісу, а таксама гісторыі роднага Мінска музей запрашае пазнаёміцца з невялікай, але вельмі цікавай старонкай творчасці таленавітага беларускага пейзажыста. Музей выражае шчырую падзяку сям'і М. Дучыца, асабліва ягонай унучцы — кандыдату гістарычных навук Людміле Уладзіміраўне Дучыц, за дапамогу ў арганізацыі выставы і перадачу ў дар музею шэрагу работ майстра.

Ірына ВАРАНКОВА,
намеснік дырэктара музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

ПАКЛОН ТАБЕ, АКТРЫСА КОРХАВА!

Яе любяць тэатралы Гомеля і вобласці. На "яе" ходзяць. Так, так, размова ідзе пра цудоўную актрысу нашага абласнога драматычнага тэатра. Пра Людмілу Канстанцінаўну Корхаву. Падымем заслону, скажам, хоць і не прынята гэта ў дачыненні да жанчын, колькі ёй год: споўнілася 50. І колькі было кветак, цёплых слоў, падарункаў!

Амаль за 30 год працы на роднай Гомельскай сцэне Людміла Канстанцінаўна сыграла шмат розных роляў — сябры і калегі дапамаглі асобныя з іх нагадаць тэатралам у час бенефісу. Гэта і Смерць у "Ладдзі роспачы" У. Караткевіча, ролю, якую яна сама, дарэчы, у многім лічыць этапнай у сваёй творчасці; гэта прыгожыя і не вельмі, шчаслівыя і не надта жанчыны ў спектаклях "Мачаха" Анорэ дэ Бальзака, "Зойчына кватэра" М. Булгакава, "Спартыўныя сцэны.." Э. Радзінскага, "Апошні парад" А. Штэйна. І многія, многія іншыя.

На яе вечарыне заслужаную артыстку Беларусі віншавалі з юбілеем старшыня абласнога Савета дэпутатаў В. Сяліцкі, начальнік упраўлення аблвыканкама А. Маісеенка, старшыня гарадскога Савета дэпутатаў С. Гальдадзе, старшыня Цэнтральнага райвыканкама У. Давідовіч, загадчыца кафедры Беларускай акадэміі мастацтваў Л. Манакова, галоўны рэдактар "Гомельскай праўды" В. Логвін, мастацкі кіраўнік мазырскага драмтэатра імя І. Мележа В. Ласоўскі, які, дарэчы, вучыўся разам з Корхавай у Беларускім тэатральным інстытуце, калегі з Незалежнага тэатра, старшыня абласнога жаночага савета В. Кашавенка, старшыня аб'яднанага Савета прафсаюзаў В. Ахлесцін, прадстаўнік фонду Сапегі Андрэй Толчын...

Усім ім актрыса сказала: "Дзякуй! Вялікі дзякуй!" і закончыла бенефіс словамі адной са сваіх гераінь: "А я лячу! Лячу! Лячу!"

Шчаслівага палёту табе, Людміла Канстанцінаўна!

Васіль ТКАЧОЎ

"ВЕЧНЫ ГОРАД" — ВЕЧНЫ...

Мінулым летам трое беларускіх мастакоў і фотамастакоў на падставе ўдзелу ў конкурсе Фонду Сораса атрымалі грант на падарожжа і вывучэнне трох еўрапейскіх гарадоў, што адпаведна вызначылі ў розныя перыяды сусветнай гісторыі напрамкі культурнага і мастацкага развіцця — Рым, Афіны і Іерусалім. Мяркуем, што пазнаёміцца з уражаннямі, са спецыфічным мастакоўскім поглядам, з фотаадлюстраваннем гарадоў будзе цікава і нашаму чытачу. Першаму прадастаўляем слова мастацтвазнаўцу Міхалу Баразне, які ў якасці фотамастака наведаў Рым.

...Прамільгнулі за вокнамі аўтобуса казачныя краявіды Чэхіі, Аўстрыі і Паўночнай Італіі. Урэшце — Рым. Канец ліпеня. Спёка. Адразу ж адчуванне агульнай рухомай жывапіснасці. Фактуры шалупення старых фарбаў і тынкоўкі, абарваныя новыя афішы, надпісы розных колераў маляўніча "перапаўзаюць" са сцяны на сцяну...

Шкада, што на словах не перадасі пах і гукі "вечнага горада". Гукі Мінска — нешта універсальнае, зусім не адметнае. Сірэны "хуткай дапамогі", паліцыі, грукат матаролераў, стракатанне цвыркуноў — найвыразная частка рымскага жыцця. Смецце на вулачках і пляцах — праява актыўнай жыццёвасці. Жыхары ставяцца да свайго "места" не як да бліскучага экспаната з музейнага сховішча. Рым — жывы горад з усім станоўчым і адмоўным.

Нашы адносіны да Рыма і да іншых вялікіх гарадоў сфарміраваны па глянцавых карцінках з альбомаў. У жыцці ўсё больш прывабнае, нерафінаванае — чалавечае. Кінутая гараджанінам ці турыстам цыгарэта — непрыемная дробязь. Але вакол пануе веліч архітэктуры і мастацтва — яно даруе, гледзячы з верху на "дзікунствы" чалавека. Чалавек тут істота часовая, ён — служка шэдэўраў.

Хадзіў, аглядаў руіны антычнага горада. Захавалася вельмі мала ад іх былой велічы. У розных кутках можна заўважыць рэшткі храмаў. Рымляне часта выкарыстоўвалі кавалкі калонаў, часткі арак і франтонаў для будаўніцтва жылля. Цяпер у такіх "слаёных пірожных" месціцца і ўсялякі турыстычны сервіс.

Вялікіх аўто зусім мала, што натуральна для найлепшай паркоўкі на вузкіх вулачках. Але больш надакучае шум ад матаролераў і мапедаў розных гадоў выпуску. І пачынае здавацца, што гэтая "траскатня" ніколі не скончыцца. Адчуваеш сябе нібы на лесапілцы.

Амаль на кожным кроку сутыкаешся з турыстамі. Багата студэнтаў і школьнікаў з заплечнікамі. Пакусы на іх тварах і руках сведчаць аб начоўках пад небам (да трыццаці пяці год, паводле міжнародных нормаў, не лічыцца, што чалавек, які спіць на вуліцы, бадзяга).

Ездзілі на мора. Праязджалі праз забудову 30-х гадоў. Як добра, што фашыстоўская архітэктура не трапіла ў цэнтр горада. Гэтая "псеўдакласіка" чымсьці нагадала творы Лангбарда ў нашай сталіцы.

На другі дзень наведаў сусветнавядомы Калізей. Ад гатэля да яго дванаццаць хвілін ходу. Будынак рэстаўруецца. Вельмі спадабаліся бліскучыя на сонцы рыштаванні, праўда, рэстаўратараў не бачна. На слова Калізей прахожыя не рэагуюць. Ён завецца ў іх Colosseo.

Тагачасны чалавек больш за ўсё любіў забавы. Вось і гэтая чаша з каменю створана, каб пераўзысці сваёй веліччу ўсе паганскія храмы. Тут, дзе забіта гэтулькі гладыятараў, дзе катавалі першых хрысціян, цяпер любімае месца фатаграфавання вандроўнікаў — на памяць. Непрыемна глядзець на выцягнутыя ад задавальнення вусны турыстаў перад фотааб'ектывам. Турыстычныя забавы як бы працягваюць першасныя традыцыі гэтага будынка.



Рым — горад мабільных тэлефонаў. Тэлефон у кішэні — прыкмета ўсіх пакаленняў жыхароў. Калі накіроўваешся некуды не пешшу — абавязкова спознішся. Без такога тэлефона — адны пакуты, а так людзі вельмі ветлівыя. У Мінску адрэз ж кінулася ў вочы — не лунае на тварах сустрэчных усмешка.

У Рыме ўдзень усе вокны зачынены стаўнямі. У аўтамабілях вокны таксама закрываюць шторкамі з кардону. У старой частцы горада заўсёды бачны дарожныя работы: рамантуюць водаправод ці кабель. Вада з калонкі, відаць, стагоддзямі, цячэ на брук, бо венцеля звычайна няма.

На вуліцах не бачна мастакоў з эцюднікамі. Вельмі горача, а, магчыма, з натуры тут ужо малявана-перамалявана. Нейкі малады мастак, праўда, каляровымі крэйдамі на "маставой" рабіў фрагмент з фрэскі Рафаэля. Дарэчы, надзвычай прафесійна. Я таксама, як і іншыя, кінуў манетку ў яго скрынку і нечакана атрымаў ад яго "грацыю".

Сабор Святога Пятра (S. Pietro). Напачатку падняўся на пляцоўку купала. Агледзеў панараму, зафіксаваў для сябе лепшыя маршруты да помнікаў, якія планаваў пабачыць.

Большай велічы, чым гэты сабор ў жыцці не бачыў. Розум без напружання, па звычцы, з асалодаю фіксаваў і аналізаваў гмах звонку і сярэдзіны. У саборы няма фрэсак, а толькі мазаікі, якія ілюзорна імітуюць алейны жывапіс. Паблукаўшы, знайшоў у саборы і захаванне Язафата Кунцэвіча.

Некалькі разоў вяртаўся ў славутую Сікстінскую капэлу разгледзець фрэскі, адкрытыя пасля рэстаўрацыі. Мастакі рэнесансу да гарманізацыі колеру ставіліся больш вольна, чым нашы сённяшнія творцы. Грунтам мастацтва быў сцвярджальны дух і дараваны звыш талент, гэта давала прагу да ведаў, сілы, вопыту. Насычанасць мастацтва неверагодная, патрыятызм у тым, што манументальныя працы рабіліся італьянцамі. Тут кожная дэталь — узор завершанасці. Ні дадаць, ні прыбраць.

Рафаэль — віртуоз кампазіцыі і малюнка. Пажыў бы болей, магчыма, таксама праявіў сябе як архітэктар.

Мікеланджэла — майстар рэалізацыі фантастычных задумаў у архітэктуры, пластыцы і манументальным жывапісе. Яго імя прыгадваецца на кожным кроку. У фрэсках ён хутчэй вялікі інтэлектуал, чым артыст. У каларыстыцы — саступае многім шукальнікам "пералівістай" жывапіснасці. Глядзеў і здзіўляўся, як яму заказчыкі дазволілі завяршыць "Страшны суд". Па мерках постсавецкіх барацьбітоў за "духоўнасць" яго карціны ніколі не прайшлі б цэнзуру мастацкіх саветаў. Праўда, нешта на фрэсцы замалёўвалі, але ўвесь час на грунце існаваў першасны арыгінал. Не прыгадалася фактаў з гісторыі, што "Страшны суд" некалі задрапіроўвалі, як гэта адбылося летам з роспісам Алеся Пушкіна ў Магілёўскім касцёле. Можа, зямля ў іх іншая?

...Згадваю ўсё гэта зараз. І здаецца мне, нашае жыццё несапраўднае. Мы баімся дыхнуць на наша старое, а яго знішчаюць, нікога не пытаючыся, многа гаворым пра гісторыю, пра наш правінцыйны "авангард", а сучаснасць пакідаем па-за плотам актуальнасці. І не разумеем, што ані фанатычнае, мёртвае шанаванне гісторыі, ані адмаўленне яе каштоўнасцяў (калі балончыкам напісаць нешта на сцяне (амаль увесь Рым размаляваны на ўзроўні зроку), не трапіць цыгарэткай у сметніцу, не дазволіць Мінску стаць "вечным горадам", а нам — падобнымі да сапраўдных рымлянінаў.

Міхал БАРАЗНА

Рым, 1996 г.

Тэатр

І — НІЯКАГА ПАТРЫЯТЫЗМУ...

Сёлетні ўдзел "Вольнай сцэны" ў юбілейным (50!) Эдынбургскім фестывалі быў запланаваны яшчэ год назад, падчас паказу спектакля "Рычард..." У. Шэкспіра. Усхваляваны, штораз прамаўляючы сваё "фантастык!", Рычард Дэмарка тыцкаў пальцам у Анісенку ды Гарбуза Алега, патрабуючы ў наступным годзе прывезці ўжо "Макбета" і абяцаючы, што ўсё тады будзе намнога лепей і фантастычней. Было ў гэтым шмат і авантурызму, і прыемнага адчування перамогі, як з яго, так і нашага боку, але ўсёй складанасці такога "задання" мне тады не адчувалася. Нам гаварылі мноства кампліментаў, плечы нашыя балелі ад абдымкаў. Надвор'е, як кажуць, спрыяла і, нягледзячы на некаторыя побытавыя недарэчнасці, мы — "ляцелі".

Вярнуліся. Многае ўлеглася, забылася. Трэба было думаць усур'ёз аб нашым новым праекце і першае, што ацверазіла — гэта зноў жа Шэкспір і зноў жа — на гадзіну-паўтары. Калі для Анісенкі "Рычард" быў "вынашаны" дзесяцігоддзем, дык "Макбет"... Апроч усяго, асоба А. Дударава неяк выслізгвала з усяе гэтае забавы. Ну ёсць Уільям Шэкспір. І ўсё тут! А тое што ў спадара Уільяма дзеючых асобаў у тым самым Рычардзе аж пад 40, а ў Дударава толькі 13 (цьфу, цьфу)?! Ангельцам ды шатландцам стаў даспадобы дудараўскі Шэкспір, але першы раз сталася, як той казаў, а тут ужо "дзяржзаказ". Дый грошы, на гэтую зусім няпростую справу, ніхто як бы і не збіраўся даваць. Падумаеш: сеў, перачытаў, навыкідваў там сяго-таго, пазабіваў тых-сіх, не даючы ім нават за сцэнай з'явіцца, і ўсё тут! Увогуле з пісьменнікаў гэтых, як, дарэчы, і з тых самых артыстаў, трэба грошы яшчэ браць, а не даваць. Усё роўна будуць "крэмзаць" ды прамаўляць накрэмзанае.

Ды вось так яно і атрымалася.. Дударау зноў жа нешта выкінуў, некага "зарэзаў" і ў "Макбеце". На сцэне суайчыннікі Шэкспіра змаглі ўбачыць толькі дзевяць (!?) дзеючых асобаў і... трэба было бачыць іх рэакцыю на ўсё гэта. Ніякага патрыятызму! Праўда, на нашым баку былі камяніцы замка Равэнскрэйг, у спіну дзьмуў часамі халодны вецер гучнага Паўночнага мора, і велізарныя чайкі сваім крыкам добра падмацоўвалі шэкспіраўскую (дудараускую?) фразу — "Сава крычыць.. і комін паваліўся".

Адпачыўшы пасля доўгай і цяжкай дарогі (усяго — больш за тры тысячы кіламетраў толькі ў адзін бок), мы паехалі паглядзець, што там за крэпасць Равенскрэйг і як мы там будзем прыстасоўвацца да яе сценаў і байніц. Тое, што Валеры Анісенка і Барыс Герлаван (мастак "Макбета") папярэдне наведвалі гэтыя мясціны і зрабілі ўсе арэндныя захады па прыстасаванні замкавых муроў да спектакля, мы ўбачылі адразу. Невялікая брыгада цесляў завіхалася ладкуючы вялізныя драбіны, па якіх лазячы давядзецца нашым акцёрам абжываць прастору замка і на другім ярусе, і яшчэ вышэй. Такога ў нашай практыцы не было, але дух захапіла ад такіх магчымасцяў. Потым мы будзем здзіўляцца ўзнёсла-рамантычнаму ходу Лэдзі Макбет і самога Макбета падчас сцэны каранавання, а пакуль што маленькі хлапчук, нешта лапочучы сваёй калежанцы, порстка шмаруе шырокі брус пэндзлем. Работа кіпіць і ацёры, разглядаючы будучае сваё "жыллё", надаюць маладой брыгадзе будаўнікоў асаблівага натхнення. Трэба аддаць належнае ўсім службам горада, якія сочаць за аховай гэтага гістарычнага месца. Яно сапраўды а х о ў в а е ц ц а дзяржавай. Ніводнага цвіка не было ўбіта, ніводнага пашкоджанага месца. Такія былі ўмовы. Усе нашыя пераходы лесвічныя ў поўным сэнсе слова віселі на сценах, і заўсёды прысутнічалі пажарныя, знаўцы дойліды, дый іншыя службоўцы. Міжволі ўзгадваліся беларускія старажытныя камяніцы, якія яшчэ і цяпер маюць вялізарны гістарычны кошт, але якім у нас няма пакуль цаны. Думалася і пра тое, што ў той жа Лідзе, у тым жа Камянцы, ці Міры, нават у многіх мясцінах той самай Віцебшчыны можна ладзіць такія самыя відовішчы. Але гэта калі-небудзь потым, потым... І калі што ацалее. Нашае знаходжанне ў Шатландыі сёлетнімі жнівеньскімі днямі нагадвала казку. Вакол нас хадзілі, нас лашчылі, спрыялі нават у дробязях. І калі не думаць, што гэта была толькі маленечкая старонка велізарнага Эдынбургскага фестывалю, што мыґудзельнічалі толькі ў дэмаркаўскай частцы "Фрынджа", а хочацца ж пацягацца і з асноўнымі сіламі, то ўсё было вельмі хораша.

Старэнькі маленькі гарадок Сэнт-Андрус на беразе Паўночнага мора. Ціхутка кругом. Усё падстрыжана, прыгладжана-дагледжана. Нават прылівы і адлівы нейкім чынам супадалі з нашымі прыездамі-ад'ездамі на спектаклі. Іграліі мы ў падобным гарадку Кіркалдзі, што міляў за 30 ад Сэнт-Андруса. Два тыдні нас ахінала выхаванасць, далікатнасць, павага. Адным словам — культура. Усё гэта пачало здавацца нават нейкім замаруджаным жыццём. Адно тое, што сотні дзядзькоў і жанок качаюць свае мячыкі па гольфавых палях, паволі ходзячы цэлыя кіламетры (мілі, даруйце) і трымаюць гэта за сур'ёзную справу!.. А на сапраўдных палях, дзе расце густая пша-ніца, капуста, ну і ўсё такое — нікога, толькі палівачкі, і то самі пырскаюць — усё гэта выглядала перакуленым, скрыўленым у маім светаўспрыманні. Свінні ды авечкі дзень і ноч у загарадках і жывыя. А пытаюся ў ангельца-перакладчыца Джона, тыцкаючы пальцам за вакно на пшанічную гоню — "Што гэта, як называецца?" Адказвае — "Яда". "Я, кажа, — маю права і не ведаць, я гэта не садзіў. "А ў нас, — кажу, — хірург-гінеколаг, ці нават фізік-ядзершчык, не тое што артыст — ведае". Цёмны народ, адным словам, гэтыя англічане. Я ўжо казаў, што нас ахінулі ўвагай, ды не абыякой. Задэмакратызаваўшыся, мы неяк адышлі ад апекавання ўладамі і згубілі такія прыемныя наведванні абкамаў ды гаркамаў падчас гастроляў. Тут давялося ўспомніць сёе-тое з забытага. Праўда, сустрэчы наладжвалі з нашым тэатрам нават мэры. Шаноўныя-выбраныя людзі з самога горада Эдынбурга, ды не меней прыгожага горада Дандзі і таго самага Кіркалдзі, падчас апошняга спектакля. Трэба аддаць належнае арганізатарам гэтых мерапрыемстваў. Усяго патроху, проста, дасціпна і, што самае прыемнае, — гумар, смех, жарты. Ніхто нікога і нічога не баіцца. Захацелася "табе нешта" "змарозіць" нават у дачыненні да таго ж мэра — "марозь", калі ласка! Калі ты гаворыш пра кагосьці ці аб чымсьці — ты перш за ўсё, гаворыш пра сябе. — Адным словам, нават пратакол у іх і не пратакол. Падарункамі не завальваюць, за карак не льюць і ў час заканчваюць. Потым нашая традыцыя брала верх і гасціннасць беларусаў вылівалася на сваім ужо стале.

Шэсць спектакляў, што мы сыгралі, былі пры гледачах. Што нас зноў жа ўразіла? Нават пры складаных умовах — чужая мова, паказ на вуліцы, а не ў зале, дождж падчас першага спектакля, — не вымусілі каго-небудзь пакінуць спектакль. З кожным чарговым прадстаўленнем мы адчувалі прыліў цікаўнасці, што часам адбівалася ледзь не ў парушэнні дысцыпліны. Гарадок невялікі, як я казаў, і пайсці папіць чаго-небудзь у бліжэйшым пабе (бары) станавілася небяспечным, бо можна было трошкі і затрымацца. Добра, што сам не быў заняты яе акцёр. Віталіся на вуліцах. Ведалі пра нас і віталі нават падчас запраўкі палівам аўтобуса. Спектаклі як бы добра ўпісаліся ў памяркоўны тэмпа-рытм шатландцаў, і з тае нагоды тым жа самым Рычардам Дэмарка была зроблена заяўка Валерыю Анісенку ды Алегу Гарбузу, прыехаць ужо на наступны год з... "Гамлетам". Ну, Дударау — заточвай пяро! А што? Вось так, як бы гуляючы ды забаўляючыся, сыграць усяго Уільяма Шэкспіра — Дударава ў сапраўдных дэкарацыях цудоўнай Шатландыі, ды па-беларуску, і з тым увайсці ў кніжку рэкордаў Гінеса, ці хаця б патрапіць да мадам Цюсо. Чаго і жадаю...

Так і карціць зрабіць шырокі агляд пошукаў штодзённых спадарожнікаў нашага жыцця — сродкаў. Банальна, дый надакучыла. Усё роўна іх ніколі не дасць наша мілая дзяржава столькі колькі хацелася б, а, па-другое, заўсёды, я паўтараю, заўсёды знойдуцца людзі, якім будзе хацецца хоць чым-небудзь дапамагчы нашаму беднаму мастацтву. І, можа, не так мастацтву, як людзям, якія яго робяць. Таму з радасцю хачу нагадаць цудоўнае імя Алы Атрошчанкі і яе кампаньёнаў з "Лондан-Мінск Дэвэлэпмэнт". Без яе энергічнага ўдзелу ці было б нам да паездак? Нават сівы Альбіён вымушаны быў уключыцца ў ланцужок яе фундатарства на чале з дзіўным чалавекам і буйным знаўцам Шэкспіра Майклам Гірэн-Ташом. Дзякуем і знакамітаму Фонду Сораса, які ў каторы раз падтрымлівае нас. Ну і роднае міністэрства, якое ў такія цяжкія часы, а ўсё ж узяло на сябе амаль траціну выдаткаў. Астатняе зарабілі як бы самі. Бо зноў жа ўвайшлі ў творчае аб'яднанне з вядомым кінарэжысёрам М. Пташуком, майстрам аператарскай справы У. Спарышковым і дырэктарам А. Волкавым, якія знайшлі сродкі, каб зняць фільм аб нашай паездцы і сам спектакль "Макбет". Будзем спадзявацца, што гэтая супольная праца дасць плён і хутка замежныя кінагледачы (а такія ўмовы) першымі ўбачаць наш удзел у Эдынбургскім фестывалі.

Валеры МАЗЫНСКІ,
мастацкі кіраўнік
і дырэктар тэатра
"Вольная сцэна"

КРАЯВІД З МЕНТОЛАВЫМ ПАХАМ

(Працяг. Пачатак на стар. 9)

Праўда, тэлефон я даў свой — не столькі таму, што Наташа мне адразу спадабалася, як з прычыны беспрасветна-здзеклівага маўчання майго белага тэлефоннага апарата.

Я не цешыў сябе спадзяваннямі на прарыў гэтае блакады, але праз два дні тэлефон загаварыў Наташыным голасам.

Яна зрабілася маёй у самы першы візіт сюды і потым прызнавалася, што вельмі праз гэта перажывала. У тыя дні нашы адносіны ўжо дазвалялі мне растлумачыць Наташы, што яна проста даверылася жаночай інтуіцыі, а тая нашэптвала, што новы знаёмы не будзе траціць час на дзеянні, якія адзін ягоны сябар калісьці назваў танцамі паўлінаў. Мая сяброўка згадзілася. Яе русая галоўка з дзвюма падкручанымі каля скроняў даўгімі кудзеркамі ляжала ў мяне на плячы. Чорная штора захінала нас ад дзённага святла і астатняга свету. З прайгравальніка, якому пасля Наташынага з'яўлення я выдзеліў месца на століку каля мапы, лілася лютневая музыка, а на падлозе пры ложку стаяла пляшка чырвонага віна.

Наташа сказала, што ні ў чым не раскайваецца і, не падымаючыся, напоўніла шклянкі. За вакном быў травень, і на сажалцы каля былых лютэранскіх могілак у шарую гадзіну пачыналіся жабіныя канцэрты.

Назваць той час шчаслівым было б няшчыра. Як бы акрэсліць яго больш дакладна?.. Ён да краёў поўніўся спакойнай жыццёвай энергіяй. Ён быў падарункам лёсу, хоць часам я падазраваю, што таемныя сілы, якія неўзабаве зацягнулі мяне ў свой вадаварот, усяго толькі вырашылі даць мне адпачынак перад блізкімі выпрабаваннямі.

У адрозненне ад некаторых літаратурных герояў, я не жыў ад спаткання да спаткання. Раніцой я сядаў за стол і пісаў тры, а калі шанцавала, то і чатыры старонкі будучай кнігі. За тыдзень чарнавік апавядання звычайна быў гатовы і, паводле старой звычкі, перад тым, як перапісваць опус начыста, я чытаў яго сам сабе ўголас.

Апошні аповед, праўдзівей, ягоны чарнавік, так і застанецца на стале непрачытаны...

Ну навошта гэтае недарэчнае "апошні"? Хіба тое, да чаго я рыхтуюся, не дазволіць мне?.. Адкуль бярэцца сумневы, калі падарожжы не даюць для іх ніякага грунту? А можа, я толькі пераконваю сябе, старанна калекцыянуючы памысныя доказы і заплюшчваючы вочы на тое, што ўпарціцца класціся ў схему?..

Не, цяпер я павінен вярнуцца ў той травень, да Наташы, да жабіных канцэртаў і бэзу на амаль вясковай суседняй вуліцы.

Калі не памыляюся, яшчэ не згадваў, што пасля разводу звольніўся са службы. Ганарару за папярэднюю кнігу, па маіх падліках, хапала не меней, як на год-паўтара, а надалей я даў сабе слова жыццё не планаваць.

Дык вось, ад раніцы я пісаў свае абавязковыя тры старонкі. Пасля выпраўляўся на праходку, выбіраючы ціхія вулачкі з дагледжанымі кветнікамі, лавачкамі і аканіцамі. Памежным слупам паміж гэтымі вуліцамі і новым горадам служыў дзевяціпавярховы дом з гастраномам, дзе я на зваротным шляху купляў пару бутэлек сухога віна.

Мае дачыненні з суседзямі абмяжоўваліся знаёмствам з колішнім электрамантажнікам Лёнем, які будаваў высакавольтныя лініі і, вярнуўшыся аднаго разу з камандзіроўкі, убачыў жонку ў абдымках у шчаслівага саперніка. Лёня выгнаў няверніцу з дому, а сам запіў, сарваўся з мантажнай верхатуры і атрымаў інвалідную пенсію. Заходзячы пазычыць чарговую пяцёрку, Лёня паўтараў сваю гісторыю ў розных варыянтах, але ніколі не забываў шляхетна адзначыць, што жонка здрадзіла яму не з першым-лепшым аматарам амурных прыгодаў, а з капітанам далёкага плавання. Мне падабалася, што Лёня хутка развучыў, у які час не трэба турбаваць майго памаранчавага сабачку, бо ён вартуе мяне з Наташаю.

Сабачка вітаў маю сяброўку такім усцешаным брэхам, нібыта чакаў яе разам са мною. Аднак неўзабаве ён ужо мусіў дэманстраваць радасць толькі пацеркамі бурштынавых вачэй, бо я ўручыў Наташы ключы.

Па яе прыходах можна было правяраць гадзіннік. А палове пятай за ёю зачыняліся дзверы, а ў 35 хвілінаў на пятую мы ўжо любілі адно аднаго. Пяці хвілінаў якраз хапала на тое, каб выпіць келіх віна і скінуць з сябе ўсё, што перашкаджала лавіць доўгія хвіліны асалоды.

Наташа паходзіла са шчаслівага племя тых жанчын, якія ніколі не паўтараюцца і гэта не каштуе ім ніякіх намаганняў, таму што атрымліваецца незалежна ад іх волі.

Яе з'яўленне не толькі змяніла мой распарадак, але і зрабіла больш разнастайным рацыён, бо тая самая інтуіцыя нашаптала ёй, што каханак мае таемныя схільнасці гурмана. Пасля таго, як мы дапівалі ў ложку нашу першую пляшку віна, вяртаючыся ў рэчаіснасць з першай блізкасці, Наташа ішла на кухню, каб згатаваць на вячэру што-небудзь цікавейшае за маю дзяжурную яечню ці смажаныя каўдунцы.

Кухня бачыла Наташу ў шлафроку, які яна прынесла і акуратна павесіла на плечыкі ў адзін з першых, яшчэ насцярожаных візітаў. Я напісаў "кухня бачыла" і падумаў, што выкарыстаў такі выраз неасэнсавана, але зусім невыпадкова. У тыя дні я ні за што не напісаў бы так. Тады мая аднапакаёўка ўпэўнена вяла ролю звычайнай кватэры на гарадской ускраіне.

Ага, шлафрок. Той зялёны з буйнымі шыпшынавымі кветкамі шлафрок напачатку, я дагэтуль памятаю, укалоў мяне думкаю аб тым, дзе вісела гэтая спакуслівая апранашка раней.

Мне падабалася дапамагаць Наташы каля газавай пліты і збіраць на стол, у які мы ператваралі дзве пастаўленыя пры ложку табурэткі. Другую сустрэчу нашых целаў афарбоўвала ўжо не вострае жаданне, а пяшчота ўзаемнага прыцягнення. Здаволіўшы першы раз смагу, цяпер мы як быццам дапівалі пакінутыя глыткі, каб запасу валодання адно адным хапіла да наступнае, заўтрашняй ці паслязаўтрашняй паловы на пятую.

Шлафрок займаў сваё месца ў шафе, калі электронны гадзіннік у драўляным корпусе паказваў без чвэрці восем. Па дарозе да тралейбуснага прыпынку я браў Наташу за руку і любіў раз-пораз злёгку сціскаць яе заўсёды сухія цёплыя пальцы, адчуваючы іх адказ. Калі насустрач нам траплялася юная парачка, мая сяброўка вызваляла руку, гаворачы, што маладзёнам будзе смешна: такія старэнькія і трымаюцца за ручкі. Яна какетнічала, бо і сама выдатна ведала, што абсалютная большасць гэтых жаўтаротых дзяўчатак магла б толькі пазайздросціць яе маладому, гнуткаму і такому таленавітаму целу, якое, здавалася, мела намер ніколі не падпарадкоўвацца часу.

Асколак былога, ужо амаль чужога жыцця...

Бэзавы травень неўпрыкмет пераліўся ў язмінавы чэрвень; у ліпені Наташа з'ехала на два тыдні ў адпачынак, але такая доўгая ростань нічога не змяніла: у прызначаны дзень я нецярпліва, як хлапчук, чакаў яе, і ключ павярнуўся ў замку роўна а палове пятай.

Усё пачалося напрыканцы жніўня, калі ўслед за спёкаю некуды прапалі цэлыя раі матылькоў-крапіўнікаў, што яшчэ нядаўна акупавалі наваколле, залятаючы ў адчыненае вакно і бессаромна апускаючыся на нас, куды ім толькі заманецца.

Як нядаўна і як даўно гэта было!.. Часам я сапраўды адчуваю настальгію па тым жыцці, але яна нагадвае настальгію жыхара Атлантыды, якому пашчасціла ўратавацца, калі ягоны мацярык загінуў. Маё былое жыццё апусцілася ў хвалі, адплыло ў невараць. Напісана, вядома, занадта прыгожа, каб быць праўдаю. Проста я адчуваю, што дарогі назад няма.

Але ці маю я права ўпэўнена сцвярджаць, што ўратаваўся?..

У любым выпадку я цудоўна памятаю дату здарэння, што сталася прадвесцем... Які сэнс доўга займацца пошукамі эўфемізму? Прадвесцем *прыходу*. Больш дакладнага тэрміна я не знайшоў, як не вынайшаў і нічога лепшага за *падарожжы*.

Падарожжы стануць другой стадыяй...

РОДАМ З ВЁСКІ БЕЛІЦА

Амаль адначасова ў Віцебску адкрыліся дзве выставы твораў Мікалая Драненкі, прысвечаныя 50-годдзю мастака. У абедзвюх экспазіцыях прадстаўлена акварэль — ад ранніх шматпланавых сюжэтна акрэсленых кампазіцый да тэхнічна эфектыўных экспрэсій апошніх год. Пачаўшы працаваць у гэтай тэхніцы адразу пасля заканчэння мастацка-графічнага факультэта педінстытута ў сярэдзіне 70-х, мастак ніколі не пакідаў яе, хоць і не менш плённа тварыў у алейным жывапісе, захапляўся экслібрысам, шаўкаграфіяй.

Першыя краявіды, у якіх індустрыяльныя матывы былі афарбаваны выразна лірычным настроем вобразнага ладу, былі прадстаўлены на рэспубліканскай мастацкай выставе "Акварэль-77". Далей пачаліся незлічоныя пошукі і эксперыменты, у якіх Мікалай Драненка заўжды імкнуўся да лёгкасці і нязмушанасці сваёй мастацкай мовы. Дзякуючы унікальнай прагавітасці і імкненню да адкрыццяў новага, неспазнанага, мастак сёння, здаецца, знайшоў сваю ўласную адметную манеру ў акварэлі. Як і раней мастака асабліва натхняе прыгажосць беларускай прыроды, краявіды вёсачак на яго Радзіме — Сенненшчыне. Але ў творах апошніх год Мікалай Драненка больш вольны ад натурнай зададзенасці вобраза, асноўную ўвагу звяртае на жывапісна-пластычную, нават фармальна-каларыстычную выразнасць кампазіцый. Асабліва яскрава гэта відаць у творах, прадстаўленых у выставачнай зале суполкі "Віцебская акварэль", сябрам якой з'яўляецца мастак.

У бліжэйшых планах Мікалая Драненкі — сустрэча з землякамі і арганізацыя экспазіцыі сваіх акварэляў у роднай вёсцы Беліца.

Міхась ЦЫБУЛЬСКІ

На здымку: М. Драненка, "Раніца".

НАСТУПНЫ КРОК — АФРЫКА

29 верасня ў парку імя Горкага адбылася літаратурна-турыстычная імпрэза Бум-Бам-Літа "Ням-ням". Удзельнікі незвычайнага выступлення ўвесь час дэманстравалі сапраўдную турыстычную загартоўку. Прынамсі, яны здолелі размясціцца ўсім кагалам на самой сцэне, дзе, акрамя спеваў і чытання тэкстаў, расклалі свае рукзакі, торбы, адкуль дасталі салёныя гуркі, вараную бульбу, смажанае мяса і бутэлькі з півам. Міхась Башура, Ілля Сін, Серж Мінскевіч, Зміцер Вішнёў, Юрась Барысевіч, Людка Сільнова, Альгерд Бахарэвіч, Сяргей Патаранскі, Віктар Жыбуль, Алесь Туровіч, Кастусь Елісееў, Усевалад Гарачка і Яраслаў Крыловіч паказалі прысутным, што яны маюць пэўную падрыхтоўку для далёкіх падарожжаў. Дарэчы, у беларускіх постмадэрністаў з'явіўся новы музычны інструмент — банджа!

Напрыканцы выступу ўсе гледачы былі запрошаны на надзвычайны перфоменс — кіданне твораў у раку Свіслач. Таму цяпер будзе зусім не дзіўна, калі нехта на беразе Аўстраліі знойдзе вялікую жоўтую бутэльку з вершамі, песнямі і скаргамі сяброў літаратурнага руху Бум-Бам-Літ.

Зміцер ВОЛКАЎ

У ЛАТЫШСКІМ "ДНІ ПАЭЗІІ"

У верасні ў дзень нараджэння класіка латышскай літаратуры Яна Райніса ў Даўгаўпілсе праходзяць Дні паэзіі. Да гэтага свята традыцыйна з 1991 года выходзіць зборнік "Дзень паэзіі", у якім пад адной вокладкай змяшчаюцца творы на латышскай, латгальскай, польскай, рускай і беларускай мовах. У сёлетнім выданні беларускую паэзію Латвіі прадстаўляе Станіслаў Валодзька. Зборнік выдадзены за сродкі Даўгаўпілскай гарадской думы ва універсітэцкім выдавецтве "Saules" ("Сонца").

Н. К.

Віншуем!

Алесю ШЛЕГУ — 60

"Пільная ўвага да сучаснасці і вера яго герояў у духоўную чысціню, дабрыню, чуласць, справядлівасць чалавека" — так сказаў, пазнаёміўшыся з творамі А. Шлега, Уладзімір Караткевіч. Як і многія, перш чым стаць літаратарам, Алесь Карпавіч нямала перажыў і зведаў. Нарадзіўся ён 15 кастрычніка 1936 года ў вёсцы Вялікі Бор Хойніцкага раёна. Бацька працаваў старшынёй калгаса, маці — даяркай. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Карп Сцяпанавіч стаў камандзірам роты партызанскага атрада імя А. Суворава. Гітлераўцы не маглі гэтага даравацъ яго сям'і. У 1942 годзе яны ноччу нечакана ўварваліся ў хату, дзе з маці жылі тры малыя сыны. Самага меншага ў звярынай лютасці ўдарылі галавой аб парог, другому стрэлілі ў рот. Алесь уратаваўся цудам: паспеў схавацца ў печ. Не пашкадавалі нелюдзі і маці — яе павесілі.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў партызанскі камандзір Карп Сцяпанавіч Шлег працаваў сакратаром райкома партыі, пазней узначальваў адзін з калгасаў у Баранавіцкім раёне, урэшце — стрэлачнікам на чыгуначнай станцыі Баранавічы. Сваімі сталі Баранавічы і для сына Алеся, дзе ён скончыў сем класаў. Затым А. Шлег паступіў у рамеснае вучылішча ў Наваградку. Працаваў слесарам, электразварщыкам, быў качагарам, машыністам гандлёвага флоту ў Рызе, Мурманску, Адэсе. У 1954 годзе А. Шлега прызвалі на службу ў Ваенна-Марскі Флот СССР. Звольніўся ў запас у 1958 годзе інвалідам 1-й групы, вярнуўся на Беларусь.

Быў літсупрацоўнікам ляхавіцкай раённай газеты "Савецкі патрыёт", здаў экстэрнам экзамены за курс Баранавіцкай завочнай сярэдняй школы і ў 1959 годзе паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З трэцяга курса перавёўся на завочнае аддзяленне, бо запрасілі на працу ў рэдакцыю газеты "Звязда". Пазней працаваў у выдавецтвах "Беларусь", "Мастацкая літаратура", па дагавору — у рэдакцыях "ЛіМа", "Чырвонай змены", "Мінскай праўды", з 1979 года быў старшым рэдактарам Рэспубліканскага праўлення таварыства кнігалюбаў. З 1985 года А. Шлег — рэдактар, з 1988-га — старшы рэдактар на тэлебачанні.

Літаратурным дэбютам стаў нарыс "Так нараджаецца сталасць" ("Маладосць", 1959, N 9).

У 1968 годзе з'явіўся першы зборнік апавяданняў і нарысаў А. Шлега "Трывожная памяць". Асобнымі кніжкамі выйшлі аповесці "Цыганок" (1971), "Праўда адна" (1974), "Тайна Чорнага бору" (1991). На творчым рахунку А. Шлега і кнігі "Жыло чаканне болю" (1979), "Хлеб на далонях тваіх" (у сааўтарстве з Т. Харавец, 1986). А. Шлег — аўтар кінасцэнарыяў дакументальных фільмаў "Балтыйцы", "Палескі Марэсьеў", "Ядвіга Іосіфаўна", "Мой дом у бядзе" і іншых, шэрагу радыёп'ес, па якіх пастаўлены спектаклі — "Аперацыя "Зорачка", "Цыганок", "Рэха баравое"...

Раман "Сталінскія байструкі" засведчыў уменне пісьменніка асэнсоўваць складаныя працэсы, што адбываліся ў жыцці грамадства. Гэтым разам А. Шлег звярнуўся да гадоў сталінізму, праўдзіва ўзнавіў атмасферу, якая панавала ў рамесным вучылішчы. Галоўны герой твора Шура — не па ўзросце сур'ёзны, а галоўнае — чысцейшай душы чалавек, які ніколі не ідзе на кампраміс з сумленнем. У дзень смерці Сталіна ў вучылішчы ўспыхвае паўстанне...

Схільны да вострага сюжэта, А. Шлег надзіва ўважлівы да яго. Тое, пра што расказвае, уяўляецца неверагодным, ды факт застаецца фактам. І зусім невыпадкова ў якасці эпіграфа да рамана ўзяты словы Буало: "Праўда падчас выглядае непраўдападобнай".

А да ўсяго А. Шлег перакладае з польскай, рускай і ўкраінскай моў. Вельмі шмат ён робіць і дзеля прапаганды беларускай літаратуры, ідэі нацыянальнага Адраджэння, рыхтуючы яркія і запамінальныя перадачы на тэлебачанні. Тым самым талент пісьменніка А. Шлега паядноўваецца з талентам А. Шлега-журналіста, публіцыста.

З днём нараджэння, шаноўны Алесь Карпавіч! Моцнага Вам здароўя, нястомнасці ў ажыццяўленні новых творчых планаў!

НА АТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БЕЛАРУСІ

ДЗІВОСНЫ КАРАБЕЛЬ — ЗЯМЛЯ

Недзе напрыканцы 70-х гадоў з розных высокіх трыбун пачало гучаць: на дварэ — 20-е стагоддзе, шыбуе, прастуе навукова-тэхнічны прагрэс, а дзіцячыя пісьменнікі, што тыя дзятлы, заладзілі адно і тое ж — пішуць кніжкі пра зайцоў ды буслоў, пра казюрак ды мурашак... Адзін паслужлівы маскоўскі жартаўнік нават пусціў у абыходак такое словазлучэнне — маўляў, "озверела" дзіцячая літаратура. Жарты жартамі, а кіруючыя ўказанні, што прагучалі з высокіх трыбун, трэба было выконваць. І вось у святле выступленняў высокага ўсесаюзнага і не менш высокага беларускага правадыроў мы, работнікі дзіцячых рэдакцый, складалі планы, у якія ўключалі кніжкі, што праслаўлялі дасягненні навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. А да Чарнобыля заставалася ўсяго некалькі гадоў. Час пачаў ужо свой няўмольны адлік...

Калі я чытаў кнігі Уладзіміра Ягоўдзіка "Дзівосны карабель" і "У царстве вадзяніка", то думаў, дзякаваць Богу, што пісьменнік не чуў тых слоў з высокіх трыбун, а калі нават і чуў, то не прыслухаўся да іх. Бо героі ягоных кніжак — заяц, мядзведзь, лебедзь, ластаўка, стронга і, страшна сказаць, мурашы... Звяры, птушкі, рыбы... Кожнаму прадстаўніку жывёльнага свету прысвечана асобнае невялічкае апавяданне.

У. Ягоўдзік добра ведае дзіцячую псіхалогію і таму пачынае свае апавяданні нязвыкла, каб прыцягнуць увагу маленькага чытача. Гэта можа быць загадка, як у апавяданні пра ластаўку: "Спераду шыльца, ззаду вільцы, наверсе чорнае сукно, падыспадам белае палатно. За мора хадзіла, панямецку гаварыла, па-французску адказвала — што за разумніца такая?" Ці казка, як у апавяданні пра лебедзя. Ці лічылка, з якой пачынаецца аповед пра зайца. А вось, здаецца, празаічны пачатак, але не менш займальны: "Глушэц, бадай, самы стары жыхар лясоў і пушчаў. Вучоныя кажуць, што ён з'явіўся на зямлі мільёны гадоў назад. За гэты час згінула многа звяроў і птушак. Асілкі-маманты — і тыя не ўцалелі да сённяшніх дзён. А глушцы — жывуць. Нібы ім зусім не страшныя калючыя маразы, галодная бяскорміца, лютыя драпежнікі".

Маленькі чытач трапляе на "кручок" цікаўнасці, і яго ўжо за вушы не адцягнеш ад кніжкі. Аўтару гэта толькі і трэба. У. Ягоўдзік расказвае аб павадках звяроў, пра тое, дзе і як яны жывуць, якую карысць ці, наадварот, шкоду прыносяць людзям.

Шмат пра што даведаецца маленькі чытач, калі возьме ў рукі гэтыя кніжкі. Напрыклад, чаму людзі радуюцца, калі нястомны паляўнічы — ласка селіцца побач з іх жытлом: ды таму, што яна адольвае агідных пацукоў, хаця сама нярэдка меншая за гэтых ненажэрных шкоднікаў. Ці чаму дбайнага і ахайнага гаспадара барсука не так лёгка ўбачыць самога — аказваецца, на спажыву ён выходзіць прыцемкам. Даведаецца чытач і пра тое, што ў пошуках здабычы воўк прабягае за адну ноч дзесяткі кіламетраў (сапраўды, ваўка ногі кормяць), і пра кнігавак — пільную і адважную варту балотнай і вадзяной жыўнасці...

У. Ягоўдзік прыводзіць не толькі дакладныя звесткі пра звяроў, якія немагчыма абвергнуць, але і расказвае пра загадкі, таямніцы, якіх нямала ў жывёльным свеце...

Вось адна з такіх загадак. Пасля месяцаў вандроўкі вугры трапляюць у цёплае Саргасава мора, паблізу Амерыкі, і там нерастуюць. Вугровыя ікрынкі выспяваюць у рыбак-малькоў, якія настойліва імкнуцца да тых самых рэк і азёр, дзе выраслі іх бацькі.

Вучоныя спрачаюцца: як яны знаходзяць шлях да сваёй радзімы? Адны сцвярджаюць, што вуграм падказваюць дарогу цёплыя плыні, другі пярэчаць, што правільны накірунак рыбы знаходзяць па зорках.

Уладзімір Ягоўдзік дае сваю версію: "Адзін стары дзядуля-рыбак расказваў мне, што вугры ў цёмныя навальнічныя ночы выпаўзаюць з вады па гарахавінне, бо ў нас, на Беларусі, растуць вельмі салодкія струкі. Вось і вяртаюцца вугры з-за мораў-акіянаў, каб паласавацца гарохам".

Відаць, гэта не зусім навуковая, а, можа, і зусім не навуковая гіпотэза; напэўна, яна не прыбліжае нас да разгадкі таямніцы вугроў. Але ў ёй схавана, на маю думку, разгадка таго, чаму Уладзімір Ягоўдзік і шмат хто да яго нястомна пісалі і пішуць пра жывёльны і раслінны свет. Іхнія творы — непрыкметна, без гучных слоў — выхоўваюць у юнага чытача любоў да сваёй зямлі, да Радзімы з вялікай літары.

Кнігі "Дзівосны карабель" і "У царстве вадзяніка", вылучаныя на Дзяржаўную прэмію, гэта толькі невялікая частка таго, што зрабіў у апошні час Уладзімір Ягоўдзік.

Напісана кніжка пра грыбы і ягады, якія растуць у нашых лясах.

Выдадзены кнігі "Заклятыя скарбы" і "Вужовы кароль", у якія сабраны апрацаваныя для дзяцей беларускія легенды і паданні. Яны расказваюць пра тое, як на Беларусі ўзніклі рэкі і азёры, адкуль пайшлі іх назвы, назвы вёсак і гарадоў. Можа, адзін з першых У. Ягоўдзік зрабіў героямі сваіх твораў дамавікоў, русалак, ваўкалакаў, начніц, карацей кажучы, нячыстую сілу. На старонках гэтых кніг узнікаюць постаці Машэкі, Чорнай дамы Барбары, Радзівіла пане Каханку і іншых персанажаў нашай шматпакутнай гісторыі.

Цікаўнасць да гісторыі прывяла У. Ягоўдзіка да стварэння аповесцяў пра Усяслава Чарадзея і князёўну Рагнеду, дзе ўдала спалучаюцца звесткі, пачэрпнутыя з летапісаў, з выдумкай, фантазіяй. Творы надрукаваны ў часопісе "Бярозка" і газеце "Раніца".

Да таго ж У. Ягоўдзік пераклаў і пераказаў для дзяцей славутую "Аповесць мінулых гадоў". Публікацыя ў часопісе "Пачатковая школа" выклікала добры водгук вядомага вучонага Г. Штыхава.

Думаю, што кнігі, напісаныя ў апошні час Уладзімірам Ягоўдзікам, маглі б скласці план невялікага выдавецтва дзіцячай літаратуры. Сапраўдны чалавек — выдавецтва!

Дарэчы, У. Ягоўдзік зрабіў спробу здзейсніць на практыцы, ажыццявіць гэты план. Ён падбіў хлопцаў з фірмы "Ітэкс", якія выраблялі шпалеры, выпускаць, акрамя свайго дэфіцытнага тавару, дзіцячыя кніжкі і, прытым, на беларускай мове. Відаць, хацеў даказаць, што і ў новых складаных эканамічных умовах беларуская дзіцячая кніга зможа выжыць. У. Ягоўдзік прыцягнуў да стварэння кніг выдатных беларускіх мастакоў — Уладзіміра Савіча, Валерыя Славука, Уладзіміра Вішнеўскага, Міколу Рыжага, Уладзіміра Жука і многіх іншых. Гэтаму спрыяла не толькі ягонае даўняе сяброўства з мастакамі, але і разуменне таго, што без мастака сапраўднай дзіцячай кніжкі не зробіш, што мастак раўнапраўны сааўтар пісьменніка.

І вось справа закруцілася. З'явіліся першыя кніжкі, з прыгожымі каляровымі малюнкамі, на добрай паперы. А потым, ці то сапраўды новыя эканамічныя ўмовы аказаліся занадта складанымі, ці то ў фірмы "Ітэкс" не хапіла пораху на выданне беларускіх кніжак, але неўзабаве ўсё скончылася.

Аднак Уладзімір Ягоўдзік не здаўся, не скарыўся абставінам. Праз некаторы час пачаў выдаваць свайго "Лесавіка" — "школу-плакат", кожны нумар якога прысвечаны асобнаму звяру ці птушцы. Акрамя фотаздымкаў і малюнкаў, У. Ягоўдзік робіць усё сам: піша тэксты, набірае, вярстае, распаўсюджвае і, галоўнае, шукае спонсараў. Ён марыць ператварыць "Лесавіка" ў часопіс, і, я ўпэўнены, што ў яго гэта атрымаецца.

Закончыць рэцэнзію мне хочацца добрымі словамі з кніжкі "Дзівосны карабель":

"Нельга, каб апусцела, замоўкла без шматлікіх галасоў наша зямля — Дзівосны карабель, на якім усім хопіць месца: і нам, людзям, і ўсякай жыўнасці.

Дык плыві шчасліва, наш Дзівосны карабель!"

У. МАШКОЎ

"Бум-Бам-Літ" — беларускі маладзёжны літаратурны рух, які ўзнік у нашай краіне крыху больш за два гады назад. За гэты час маладыя постмадэрністы, як яны сябе называюць, заявілі пра сябе не толькі груканнем у тазік са сцэны, але і сваімі творамі. Праўда, пакуль што яны, як творцы, кожны паасобку не маюць такой вядомасці, як створаны імі "Бум-Бам-Літ". Але гэта не бяда, бо ўсё прыходзіць з цягам чаму пры карпатлівай працы і самае галоўнае — пры наяўнасці таленту. Год назад наш тыднёвік ужо знаёміў з творчасцю бум-бам-літаўцаў. Сёння мы ізноў даём ім слова.

Зміцер ВІШНЕЎ

МІКСАТРОФНЫЯ АРГАНІЗМЫ

Чалавек затычкай
укруціўся
ў бутэльку
кантрафікцыйнай
складанасці Сонца
выплыла на краі
с а л а м а т к і
яблыкі
дулі
слівы
марудна пакаціліся
у ружовую далечыню
а т р а к ц ы ё н
напоўніўся
гаўканнем
што несла
кардынацыйнае
змяненне псіхікі
ЯНО ціснула на
сценкі
пасудзіны
п р а г і н а л а
празмерным павялічваннем
храналагічнай
масы
была па печанай сутнасці
няшчаснай падлай
у горадзе
стаяла добрае
надвор'е і
коўзалася цішыня
НІХТО не хацеў
слухаць разрываў
снарадаў і святаў
Смарагдавага
кастрычніка...

ДУРДОМ У ЦЭНТРЫ ЗЯМЛІ

дзе
бегемоты
сланы
кракадзілы
могілкі
і
помнікі
бананы
зялёная лухта
падобныя
на
хмары
я
сяджу
ў
моры
няўдольнасці

Сяргей ПАТАРАНСКІ

АДЛЮСТРАВАННЕ

●

Цячэ халодная рака
І крохнуць дрэвы
на панурых схілах,
І восень у зіму перацякае,
І ручаі збіраюцца ў плыні.

Цячэ праз свет стары сівы туман,
Як сон, як неба, як туга,
Што ўзнікла невядома скуль,
Што стала дрэвам над вадой,

Пабыўшы мной.

●

Няма кахання вечнага на свеце.
Ёсць толькі Вечнасць,
Вера і Дарогі,
Адна ці две, а ўздоўж Дарог
тых вецер
І скрыжаванняў млечныя парогі.

●

Ноч вакол. Маўклівая дарога.
Усё маўчыць бязбожна і паныла.
Апантана, груба і убога
б'ецца клён галінамі сухімі,
быццам вораг, быццам запазнелы,
хворы госць або аднекуль пошта.
Усё маўчыць.
І трызняць сном вакзалы.
Я — адзін і ноч, — але навошта?

●

Адлюлюлюкалі дажджы.
Пакорны лес курэў
і смягнуў.
І смуглых ясеняў навес
гудзеў і ледзьве чутна падаў.

Як здані, голыя шнуры
галля халодныя абшары.
І сонца дыск амаль стары
заблытаўся ў сутонні хмараў.

Гарачай парай ад кастра
клубяцца мроі сонным
цьменнем.
Ідзе суглобая пара, —
душы і сэрца задуменне.

Ілля СІН

ДЗЕСЬЦІ ПА-ЗА КРАЕМ ТАГО

дзесьці па-за краем таго
ёсць вялікія дзверы
імклівасць рушыцца на хвалі
абеліскаў
нож ружовыя хмары
агнём парушыць лабірынт
птушка

о бачыш гэта тут у мільгаценні
шкла

●

подых васковых карункаў
быццам помнік антычным фігурам
поўніцца
поўніцца
поўніцца
Жоўтым
тут
дзе блакітнасць агню

●

я знаходжуся тут
бо
мой агеньчык даўно патухнуў
тут я мушу вырошчваць мух
дый
гарыць шчэ мая цыгарэта
гэта свет
гэта золак сусвету

●

у запрудзіне зімовага стрыжню
ёсць нешта што цягнецца ўпрочкі
крышталь
расколіна у зоркавым тумане
сустрэнь мяне
птушкі ветру
бывай

●

я пагружаны ў водар
я сыходжу пранізлівым
дрэвам
маё цела агонь
пурпуровым камянём
дзе ёсць
промні
фіялетава-ціхіх пялёсткаў

кропля долу
каб рай
ты знішчы мяне

Юрась БАРЫСЕВІЧ

ТАК СКАЗАЎ ЗАРАТУСТРА

Ці павінен мастак належаць свайму народу, роднай мове? Ці павінна дрэва належаць сваім караням? На маю думку, творца не належыць нікому — таму ён і непатрэбны нікому. Творчаму чалавеку заўсёды бракавала братоў, бо няма ў яго бацькі. Каб мець бацьку, нельга займацца творчасцю. Бацькі робіцца тым больш, чым болей ты яму паслухмяны. Каб лепей Бога пабачыць, трэба стаць на калені... О, я не забараняю чалавеку верыць у Бога ці размаўляць на роднай мове, бо чалавек не здольны ўвесь час быць творцам. Але ж няхай будуць у жыцці тваім такія гадзіны, калі ты сам з'явішся будучыняй для сучаснікаў і суайчыннікаў, калі людзі праз цябе паразумеюцца, цябе сваёй мовай абраўшы.

Не бацькаўшчыне, а дзеткаўшчыне заклікаю належаць я вас. Творца павінен належаць толькі таму, што маецца стаць, чаго не было ў мінулым. Гэта вашае права, вашая вольнасць — жыць дзеля будучыні; належаць мінуламу — ваш абавязак. Бацькі амаль заўсёды з намі, ад іх няма куды падзецца. Цяжка знайсці месца, дзе яшчэ не было чалавека. І толькі нашыя дзеткі нас ратуюць ад нашых бацькоў. Будучыня — адзінае выйсце з мінулага. Ці знойдзеце вы гэты шлях?

●

Ці бывае ў творцы адчуванне, што ён падманам заняў сваё месца, што яго вось-вось скінуць, калі не зрабіць неабходных захадаў? Недалёка ж ты пайшоў, калі кожны можа быць замест цябе! Сапраўдныя вяршыні ўнушаюць страх раўніннаму люду: наўрад ці знойдзецца такі чалавек, які здолее парушыць адзіноту сапраўднага творцы. Ён, магчыма, і хацеў бы саступіць сваё месца іншаму, ён рады кожнаму ўзышоўшаму да яго чалавеку — але ж хіба многія дойдуць? Той жа, хто дайшоў, напэўна пойдзе яшчэ далей, схіліўшыся на міг перад першапраходцам. Невялікага ж ты дасягнуў, калі табе даводзіцца бараніць сваё месца пад сонцам!

Здараецца, творца перабольшвае адоранасць і шляхетнасць астатніх людзей — калі стамляецца ад адзіноты. Ён хоча быць роўным не чалавецтву, а кожнаму чалавеку. Так, творца марыць аб сустрэчы і роўнасці з іншымі людзьмі, тым часам як раб марыць аб узвышэнні над натоўпам, шляхетнай самоце і лёсе творцы.

●

Чым больш вялікі майстар, тым даўжэйшая "чарада эпох", традыцыя, якой ён сабе супрацьпастаўляе, якую ён ураўнаважвае і дапаўняе сваёй творчасцю.

Чалавек варты таго, чыю каштоўнасць ён ураўнаважвае — абвяргае і пацвярджае адначасова. Чалавек варты таго, чым ён змагаецца.

Супрацьпаставіць сябе традыцыі — значыцца даць ёй (і сабе самому) шанц выйсці на іншы, больш высокі ўзровень. Супрацьпастаўляючы сябе, сваю думку і творчасць іншым людзям, традыцыі, чалавек падрыхтоўвае вялікі сінтэз, здзейсніць які будзе дадзена, на жаль, не яму, але таму, хто зробіць крылы сабе з двух супрацьлеглых выказванняў ці нават дзвюх роўнакаштоўных традыцый: таму, хто здолее стацца вагамі (хіба не падобныя іхнія плечы да крылаў?). Кім жа ты будзеш — крылом або птушкай?

●

Ці возьмеш ты сабе вучня? Ці дазволіш каму-небудзь цябе разумець? О, сярод вучняў усялякага філосафа мог бы з'явіцца свой Ленін ці Гітлер! Сярод апосталаў тваіх можа з'явіцца новы Іуда. Ніколі не ведаеш, каго будзе несці ў свет пабудаваная табою дарога. Ці не таму такія складаныя некаторыя з мастакоў, такія маўклівыя сапраўдныя настаўнікі, што баяцца быць зразуметымі, баяцца дарыць майстэрства сваё невядомым нашчадкам? Творца нясе адказнасць за тых, каго натхніў новай ведай, бо вучні — гэта, магчыма, галоўны захад творцы: ягоны захад углыб чалавецтва. Традыцыя — гэта захад творцы ў будучыню ягонага народа. Ведаць бы, анёл ці пачвара наступнічаюць табе і стануцца тваім працягам...

Творца сам не хоча плесціся чужымі сцяжынамі, таму ён не хоча бачыць натоўп і ў сябе за спінай. Бо паслядоўнікамі робяцца не новыя творцы, а тыя, хто баіцца ісці ўласным шляхам. Творцу не згодныя з ім патрэбны, а тыя, хто спрабуе падоўжыць ці абвергнуць ягоныя думкі.

Творца імкнецца не падыходзіць да людзей надта блізка: яму непатрэбны другія я. Ён нікога не падпускае да сябе надта блізка, каб не пераблытаць сябе з кімсьці іншым.

Творца нікога не кліча за сабой, ён толькі пракладвае шлях, не ведаючы нават, навошта.

Алесь ТУРОВІЧ

ПЕРААДОЛЕННЕ ТЭКСТУ

КАНСПЕКТ ПРАЕКТА П'ЕСЫ

— Ты будзеш што-небудзь казаць?
— Не, я буду маўчаць.
— Чаму ты будзеш маўчаць?
— Таму што казаць няма чаго.
— Як няма чаго?! Глядзі, які вакол цікавы свет! Колькі тут усякіх рэчаў. Колькі розных людзей насяляе гэты свет. Ты толькі зірні! Ты толькі раскрый вочы, каб бачыць, ты толькі ўважліва прыслухайся, каб чуць. Ты толькі шырока ўздыхні, каб пасмакаваць паветра, ты толькі зрабі некалькі зрухаў, каб адзенне прымусіла ісці па скуры ледзьве чутныя электрычныя сігналы па нервах, і тады заўсёды будзе што сказаць.

— Добра. (Азіраецца). Бачу свет. Бачу рэчы (пералічвае ўсе рэчы, якія трапляюць на вока). Бачу людзей (глядзіць са сцэны ў залу і апісвае кожнага з гледачоў). Чую (пералічвае ўсе гукі, якія можна пачуць у зале, удыхае паветра і пералічвае пахі, пацягваецца, робіць некалькі крокаў, пералічвае свае пачуцці). Ты не заўважыў, што можна апісваць і адчуванне гравітацыі. Напрыклад, зараз я лёг і адчуваю сябе зусім па-іншаму, а калі стаю, кроў адыходзіць ад галавы, і прастора зусім іншая, а калі стаць на галаву і доўга стаяць, то праз хвілін дваццаць кроў перапоўніць капіляры, пэўны час будзе вельмі балюча, а потым ужо не будзе што апісваць, хіба ўласныя хаўтуры, кажуць, пасля смерці нябожчык чуе і ведае ўсё, што вакол яго адбываецца. Вось і ўсё.

— Не (перапыняе), ты не пра тое гаворыш. Тое, што ты кажаш — не мастацтва, не цікава. Вось каб ты пра сябе што-небудзь распавёў, пра сваё няўдалае каханне, пра сваё змаганне, пра сваю веру, пра тое, што табе сапраўды балюча, пра тое, як цяжка ці лёгка жыць, каб ты нарэшце са сваёй гаворкі выйшаў на вялікія абагульненні, якія б пасля дазволілі людзям не паўтараць тваіх памылак, жыць, радавацца, развівацца далей, убачыць тое, што ты не здолеў убачыць, каб яны болей не паўтаралі тваіх памылак.

— *(Глядзіць на яго здзіўлена).* А хіба хто-небудзь бачыць нешта такое, чаго я не бачу? А хіба хто-небудзь можа сказаць што-небудзь не тое, што я сказаў. *(Паўтарае маналог).*

— Не! Ты зірні ў глыбіні сваёй душы.
— Зазірнуў.
— І што ты там бачыш?
— Нічога.
— Як нічога?
— А так, я ж не медык, я — паэт. І што я там магу убачыць?
— Не, добра. Пачнём з самага пачатку. Чым ты займаўся ўчора ўвечары?
— Рэпеціраваў.
— Што рэпеціраваў?
— Гэтую п'есу рэпеціраваў.
— І чым ты займаўся на рэпетыцыі?
— Мы з табой працавалі над дыялогамі, мізансцэнамі. Не, пачыналі мы з гімнастыкі, пасля былі галасавы трэнінг, практыкаванні на каардынацыю, потым ужо стваралі вобразы.
— Так, стваралі вобразы. І як мы гэта рабілі? Якія ў цябе адносіны да герояў? Ці супадала тое, што прымушаў рабіць рэжысёр, з тым, што табе хацелася рабіць?
— А якая розніца, ці супадае, ці не? Проста сказана, вось я і раблю, у яго канцэпцыя, якую нельга правільна зразумець актору, які стварае толькі фрагмент агульнага малюнка.
— Аднак жа ёсць ты, са сваім светапоглядам, няма чалавека падобнага на цябе, няўжо не хацелася паспрачацца: рабіць сваё?
— А што спрачацца, калі і так усё зразумела. Проста прамаўляецца рэпліка, і нічога не трэба тлумачыць, няма ніякага падтэксту ці кантэксту. Усё на паверхні.
— Ну добра, добра. А што ж там казалася?
— Вось тое, што зараз прагаворваем, тое і казалася. Менавіта тыя словы, якія гучаць зараз.
— І болей нічога?
— Так.
— Літаральна слова ў слова? Тое, што зараз паўтараем?
— І ні слова іншага.
— І ўсё, што мы зараз нават паспрабуем выдумаць, казалася на рэпетыцыях? А давай што-небудзь скажам такое, чаго не гаварылася на рэпетыцыях.
— А ўсё гаварылася, нават "а давай што-небудзь скажам такое, чаго не гаварылася на рэпетыцыях".
— Няўжо і гэта "што-небудзь" прамаўлялася?
— Так, прамаўлялася.
— А калі зараз скажу што-небудзь такое, чаго ніяк не магло быць на рэпетыцыях, што-небудзь абсалютна бязглуздае, зусім недарэчнае?
— Ну давай гэтае бязглуздае і недарэчнае.
— І скажу... Э-э (*Гучна ўздыхае, здзіўлены, і, разам з тым, вельмі ганарыцца такой магчымасцю, напружана думае).* Не, гэта банальна... Лепей вось такое... Не, таксама не падыходзіць, і... Не, таксама недзе ўжо чуў, канешне, гэта ўсе і так ведаюць, і, канешне, адрэпеціравалі, і гэта... І гэта... Не, не магу *(у адчаі).* НЕ МАГУ. Усё недзе казалася і ўсё можна прадказаць, і, канешне, прамаўлялі.
— Так.
— Нават калі проста алфавіт прачытаць?
— Так.
— Кітайскі алфавіт?
— Так.
— Задам наперад?
— Акурат учора ты збіраўся чытаць кітайскі алфавіт задам наперад.
— Вось ты і папаўся, а сёння я не буду чытаць кітайскі алфавіт задам наперад.
— Я не кажу, што ты яго чытаў. Адна з тваіх рэплік была: "Вось ты і папаўся, а зараз я не буду чытаць кітайскі алфавіт задам наперад".
Уваходзіць трэці.
— Хопіць глупствам займацца, час пачынаць рэпетыцыю.

ЛіМ ЧАСАПІС

"БЕЛАЯ ВЕЖА - 96"

У Брэсце закончыўся міжнародны тэатральны фестываль "Белая вежа - 96". Перад прысутнымі са словамі прывітання выступіў старшыня аргкамітэта намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Рылатка, які зачытаў пісьмо-зварот да ўдзельнікаў фестывалю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі. Затым сваё майстэрства брастаўчанам і гасцям горада паказвалі артысты Германіі, Польшчы, Украіны, Расіі і Беларусі.

На здымках: выступае старшыня аргкамітэта фестывалю намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь У. Рылатка; тэатралізаванае прадстаўленне перад адкрыццём фестывалю.

Фота Рамана КАБЯКА, БЕЛТА

КАРЭЙСКАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

У мастацкай галерэі "Медзэя" адкрылася выстава мастацкіх твораў карэйскай народнай творчасці. Яе арганізавалі — гандлёвае прадстаўніцтва Карэйскай Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, Беларускае рэспубліканскае таварыства сяброў КНДР імя Кім Ір Сена і мастацкая галерэя "Медзэя".

У разнастайных работах, што прадстаўлены ў экспазіцыі, беларускія аматары мастацтва Усходу могуць убачыць жывапісныя карціны, выкананыя незвычайнай тэхнікай: вышыўкай шоўкам, складзеныя з кавалачкаў перламутру або разной косці, каляровага пяску або тоўчанага каменя. Усе работы знаёмяць беларускіх гледачоў з незнаёмай нам тысячагадовай культурай, гісторыяй, прыродай Карэі, з дасягненнямі карэйскага народа.

На здымку: агляд экспазіцыі.

Фота Генадзя СЯМЁНАВА, БЕЛТА

РОДАМ З НАВАГРАДЧЫНЫ

6 кастрычніка споўнілася 120 гадоў з дня нараджэння Яна Булгака (памёр 4 лютага 1950 года), беларускага і польскага этнографа, фалькларыста, майстра мастацкай краязнаўчай фатаграфіі. Родам з вёскі Асташына, што на Наваградчыне. Цікавасць уяўляюць і артыкулы Я. Булгака, як, напрыклад, "Велікодныя песні на Міншчыне (валачобнікі)", "Экскурсія на Свіцязь"... Але ў першую чаргу — яго краязнаўчыя здымкі, што ўзнаўляюць беларускія краявіды, жыццё вёскі, адлюстроўваюць сялянскія пабудовы, быт жыхароў. У 1919—1939 гадах Я. Булгак узначальваў лабараторыю мастацкай фатаграфіі пры Віленскім універсітэце. Вельмі шкада, што многія яго унікальныя работы не дайшлі да нашага часу. У 1944 годзе ў Вільні згарэла яго калекцыя, што налічвала каля 10 тысяч здымкаў.

У беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі Беларусь выступае як самастойны аб'ект гістарычнага даследавання і як суб'ект гістарычнага працэсу. Такі падыход фармаваўся паступова і быў цесна звязаны з эвалюцыяй беларускай нацыянальнай ідэі і фармаваннем нацыянальнай ідэалогіі наогул. У другой палове XIX — пачатку XX ст. Беларусь канчаткова становіцца самастойным аб'ектам доследу гісторыкаў. А вось ператварэнне яе ў суб'ект гісторыі аказалася працэсам больш складаным. Разуменне, што творцам нацыянальнай гісторыі з'яўляецца сама нацыя, што гэта яна нясе галоўную адказнасць за ўласны гістарычны лёс, прыходзіць не адразу і сведчыць пра даволі высокі ўзровень нацыянальнай і гістарычнай свядомасці. Значна часцей нацыя шукае вінаватых у сваіх бедах сярод суседніх дзяржаў і народаў. І непазбежна ўзнікае вобраз "ворага". Не пазбегла гэтага вобраза і беларуская нацыянальная ідэалогія, якая ў другой палове XIX — пачатку XX ст. перажывала важны этап свайго станаўлення. Да складвання вобраза "ворага" прычынілася і гістарыяграфія.

Што ўяўляў сабой вобраз "ворага" ў беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі? Якім было яго месца ў трактоўцы мінулага? І як гэта ўплывала на развіццё гістарыяграфіі і нацыянальнай ідэалогіі наогул?

ПАМІЖ "ДВУХ ЗОЛ"

ВОБРАЗ "ВОРАГА" Ў БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX — ПАЧАТКУ XX СТ.

У афіцыйнай ідэалогіі другой паловы XIX ст. Беларусь выглядала як "Заходні край Расіі", а беларусы — як адно з плямёнаў рускага народа. Каб прабіць мур "заходнерусізма", спатрэбіліся намаганні не толькі навукоўцаў (А. Кіркора, М. Доўнар-Запольскага, Я. Карскага і інш.), але і дзеячаў беларускага нацыянальнага руху (К. Каліноўскага, беларускіх народнікаў, Ф. Багушэвіча). Усе яны прычыніліся да станаўлення беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі, якая ва ўвесь голас заявіла пра сябе "Кароткай гісторыяй Беларусі" В. Ластоўскага (1910 г.). Апошняя быццам акумулявала і нацыянальнае пачуццё дзеячаў беларускага руху, і тагачасны навуковы ўзровень ведаў пра мінулае Беларусі.

К. Каліноўскі (1838—1864) у сваіх публіцыстычных творах не часта звяртаўся да гісторыі. Тыя гістарычныя экскурсы, якія сустракаліся на старонках "Мужыцкай праўды", былі часткай прапагандысцкай падрыхтоўкі паўстання. Аднак гэта зусім не прыніжае іх значэння.

З дапамогай гісторыі К. Каліноўскі даказаў сялянам, што прычынай іх бядотнага становішча з'яўляецца ўстанаўленне "маскоўскага праўлення": "...пайшоў рондз маскоўскі, так і ўсё зрабілася па-чартоўску". Грабежніцкімі набегамі "немца" і "маскаля" К. Каліноўскі тлумачыў канец "залатога веку" на Беларусі ("Быў-то калісьці народ наш вольны і багаты").

Ён абвінавачваў "маскоўскага цара" ў знішчэнні беларускай уніяцкай царквы: "...адабраў ад нас нашую справядлівую уніяцкую веру і пагубіў нас перад Богам навекі, каб мог нас без канца драці".

Відавочна, што ў якасці галоўнага ворага Беларусі ў публіцыстыцы К. Каліноўскага выступаў "маскаль". Гэты тэрмін не распаўсюджваўся на весь рускі народ. Для К. Каліноўскага "маскаль" — гэта цар, чыноўнікі, войска.

Аднак толькі гэтым вобраз "ворага" не абмяжоўваўся. Распавёўшы пра напады зайздросных суседзяў ("немца" і "маскаля"), К. Каліноўскі адзначаў, што на заклік караля абараняць родную зямлю адгукнуліся далёка не ўсе. Многія засталіся ў сваіх сядзібах. І кароль, каб узнагародзіць мужнасць, загадаў тым, хто не пайшоў на вайну, карміць і утрымліваць абаронцаў і іх сем'і. Аўтар "Мужыцкай праўды" нагадаў і пра "касцюшкаўскі маніфест", які дараваў волю тым сялянам, што папаўнялі шэрагі паўстанцаў. Аднак і ў гэтым выпадку, заўважыў К. Каліноўскі, не ўсе ўзняліся на барацьбу, бо "маскаль спыніў маніфест". У выніку паўстанне было задушана.

У публіцыстыцы К. Каліноўскага вобраз "ворага" выступаў нібыта ў двух іпастасях. Гэта не толькі знешні вораг ("маскаль"), гэта і "ўнутраны" вораг — баязлівасць і абыякавасць. І вось на гэтую другую іпастась варта звярнуць увагу. Існаванне "ўнутранага" ворага спрыяла пашырэнню ў нацыянальнай гістарыяграфіі і ў ідэалогіі наогул пачуцця ўласнай адказнасці за ўласны гістарычны лёс. А гэта было першым крокам да ўсведамлення сваёй нацыі ў якасці суб'екта гісторыі.

А. Кіркор, аўтар гістарычнай часткі т. II "Живописной России" (1882), не з'яўляўся гісторыкам-прафесіяналам. Тым не менш, добрае веданне гістарычнай літаратуры, уласныя этнаграфічныя і археалагічныя даследаванні, "літвінскі" патрыятызм дапамаглі яму напісаць працу, якая сталася значным укладам у беларускую гістарыяграфію.

А. Кіркор удзяліў шмат увагі той ролі, якую адыгралі ў гістарычным лёсе беларуска-літоўскага краю бліжэйшыя ўсходні і заходні суседзі. У прыватнасці, ён адзначыў барацьбу, якую вялі польскія палітыкі на чале з кракаўскім біскупам З. Алясьніцкім супраць імкнення вялікага князя Вітаўта "ўтварыць моцную незалежную дзяржаву і стаць каралём Літвы і Русі". Люблінскую унію А. Кіркор ацаніў, як палітычную смерць Вялікага княства. Тым не менш, ён не выказаў ні абурэння, ні асуджэння дзейнасці польскіх палітыкаў. Наадварот, у адносінах да таго ж З. Алясьніцкага і яго паплечнікаў аўтар заўважыў, што яны былі "людзьмі разумнымі, глыбокімі палітыкамі і сапраўднымі патрыётамі" Польшчы. Аналагічна А. Кіркор паставіўся да працэсу паланізацыі, да культурнага дамінавання Польшчы на беларуска-літоўскіх землях у XVII—XVIII стст. "Нельга... не пагадзіцца, — пісаў ён, — што як у адукацыі, так і ў грамадзянскіх правах і ўстановах і, нарэшце, у свядомым пачуцці патрыятызму, палякі мелі значную перавагу над літоўцамі і беларусамі. Гэтым і тлумачыцца, што па закону прыроды вышэйшая і мацнейшая цывілізацыя праглынула слабейшую і малодшую". Прычына гэтай перавагі, па А. Кіркору, у тым, што "кола гісторыі павярнулася ў бок палякаў".

Распавядаючы пра адносіны з усходнім суседам, А. Кіркор адзначыў імперскія амбіцыі маскоўскіх уладароў, якія былі прычынай бясконцых ваенных паходаў на Беларусь і Літву. Тысячы і тысячы магіл, пісаў ён, нагадваюць беларусам пра тыя войны. А. Кіркор настолькі моцна адчуваў трагедыю беларускай зямлі, змардаванай маскоўскай агрэсіяй, што нават напалеонаўскае нашэсце параўнаў з дзеяннямі войскаў цара Аляксея Міхайлавіча і Пятра I, якія, па яго словах, ператварылі край у выпаленую зямлю. Палітычныя падзеі другой паловы XVIII — першай паловы XIX ст. гісторык пералічыў у тэлеграфным стылі без каментарыяў. Ніякіх уласных ацэнак знешняй палітыкі Расіі, укладу ўсходняга суседа ў гістарычны лёс беларусаў і літоўцаў А. Кіркор не зрабіў. Ён быццам толькі канстатаваў факты.

На першы погляд, вобраз "ворага" ў працы А. Кіркора цалкам адсутнічаў. Усё адмоўнае, што прыйшло з Захаду або Усходу, ён тлумачыў наканаваннем гістарычнага лёсу. У гістарычнай канцэпцыі А. Кіркора палякі нават не трапляюць у катэгорыю "чужых". Яны "свае". Іх блізкасць абумоўлівалася перапляценнем гістарычнага лёсу палякаў, беларусаў і літоўцаў. "Літвінскі" патрыятызм А. Кіркора спалучаўся з замілаваннем да Рэчы Паспалітай як Айчыны ў шырокім сэнсе. Якраз таму ў вельмі стрыманых і асцярожных высновах А. Кіркора адчувалася сімпатыя да польскай нацыі і, асабліва, да дзеячаў польскай культуры ў беларуска-літоўскім краі.

А вось расійскі ўплыў на беларускую гісторыю ён ацэньваў інакш. А. Кіркор пазбягаў асуджальных высноў, але з кожнай старонкай гістарычнага нарыса нарастала пачуццё, што Расія — гэта чужынец. Аўтар толькі знешне захоўваў нейтралітэт. Яго пэўная адхіленасць ад прыведзеных гістарычных фактаў прымушае ўспомніць пра час, калі пісаўся т. III "Живописной России". Пачатак 80-х гадоў XIX ст. на Беларусі і Літве — гэта перыяд мэтанакіраванай русіфікацыі краю. Адхіленасць А. Кіркора — толькі вынік аўтарскай абачлівасці. Гістарычныя факты, выкладзеныя на старонках яго працы, казалі самі за сябе. Яны не патрабавалі каментарыяў. Уважлівы і ўдумлівы чытач выдатна разумеў, што нічога, акрамя бед і гора, маскоўскія ўладары не прынеслі на беларускую зямлю. Пацвярджае гэта і аўтарскае разважанне наконт паўстання 1863—1864 гг., "Тысячы забітых у бітвах, мноства расстраляных і павешаных, тысячы сасланых у катаргу і Сібір, спаленне і спусташэнне шматлікіх селішчаў, высяленне вёсак, пазбаўленне жыхароў шляхецтва, права набываць маёнткі, займаць дзяржаўныя пасады, абмежаванне колькасці вучняў вышэйшых навучальных устаноў, прыпыненне дабрадзейных рэформ, якімі карыстаюцца ўнутраныя губерні... — вось сумныя наступствы захаплення і легкадумнай веры замежным падбухторшчыкам". Выснове гэтага сказа выразна пярэчыць падрабязны пералік бедстваў, якія перажыў край. Гэты пералік нясе моцны эмацыянальны антырасійскі зарад, і тым самым указвае на зусім іншага віноўніка.

Вобраз "ворага" прысутнічаў у працы А. Кіркора. Ворагам з'яўляліся маскоўскія, а пазней расійскія, уладары і іх прыспешнікі. Аднак гісторык не завастраў увагу на гэтым вобразе.

Гісторыя Беларусі прысутнічала і ў публіцыстычных творах беларускіх народнікаў, якія на пачатку 80-х гадоў зрабілі першую спробу тэарэтычна абгрунтаваць існаванне беларускай нацыі. У так званым "Пісьме Данілы Баравіка" ("Письма о Белоруссии. Письмо первое", 1882) адзначалася, што да XV ст. беларускі народ жыў самастойным жыццём, меў уласную дзяржаву ("Літву") і сам вызначаў свой гістарычны лёс. Усё змянілася, калі ўзраслі культурна-рэлігійныя і палітычныя ўплывы Польшчы. Іх вынікам, па меркаванні аўтара (ці аўтараў?) "Пісьма", сталася паланізацыя "вышэйшага класа беларускага народа" і страта дзяржаўнасці. Працэсы паланізацыі не закранулі "просты беларускі народ", які быў моцна прыціснуты прыгонным ладам і вёў сапраўдную барацьбу за выжыванне.

З канца XVIII ст. на беларускай зямлі ўстанавілася расійскае панаванне. Праўда, спачатку гэта нічога не змяніла. У "Пісьме" адзначалася, што ў перыяд праўлення Аляксандра I нават працягвалася паланізацыя, якая закранула ўжо і сялянства. А вось пасля 1863 г. пачалося абрусенне краю. Як сцвярджалі народнікі, русіфікацыя адбываецца праз адукацыю і палітыку рэпрэсій: "Наша Беларусь вось ужо 20 гадоў знаходзіцца ў выключным ваенным становішчы, пры якім немагчыма ніякая законнасць". Тым не менш, у "Пісьме" выказвалася ўпэўненасць, што беларускі народ не паддаўся ні паланізацыі, ні русіфікацыі, і захаваў сваю адметнасць.

Аналагічных поглядаў на беларускую гісторыю прытрымліваліся і выдаўцы часопіса "Гомон". Яны сцвярджалі, што бліжэйшыя суседзі звычайна глядзелі на беларусаў як на матэрыял да асіміляцыі і імкнуліся растварыць іх "у велікарускім або польскім моры": "Палітыка гвалту працягвалася цэлыя стагоддзі. Яна пачалася ўладарніцтвам Польшчы і завяршаецца панаваннем маскоўскага абсалютызму. Апошні не прыпыняецца ні перад якімі сродкамі дзеля дасягнення аднастайнасці, вельмі зручнай для яго фіксальных і паліцыйных мэт". Аўтары "Гомона" адзначалі, што Беларусь мела "ўласнае гістарычнае жыццё", характэрнай рысай якога было "народаўладдзе". Народ выганяў князёў і запрашаў іх па сваёй волі. Канец "уласнага гістарычнага жыцця" народнікі звязвалі з палітыкай Польшчы, якая, па іх словах, разбэсціла шляхецкую беларускую інтэлігенцыю і падавіла народ. Яны звярталі ўвагу, што слова "паляк" для беларуса часта з'яўляецца сінонімам слоў "пан, памешчык" і нагадвае пра цяжкі час прыгонніцтва.

Гоманаўцы катэгарычна абвяргалі тэзіс пра забітасць і выраджэнне беларусаў. Яны падкрэслівалі, што беларусы ў сваёй гісторыі неаднаразова ўздымаліся на барацьбу ў абарону "сваёй рэгіянальнасці і супраць шляхецкага прыгнёту".

Народнікі заклікалі беларусаў паверыць ва ўласныя сілы і стаць гаспадарамі свайго лёсу: "Прэч эксплуатацыю! Мы самі жадаем кіраваць сабой! Прэч чужыя рукі! Беларусь для беларусаў, а не для чужынцаў! Досыць нам падпарадкоўвацца мацнейшым і чакаць, куды яны нас павернуць — направа ці налева! Мы самі павінны заяваваць сабе свабоду, не спадзеючыся на іншых!".

У публіцыстычных творах беларускіх народнікаў вобраз "ворага" набыў досыць вялікую вагу. Яны першымі вылучылі тэзіс "двух зол" беларускай гісторыі — польскага і маскоўскага. Упершыню вобраз "ворага" пераносіўся і ў сацыяльную сферу. Гістарычным віноўнікам цяжкага становішча беларускага народа абвяшчалася шляхта. Цікавасць выклікае і само ўжыванне тэрміна "беларускі народ". Гэтае паняцце ўжывалася і ў этнічным і ў сацыяльным сэнсе. Але, адзначыўшы працэс паланізацыі, народнікі пачалі атаясамліваць беларускую нацыю з сялянствам.

Вобраз "ворага" спалучаўся з перакананнем у здольнасць беларусаў самастойна вырашаць свой лёс. Гэтае перакананне было гістарычна абгрунтавана. Яно не дазваляла воб-

разу "ворага" ператварыцца ў вызначальны фактар беларускай гісторыі.

Станаўленню беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі спрыяла этнаграфічнае даследаванне Беларусі, якое актывізавалася з другой паловы 60-х гадоў XIX ст. Працы М. Нікіфароўскага, І. Сербава, М. Янчука, Е. Раманава і інш. разам з т. III "Живописной России", які быццам надаў другое жыццё канцэптуальным падыходам віленскіх гісторыкаў пачатку XIX ст., стварылі падставы для пераносу пераважна публіцыстычнага варыянта нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі на навуковую глебу. І першы сур'ёзны крок на гэтым шляху зрабіў М. Доўнар-Запольскі.

У 1888 г. гэты, яшчэ малады, гісторык выступіў на старонках газеты "Минский листок" з цыклам артыкулаў пад назвай "Белорусское прошлое". Ён не сумняваўся ў існаванні беларускай нацыі, якая мела ўласную, адметную ад суседніх народаў, гісторыю. Услед за "гоманаўцамі" даследчык адзначыў моцныя традыцыі народаўладдзя ў беларускай гісторыі; "... беларускі народ да канца XIV ст. ... жыў самастойным жыццём, захоўваў ранейшы вечавы лад". Аднак пашырэнне палітычных і рэлігійных уплываў Польшчы нанесла моцны ўдар па самастойнасці і дэмакратычных традыцыях. У дзейнасці польскіх палітыкаў М. Доўнар-Запольскі бачыў імкненне насадзіць у Беларусі шляхецкую арыстакратычную рэспубліку і падагнаць пад польска-каталіцкі ўзор усе народы краю. Гэтая палітыка абярнулася для Беларусі ўстанаўленнем "польска-каталіцкага іга", што, на думку гісторыка, прымусіла беларусаў шукаць дапамогі ў Масквы. Але маскоўскі ўрад у сваіх адносінах да нацыянальна-культурных асаблівасцяў розных народаў, да іх дэмакратычных традыцый нічым не адрозніваўся ад польскага: "Польшча навязвала Беларусі шляхецкую арыстакратычную рэспубліку, Масква — баярскую алігархію. І першая, і другая дзяржавы цалкам выключалі з палітычнага жыцця дэмас, тады як беларускі народ па сваіх гістарычных і народна-бытавых традыцыях быў у вышэйшай ступені дэмакратычны". М. Доўнар-Запольскі падкрэсліў імкненне Масквы да знішчэння ўсяго невялікарускага. Гэтае імкненне, на яго погляд, захавалася і пасля далучэння ўсёй Беларусі да Расіі. Палітыку абрусення даследчык лічыў гібельнай для беларускай зямлі.

М. Доўнар-Запольскі першым паспрабаваў зрабіць навуковае абгрунтаванне тэзіса "двух зол". Усходні і заходні суседзі, узаемадапаўняючы свае намаганні, знішчалі палітычную самастойнасць беларускай нацыі і перашкаджалі яе нацыянальна-культурнаму развіццю.

У 1905 г. М. Доўнар-Запольскі зноў выступіў з публікацыяй, разлічанай на масавага чытача. Ён прыняў удзел у падрыхтоўцы т. IX выдання "Россия. Полное географическое описание...". Яно рыхтавалася імператарскім рускім геаграфічным таварыствам. Зразумела, што гісторык павінен быў улічваць, што працуе для афіцыйнага выдання. Відаць, з гэтым было звязана выкарыстанне афіцыйнай тэрміналогіі, адмова ад уласных ацэнак дзейнасці расійскіх уладаў на Беларусі і інш. Аднак прынцыповыя палажэнні гістарычнай канцэпцыі М. Доўнар-Запольскага засталіся нязменнымі. Ён паранейшаму стаяў на пазіцыі, што беларускі край (у тэксце "Заходняя Расія") прайшоў уласны гістарычны шлях і мае сваю самабытную гісторыю. Захаваўся, хоць і ў вельмі памякчэлай форме, тэзіс "двух зол" беларускай гісторыі. "Польскае зло" было змякчана сцвярджэннем, што характэрныя для Беларусі "асаблівасці старажытнарускага быту развіваліся і ўспрымалі польскія рысы толькі ў тым выпадку, калі апошнія адпавядалі першым".

У параўнанні з публікацыяй 1888 г. больш адчувальнай стала сацыяльная тэматыка. Працэс запрыгоньвання М. Доўнар-Запольскі звязваў з польскім уплывам. Аднак гісторык далёкі быў ад таго, каб толькі польскі бок абвінавачваць ва ўсіх цяжкасцях жыцця прыгоннай вёскі. Ён падкрэсліў, што "прыгонны лад асвячаўся і рускімі законамі". Хаця ў адрозненне ад Расіі, як заўважыў даследчык, запрыгоньванне беларускіх сялян супадала з паланізацыяй шляхты, а гэта вяло да перапляцення сацыяльна-эканамічнага прыгнёту з нацыянальна-рэлігійным.

М. Доўнар-Запольскі вельмі асцярожна выказваўся пра палітыку абрусення Беларусі: "Праваднікі рускай палітыкі... імкнуліся сцерці ўсё, што нагадвала Польшчу, але разам з тым яны выступалі і супраць якога б ні было руху сярод мясцовых народнасцяў". Аднак, як і ў выпадку з А. Кіркорам, фактычна матэрыял казаў сам за сябе. Гісторык асцярожна, але паслядоўна праводзіў думку, што беларуская зямля — гэта край адметны ад Польшчы і Расіі і, кіруючы ім, трэба ўлічваць асаблівасці беларускай нацыі.

М. Доўнар-Запольскі на працягу амаль усёй сваёй навуковай дзейнасці прытрымліваўся тых канцэптуальных пазіцый, якія адчуваліся ўжо ў першай публікацыі. Яго працы адыгралі вялікую ролю ў навуковым абгрунтаванні таго вобраза "ворага", з якім мы сустрэліся ўжо на старонках "Гомона". Антышляхецкія матывы хаця і прысутнічалі, але значнага месца не займалі.

У 1891 г. у Кракаве выйшаў паэтычны зборнік Ф. Багушэвіча "Дудка беларуская". Кніга пачыналася аўтарскай прадмовай, якая стала адным з праграмных дакументаў беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння. Прадмова была прасякнута гонарам за слаўную беларускую гісторыю, калі беларуская зямля складала ядро Вялікага княства Літоўскага, "як тое зярно ў гарэху", калі беларуская мова была мовай, на якой пісалі і размаўлялі "вялікія паны". На думку Ф. Багушэвіча, сама назва, Беларусь, сведчыла пра чысціню беларускай зямлі, якая "нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася". Аднак аўтарскае пачуццё гонару перамяжоўвалася з адчуваннем страты: "Што ж мы за такія бяздольныя?!.. Наша мова для нас свята... але так ужо мы самі пусцілі яе на здзек".

У гэтым дакуменце зноў відавочная спроба звярнуць увагу на сябе, на "ўнутранага" ворага, які атаясамліваўся з непавагай да саміх сябе, да сваёй роднай мовы, адсутнасцю нацыянальнага гонару і годнасці.

Значную ролю ў станаўленні нацыянальнай гістарыяграфіі адыграла навуковая дзейнасць Я. Карскага. Ужо першы том яго славутага даследавання "Белорусы" (1904), заснаваны на аналізе лінгвістычных крыніц, пацвярджаў існаванне беларускай нацыі са сваёй самабытнай гісторыяй. Гэта адзначыў і сам аўтар у шэрагу даволі скупых заўваг, тыпу: "Літоўскай Русі давялося жыць адменным жыццём". Вобраз "ворага" ў яго працы адсутнічаў.

У 1910 г. з віленскай друкарні М. Кухты выйшла "Кароткая гісторыя Беларусі". Яе аўтар, В. Ластоўскі, з'яўляўся актыўным дзеячам беларускага руху. Ён не быў прафесійным гісторыкам, і яго кніга насіла кампілятыўны характар. Аўтар і не хаваў гэтага. У прадмове ён адзначыў, што дазволіў сабе толькі "некаторыя здарэнні асудзіць па-свойму, з становішча карысцей і шкод беларускага народу". Працягваючы патрыятычную лінію беларускай нелегальнай публіцыстыкі, аўтар выкарыстаў найбольш вядомыя даследаванні гісторыкаў розных накірункаў, у т. л. працы М. Доўнар-Запольскага, Я. Карскага, А. Кіркора.

"Кароткая гісторыя Беларусі" — гэта, у першую чаргу, гісторыя беларускай дзяржаўнасці. Паводле В. Ластоўскага, барацьбу за незалежнасць пачаў Полацк у XI ст. Характарызуючы Полацкае княства, аўтар "Кароткай гісторыі" не абмінуў вядомага тэзіса пра народаўладдзе: "На Беларусі з самых даўніх часоў трымаўся вечавы парадак, пры каторым, па праўдзі, княжствам кіраваў народ, а не князь". Аднак В. Ластоўскі надаў гэтаму тэзісу пэўную патрыятычную афарбоўку: "Народ крэпка любіў род сваіх князёў, князю другога, чужога роду, цяжка, да і не зусім бяспечна было садзіцца на пасад Полацкіх князёў".

Падобную "любоў" В. Ластоўскі заўважыў і ў часы княжання Вітаўта: "Кожны селянін мог даступіцца да яго і выказаць свае крыўды ці патрэбы. Вітаўт належыў да ліку тых, што патрапяць людзей кожнай нацыі, кожнай веры лічыць роўнымі сабе, калі яны толькі былі добрымі грамадзянамі". І далей: "Пры Вітаўце Беларусь аддыхнула лягчэй. Дрэнна было пры ім князям і баярам але народу лепей жылося". Тэрмін "народ" у першых дзвюх частках кнігі ўжываўся як сацыяльная катэгорыя.

Гісторыю дзяржаўнасці перыяду ВКЛ В. Ластоўскі тлумачыў з пазіцыі "двух зол" беларускай гісторыі. Ён даводзіў, што Масква і Польшча, заўсёды варожыя паміж сабой, у адносінах да Беларуска-Літоўскай дзяржавы сышліся на агульнай платформе яе знішчэння. Агрэсія Масквы, на яго погляд, спрыяла экспансіяністкім мэтам польскіх палітыкаў: "Беларусь дайшла да такой самай руіны, як усходняя і палудзенная Русь у часе татарскага панавання". І далей: "Іаан III быццам заганяў Літву і Беларусь у рукі палякаў". Менавіта ў гэтай агрэсіі В. Ластоўскі бачыў галоўную прычыну Люблінскай уніі, якую ён, услед за А. Кіркорам, ацаніў як палітычную смерць Беларуска-Літоўскай дзяржавы.

На думку В. Ластоўскага, гэтай палітычнай смерці вельмі паспрыяла паланізацыя беларускай шляхты. Ён з асуджэннем пісаў пра шляхту, якая "пакідае ўсё роднае беларускае, забывае аб справе нацыянальнай, месца якой займае справа шляхецтва". На старонках "Кароткай гісторыі" была змешчана "Прамова І. Мялешкі", ананімны твор XVI ст., які рэзка асуджаў апалячаную шляхту: "Хоць нашая костка, але сабачым мясам абрасла і ваняе". Шляхце і магнатэрыі В. Ластоўскі супрацьпаставіў народ, які "ставаўся для іх чужым з усімі сваімі бедамі і нядолямі", але "патрапіў зберагчы старую сваю мову, звычаі". Цяпер тэрмін "народ" набыў і этнічны сэнс. Справа беларускай незалежнасці, абароны і развіцця беларускай культуры сталася народнай справай. Той, хто праводзіў антынародную палітыку, аўтама-тычна ператвараўся ў ворага беларускай незалежнасці. І наадварот. Антышляхецкая накіраванасць гістарычнай канцэпцыі В. Ластоўскага, якая досыць выразна адчувалася ў ягонай трактоўцы падзей XV—XVIII стст., атрымала не столькі сацыяльнае, колькі этнічнае абгрунтаванне. Прычыны сялянска-казацкага руху на Беларусі ў 1648—1651 гг. В. Ластоўскі бачыў пераважна ў нацыянальна-рэлігійнай палітыцы вярхоў Рэчы Паспалітай. Войска гетмана Я. Радзівіла, якое падаўляла паўстанцкі рух, ён называў "польскім" і нават працытаваў радкі з песні пінчукоў, уцалелых падчас знішчэння г. Пінска ў 1648 г.:

Дзень і ноч буду маліці,
Дзень і ноч буду прасіці,
Каб загінулі Ляхі.

Здавалася б, што ў В. Ластоўскага, як раней і ў народнікаў, мы назіраем поўнае атаясамліванне беларускай нацыі з сялянствам. Аднак на наступных старонках аўтар "Кароткай гісторыі" зрабіў пэўныя агаворкі.

Палітычную дзейнасць Я. Радзівіла В. Ластоўскі ацаніў станоўча. У спробе гетмана перадаць ВКЛ пад апеку шведскага караля (1655 г.) ён убачыў імкненне "выламацца з залежнасці ад Польшчы... Ва ўсім гэтым была і здаровая гасударственная думка адбудаваць незалежнае Літоўскае гасударства".

Да таго ж В. Ластоўскі ўжываў тэрмін "наша польская шляхта", а характарызуючы падзеі першай паловы XIX ст., адзначыў наяўнасць пачуцця гістарычнай асобнасці ад палякаў.

Пэўная канцэптуальная блытаніна "Кароткай гісторыі", відаць, была звязана з кампілятыўным характарам працы. Рэч Паспалітую XVII—XVIII стст. В. Ластоўскі называў "польскай Рэччу Паспалітай". Яе кіраўнікі, на яго думку, неслі поўную адказнасць за знішчэнне былой свабоды веравызнання. Якраз палітыка рэлігійнага прыціску некатолікаў, якую праводзіла шляхта разам з каталіцкім духавенствам, на погляд аўтара, прымушала праваслаўных шукаць падтрымкі ў Масквы, а пратэстантаў — у Нямеччыне. Вынікам умяшальніцтва суседзяў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай сталі падзеі дзяржавы.

У апошняй частцы кнігі В. Ластоўскі паказваў антыбеларускую і антынародную палітыку расійскіх уладароў. Падрабязна пералічыўшы ўрадавыя мерапрыемствы па русіфікацыі Беларусі, дзеяч беларускага руху не забыў нагадаць і пра значнае пагаршэнне становішча сялян: "Доля простага народа пагоршылася, бо расійская адміністрацыя ўзмоцніла паншчынную няволю мужыкоў". В. Ластоўскі адзначыў, што пасля 1863 г. распачалася жорсткая палітыка знішчэння ўсяго, што не было падобным на маскоўскае і велікарускае: "Прысланыя з Пецярбурга і глыбі Расіі, людзі не зналі зусім ані тутэйшага краю, ані яго гісторыі і ад вякоў устанавіўшыхся парадкаў, дый не хацелі знаць... Усе сілы гэтых людзей былі звернуты на тое, каб зацерці ўсё тутэйшае, каб як можна больш высунуць велікарускае". Калі ў аўтарскай трактоўцы падзей XV—XVIII стст. — ужо "маскоўскае".

Вобраз "ворага" ў гістарычнай канцэпцыі В. Ластоўскага набыў амаль вызначальнае значэнне для гістарычнага лёсу Беларусі. Фактычна, уся гісторыя беларускай зямлі пасля смерці Вітаўта вызначалася ці "польскім", ці "маскоўскім злом".

"Унутраны вораг", пра якога пісалі К. Каліноўскі і Ф. Багушэвіч, на старонках кнігі В. Ластоўскага адсутнічаў. У выніку беларусы на працягу большай часткі сваёй гісторыі выступалі як аб'ект гістарычнага працэсу.

Працягваючы традыцыі папярэднікаў, В. Ластоўскі звязваў тэзіс "двух зол" толькі з правячымі коламі Польшчы і Расіі. Паняцце "ворага" не датычыла польскай і рускай нацыі. Наадварот, В. Ластоўскі падкрэсліваў, што ў час далучэння Беларусі "Расея, таксама як і Польшча, была ў руках шляхты-дваранства, і народ там быў таксама ў няволі". Гаворачы пра русіфікацыю Беларусі, ён заўважыў, што гэтая палітыка "абурала найбольш светлых рускіх людзей, каторым давялося ў тыя часы жыць у нашым краі".

Вобраз "ворага" ў беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі меў некалькі іпастасей. Самай цікавай з іх быў "унутраны" вораг". У гістарычных экскурсах К. Каліноўскага і Ф. Багушэвіча выразна прысутнічаў такі "вораг", як баязлівасць, раз'яднанасць, непавага да саміх сябе, адсутнасць гонару за сваю культуру, мову, гісторыю. Гэта быў істотны момант у гістарыяграфіі, які спрыяў усведамленню Беларусі як суб'екта гістарычнага працэсу. Ён прысутнічаў і ў публіцыстыцы беларускіх народнікаў, толькі што атрымаў на старонках "Гомона" іншае праламленне і з'явіўся ў выглядзе пераканання ў здольнасць беларусаў стаць гаспадарамі ўласнага гістарычнага лёсу. Аднак у працэсе станаўлення беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі вага гэтага суб'ектыўнага моманту няўхільна змяншалася. У "Кароткай гісторыі" В. Ластоўскага ён ужо амаль не адчуваўся.

З пачатку 80-х гадоў XIX ст. выразна пазначылася тэндэнцыя дамінавання ў гістарыяграфіі іпастасі "знешняга" ворага. Найбольш поўна яна праявілася ў тэзісе "двух зол" беларускай гісторыі — польскага і маскоўскага. Гэты тэзіс, упершыню сфармуляваны беларускімі народнікамі, атрымаў навуковае абгрунтаванне ў працах М. Доўнар-Запольскага і набыў вагу амаль што вызначальнага фактара ў "Кароткай гісторыі" В. Ластоўскага. Трэба заўважыць, што тэзіс "двух зол" датычыў выключна дзейнасці правячых колаў Польшчы і Расіі (раней Маскоўскай дзяржавы). Ён ніколі не пераносіўся ў сферу этнічных адносін і не датычыў польскага і рускага народаў.

Вобраз "ворага" меў і сацыяльную (шляхецкую) іпастась. Аднак сацыяльныя матывы цесна перапляталіся з нацыянальна-дзяржаўнымі і за выключэннем публіцыстыкі народнікаў не існавалі як самастойныя. Гэта было звязана з тэндэнцыяй атаясамлівання беларускай нацыі з сялянствам, што праяўлялася ў сацыяльна-этнічнай напоўненасці тэрміну "беларускі народ". Дэмакратызм заснавальнікаў беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі спрыяў таму, што беларуская дзяржаўнасць атаясамлівалася або з народаўладдзем, або з добрым князем, пры якім "народу лепей жылося". Адпаведна антыдзяржаўная палітыка азначала палітыку антынародную, і наадварот.

Трэба прызнаць, што дамінаванне "знешняга" ворага ў гістарыяграфіі не спрыяла ўсведамленню Беларусі ў якасці суб'екта гістарычнага працэсу.

Наадварот. Здаецца, што ў гістарыяграфіі прыжылася ідэя ўласнага бяссілля. Беларусь усведамлялася як заложніца гістарычнага лёсу, ахвяра "польскага" і "маскоўскага зла". Гэтае гістарычнае адчуванне ўплывала на свядомасць культурнай і палітычнай эліты і станавілася часткай нацыянальнай ідэалогіі. Хаця, зразумела, што на фармаванне ідэалогіі ўплывалі і іншыя фактары. Але, па меншай меры, беларуская гістарыяграфія другой паловы XIX — пачатку XX ст. не спрыяла пераадоленню той жабрацкай псіхалогіі, пра якую пісаў у вершы "Перад будучыняй" Я. Купала:

З кійком жабрачым так мы, паўналеткі,
Брыдзём, паўзём у свет — скрозь неўпапад
І прысягаем, клічам Бога ў сведкі,
Што мы — не мы, што нехта вінават.

Аляксандр СМАЛЯНЧУК

г. Гродна

БЕЛАРУСКІ ФОНД СОРАСА

абвяшчае аб працягу конкурсу

«БЕЛАРУСКАЕ МАСТАЦТВА 90-Х ГАДОЎ»

у межах

КУЛЬТУРНЫХ ПРАГРАМ

Конкурс праводзіцца па наступных напрамках:

- *фотамастацтва*
- *арт-дызайн*
- *дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*
- *тэатральна-дэкаратыўнае мастацтва*

Мэта конкурсу - распрацоўка канцэпцый і стварэнне шэрагу рэпрэзентатыўных альбомаў па названых відах мастацтва.

Апошні тэрмін падачы заявак - 25 лістапада 1996 года.

Абавязковыя патрабаванні да прапануемай канцэпцыі:

- максімальная рэпрэзентатыўнасць розных творчых накірункаў;
- наяўнасць у заяўцы кадраплану (спіс аўтараў твораў і пералік адабраных твораў з указаннем месца іх знаходжання).

Максімальная колькасць рэпрадукцый у кожным з будучых альбомаў - трыццаць.

Праекты падаюцца ў выглядзе заявак на грант па распрацаванай форме, якую можна атрымаць у Беларускім Фондзе Сораса або ў абласных аддзяленнях:

220027 г. Мінск, пр. Ф.Скарыны, 65, корпус 11А БДПА, пакой 107, Беларускі Фонд Сораса
210026 г. Віцебск, вул. Замкавая, 4, пакой 215, Віцебскае аддзяленне БФС
246652 г. Гомель, вул. Кірава, 32-а, Гомельскае аддзяленне БФС

Заяўкі, якія складзены не па форме, не разглядаюцца.

Праекты дасылаюцца **на адрас Беларускага Фонду Сораса, з абавязковай пазнакай назвы конкурсу.**

Сольфетрин 071

НА АТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БЕЛАРУСІ

Усё проста: выканаўцу пашчасціла знайсці "сваіх" аўтараў, аўтарам — "свайго" выканаўцу. Хормайстар Аляксей Шут, кампазітары Сяргей Бельцюкоў (аўтар "Усяночнай") ды Алег Залётнеў (аўтар "Літургіі св. Іаана Златавуста") знайшлі адно аднаго. Але цяпер, калі праграма новай беларускай праваслаўнай музыкі больш чым год з часу яе прэм'еры мае добры грамадскі рэзананс, неаднойчы гучала ў канцэртных залах, у культавых будынках (на Беларусі, у краінах Усходняй Еўропы), скарыстоўвалася нават падчас набажэнстваў у Свята-Мікалаеўскай царкве горада Слуцка, да таго ж сталася музычна-драматургічнай асновай спектакля на хрысціянскую тэму, пастаўленага Б. Луцэнкам у Акадэмічным рускім тэатры рэспублікі, — цяпер можна прыгадаць, што ініцыятарам шчаслівага творчага саюза быў мастацкі кіраўнік Мінскага абласнога камернага хору "Sonorus" Аляксей Шут.

"МЫ", САТКАНЫЯ З "Я"

Тры гады таму ён "прачнуўся знакамітым". Ну, вядома ж, не з таго, што пра яго напісаў "ЛіМ". Справаю "ЛіМа" было — заўважыць і падтрымаць новую адметную з'яву ў айчынным музычным мастацтве. А як жа не заўважыць: Аляксей Шут са сваім тады яшчэ безыменным "дзіцём" — Мінскім абласным камерным хорам, створаным у Маладзечне, вылучыўся на Першым міжнародным фестывалі хрысціянскай музыкі "Магутны Божа". Хор не толькі трапіў у лік лаўрэатаў, але і аказаўся адзіным сярод калектываў, каго запрасілі выступіць на прэстыжным фестывалі новай рэлігійнай музыкі "Сакрасонг", што праводзіцца ў Кракаве. Потым — Германія. Потым зноў — Польшча. І гастролі па Беларусі. Новыя праграмы з новых сучасных твораў, заходнееўрапейскай і рускай культавай музыкі. Прэм'еры беларускіх аўтараў. Адраджэнне нашай харавой спадчыны...

Творчая біяграфія маладога калектыву, які цяпер завецца "Sonorus" (ад лацінскага "гучны"), багацее на падзеі ды штрыхі. А партрэт яго стваральніка і кіраўніка? Ды быццам бы той самы. Сівізна, праўда, адолела і ў позірку адбіваецца трывожнае-турботнае жыццё. У астатнім, наколькі яго ведаю, — усё той жа: музыкант-рамантык, захоплены творчымі марамі і... прафесійнік-рэаліст, гаспадар канкрэтнай справы, спакроўлены са сваім часам і са сваёй зямлёй. Тонкі псіхолаг, добрая, сонечная душа (нездарма ж Аляксей Аляксандравіч меў поспехі, працуючы з дзіцячымі харавымі калектывамі). Што да майстэрства, дык яшчэ тры гады таму згадвала я словы выдатнага маэстра, прафесара Віктара Роўды пра хор ягонага вучня А. Шута: які ж гэта, маўляў, камерны хор — гэта малы акадэмічны хор!

З разважанняў А. Ш. Усім, каго называюць "работнікамі культуры", жывецца цяжка. Ад гэтага і працаваць няпроста. Глянеш у твар дзеяча мастацтва, якому наканавана быць носьбітам духоўнасці, а ў ягоных вачах... грошы. І горка, і сорамна... Можна толькі паспачуваць адно аднаму ў сваіх надзённых клопатах. А ўсё ж я прашу сваіх артыстаў: на рэпетыцыях гаварыце пра што заўгодна, толькі, калі ласка, не пра грошы... А час увогуле цікавы для нашага музычнага мастацтва: нарэшце, яно адраджаецца. Калі мы вучыліся, нам распавядалі пра шарамецеўскую капэлу, а пра беларускія аналагічныя з'явы не казалі нічога, бо толькі цяпер "атрымалі права на жыццё" дакументы-сведчанні, якія багатыя традыцыі былі ў нас, якія выбітныя капэлы існавалі на Беларусі, як высока яны каціраваліся ў Еўропе! Нарэшце мы адкрываем забытыя імёны, вяртаем у сваю культурную свядо-

масць тое, што было выкрэслена з нашай памяці.

За тры гады знаёмства з Аляксеем Аляксандравічам я ўпершыню задала банальна-непазбежнае пытанне: пра шлях у мастацтва. І высветліла, што шлях гэты, можна сказаць, пачынаўся ў Заслаўі, дзе будучы маэстра нарадзіўся, а прадоўжыўся ў Вілейцы, дзе маці літаральна выцягнула малечу з прыдарожнага пяску і павяла ў музычную школу, бо з пяці гадоў ён звярнуў на сябе ўвагу старэйшых спевамі. У ДМШ ён патрапіў, не маючы і шасці гадкоў. Інструмент для навучання выбіраў сам: фартэпіяна — не хацеў; баян — пераважыў бы маларослага хлапчука. Скрыпка! І дзед Сцяпан граў на скрыпцы, сталяром калісьці быў і змайстраваў для свайго інструмента адмысловы футарал. Выбраўшы скрыпку, Аляксей не засяроджваў сваю дапытлівасць толькі на ёй: то будзільнік раскручваў, то спрабаваў доследным чынам дазнацца, чаму запалкі гараць... Музычную школу скончыў, калі ў сярэдняй заставалася вучыцца яшчэ два гады. Задумаўся пра будучую прафесію: сур'ёзна падабалася журналістыка, ды "лёс выкінуў на дырыжора".

З разважанняў А. Ш. Тады я не разумеў, наколькі складаная прафесія харавога дырыжора: музыкант, выканаўца, арганізатар, псіхолаг, педагог... Шмат ёсць фармулёвак, што такое хор. "Гэта "мы", сатканыя з "я", — фармулёўка Уладзіміра Мініна. Вядома, у кожнага свой свет, сваё выхаванне, і погляд на выхаванне, — і ўсе мусяць зрабіцца "мы". А дырыжору важна памятаць не толькі пра свой чын — **што**, маўляў, яны без мяне? А памятаць іншае: што я — **без іх**? Узаеманеабходнасць — як важна гэта не страціць! Калі ўдалося "мы" саткаць, дык у гэтым заслуга кожнага. Калі артыст сфальшывіў ці ўступіў раней, чым трэба, — у яго стрэс, ад якога трэба лячыць, а не ўзмацняць гэты цяжкі псіхалагічны стан ушчуваннямі. Зразумела ж, артысты ніколі наўмысна не робяць кепска! Можа, гэта ў мяне жэст атрымаўся няўцямны... Таму я ніколі не ўпікаю артыстаў за няўдачы і не падзяляю вынік выступлення на "мой" поспех і няўдачы "іх".

Леташняй зімою "Sonorus" выступіў у Мінску з новай праграмай, у новай зале (адрэстаўраваным Чырвоным касцёле), у абноўленым складзе і... І ў якасці ўжо сталічнага жыхара. Захаваўшы статус абласнога, хор памяняў маладзечанскую прапіску на мінскую, займеўшы дадатковыя арганізацыйныя, побытавыя і творчыя клопаты. Звычайна на адаптацыю ў новых умовах даецца амаль год працы. Але "Sonorus" працягваў працаваць у напружаным рэжыме; не абвяшчаў конкурс на вакантныя месцы ў хоры (не ўсе змаглі пераехаць у Мінск з Маладзечна) — сталічны "рынак артыстаў" ішоў насустрач са сваімі прапановамі.

Сярод музыкантаў пайшла жартоўная пагалоска: Шут, маўляў, перацягнуў да сябе лепшыя сілы з акадэмічных калектываў. Што ж, у Мінску хормайстар мае выбар артыстаў, але і артысты маюць права выбіраць, **з кім** працаваць, а не толькі — за які заробак. "Грошы ў вачах" усё ж не замінаюць адрозніць больш прывабную ў творчым сэнсе працу, больш сугучнага сабе кіраўніка.

Паступова сфарміраваўся сталы калектыў (адышлі студэнты, сумяшчальнікі, мала хто застаўся працаваць па дамове). З прафесіяналамі маэстра можа гаварыць на высокай мове музыкі, не выдаткуючы час на вытлумачэнне проста тэхнічных рэчаў.

Дзякуй Богу, харавікі на рэпертуарны голад не скардзяцца. Музыкі — мора! І гэтае неабдымнае мора Аляксей Шут імкнецца ахапіць. Яшчэ тры гады таму, даведаўшыся, што маэстра стараецца асвоіць **усю** беларускую харавую літаратуру, не спяшаючыся адмаўляцца ад так званых "нецікавых" партытур (бо аўтар жа меў штосьці на ўвазе, чымсьці ж ён быў захоплены, натхнёны — трэба паспрабаваць знайсці да яго ключык!), сёй-той назваў гэта дырыжорскай непераборлівасцю, усяеднасцю. Мастацкая практыка хору "Sonorus" прымусіла скептыкаў у хуткім часе рабіць іншыя высновы: па натуры стваральнік, А. Шут у працы іншых імкнецца разгледзець найперш "іскрынку Божую" ці хаця б рацыянальнае зерне, прытрымліваецца вядомага правіла — меркаваць пра творцу паводле законаў, якія той сам для сябе вызначыў. Вось чаму і "няўдалыя" з пункту гледжання іншых музыкантаў творы, нібыта па знаку ягоных поўных добрай энергіі рук, свецяцца хай сціплай, але ўжо неаспрэчнай іскрынкай таленту іх стваральнікаў.

У імкненні спасцігнуць мастацкую логіку аўтара А. Шут дасягае пераканальнага гарманічнага гучання самай рознай музыкі. "На роўных" існуюць у рэпертуары хору "Sonorus" незвычайная сімфонія А. Мдзівані "Паўночныя кветкі", геніяльная соль-мажорная Імша Ф. Шуберта, творы Ш. Гуно і К. Сен-Санса, Л. Мурашкі, М. Літвіна і У. Карызны, найноўшыя опусы польскіх аўтараў і песняспевы беларускай царквы — М. Равенскі, М. Куліковіч, А. Валынчык, М. Бутома; найскладаная Імша "Pro pace" ("Пра мір") М. Друфле і апрацоўкі беларускіх, рускіх народных песень.

З разважанняў А. Ш. Кампазітар — гэта, я сказаў бы, змагар-самотнік, які залежыць толькі ад сябе ў вызначэнні тэмпаў, штрыхоў, увогуле — вобразнага ладу твора. Ну, добра: ён можа, згодна з агульнавядомымі правіламі, напісаць у нотах абсалютна дакладныя тэмпы выканання і штрыхі. Але ж калі ў нотах вялікага Баха ўсё дакладна і зразумела — чаму ўсё ж ладзяцца бахаўскія конкурсы для выканаўцаў? Якім чынам кампазітар можа пазначыць у нотах эмацыянальную сферу? Можна, дапусцім, напісаць: "цяплей". Але што гэта будзе значыць? Цяплей — наколькі? Што закадзіраваў кампазітар у сваім рукапісе? Чаму і дзеля чаго ўзнікаюць розныя інтэрпрэтацыі адной і той жа музыкі? Чаму адна і тая ж музыка можа падавацца нудотнай, а можа — захапляючай? "Чалавекі" таму і ёсць "чалавекі", што мы — розныя, адно і тое ж успрымаем па-рознаму. І ў той жа час гэтыя розныя "я" збіраюцца ў адзіны хор...

У нас на Беларусі чалавек мастацтва ніколі не застаецца па-за ўнутранымі працэсамі, што адбываюцца ў грамадстве, у нацыі наогул, і ў гэтым сэнсе чалавек мастацтва не бывае па-за палітыкай. Вось адкрылася магчымасць пісаць рэлігійную музыку. Я не думаю, што ўсе нашы творцы такія ўжо шчырыя праваслаўныя, але пісаць пачалі ў асноўным у праваслаўнай традыцыі. Вынікі, зразумела, розныя... Але ж у нас ёсць яшчэ адна традыцыя зносін з вышэйшым духоўным Уладаром — каталіцкая, і я спадзяюся, што ўзоры сучаснай беларускай імшы таксама будуць у нашым рэпертуары.

Працуючы над кананічнымі песняспевамі беларускай царквы, руплівa сабранымі лонданскім даследчыкам Гаем дэ Пікардам, я нечакана сутыкнуўся вось з якой праблемай. Зразумела, што з лепшымі намерамі тэксты песняспеваў былі перакладзены з царкоўнаславянскай мовы на сучасную беларускую. Як чалавек, улюбёны ў роднае слова, я спачатку парадаваўся. Але ж як выканаўца заўважыў немэтазгоднасць зробленага. Нездарма ж у цывілізаваным оперным свеце творы выконваюцца на мове арыгінала! Бо сінтаксіс музычны і моўны ў аўтарскім творы настолькі збліжаюцца, што калі потым будзе заменена хаця б слова, пачнецца несупадзенне моцных і слабых доляў, парушэнне інтанацыйнай логікі, ссоўванне націскаў і да т. п. Каб сумясціць націскныя склады перакладзенага тэксту, трэба драбніць або падаўжаць нотныя долі — гэта не проста фізічна ўскладнёная праца, гэта цяжка і ў маральным сэнсе, бо адчуваеш сябе не зусім карэктным у адносінах да кампазітара, які зрабіў дыхтоўны мастацкі твор... У мяне б не паднялася рука перакласці на іншую мову кананічны лацінскі харал, каб потым яшчэ былі зроблены неабходныя "падцяжкі" ў музычным тэксце! Таму я ўрэшце ўзяў зборнік з кананічнымі царкоўнаславянскімі малітвамі, знайшоў адпаведнікі "перакладам" — і ўся музыка цудоўна з імі спалучылася, і з гэтай праграмай мы адкрылі свой новы канцэртны сезон у Мінску...

У той вечар зала на Залатой Горцы вітала яшчэ адну прэм'еру — "Літургію св. Іаана Златавуста" А. Хадоскі, першае выкананне якой адбылося ўлетку ў Магілёве, падчас фестывалю "Магутны Божа", пра што наш дапытлівы чытач мог даведацца з нядаўняй публікацыі "ЛіМа". Давядзецца трошкі пачакаць — і хор "Sonorus" падорыць сваім шматлікім прыхільнікам новы арыгінальны твор А. Літвіноўскага — на кананічныя беларускія тэксты, з арганам і лёгкім аркестравым суправаджэннем.

А. Шут мае захапляючыя планы "на заўтра", хаця гаворыць пра іх абачліва, каб не сурочыць. Але ж таго, што зроблена, не сурочыш, гэта ўжо факты біяграфіі хору і ягонага кіраўніка. Трыумф "Паўночных кветак" у "Смаленску; выкананне пад вольным небам прыморскага фестывальнага мястэчка ў Польшчы беларускага гімна "Магутны Божа"; асветніцкія канцэрты для дзетак чарнобыльскай зоны; авацыя песні "Зорка Венера" ў перапоўненых германскіх кірхах; творчая праца з нямецкім маэстра; два-чатыры штомесячныя выхады ў спектаклі Рускага тэатра, калі дырыжор вымушаны стасавацца з калектывам, "раскіданым па балконе другога яруса", праз няўгледнае энергетычнае поле...

Зрэшты, яшчэ да таго, як рэжысёр Б. Луцэнка паслухаў-угледзеў творы С. Бельцюкова ды А. Залётнева ў выкананні хору "Sonorus" і зрабіў паводле іх спектакль, А. Шут увёў у гэтую праграму элементы — назаву іх так — харавога тэатра. Перастаноўкі артыстаў, нязвыклыя мізансцэны па ходзе спявання, — гэта мела цікавы акустычны, нават санарыстычны эфект. Балазе, музычны матэрыял, хаця і зарыентаваны на традыцыі праваслаўных песняспеваў XIX стагоддзя, дае магчымасці для сучасных гукавых эксперыментаў.

Яны надзіва гарманічна дапаўняюць адно аднаго: рыгарызм "Усяночнай" Сяргея Бельцюкова, эмацыянальны драматызм і велікодная радасць "Літургіі" Алега Залётнева, мастакоўскае адчуванне "залатой сярэдзіны", якое выяўляецца ва ўменні Аляксея Шута сагрэць логіку кампазітарскага розуму логікай пеўчае душы, а ўспышкі зямной сентыментальнасці ўраўнаважыць мудрай стрыманасцю духу. Вось дзе й сапраўды: "мы", сатканае з "я"! Невыпадкова на атрыманне Дзяржаўнай прэміі за гэтую музычную праграму яны вылучаны разам: Сяргей Бельцюкоў, Алег Залётнеў, Аляксей Шут.

Мабыць, з іх супольнай працы пачнецца і "матэрыялізацыя ідэі" — стварэнне рэальных умоў для Тэатра Хору, пра які (прыадкрыю куфэрак мастакоўскіх сакрэтаў!) марыць Аляксей Шут. Аднак пра гэта — наступным разам...

С. БЕРАСЦЕНЬ

На здымку — Аляксей ШУТ.

ЛіМ
ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ
Саюз беларускіх пісьменнікаў; рэдакцыя газеты "Літаратура і мастацтва"

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Газету рэдагавалі:

Х. Дунец	(1932-35)
І. Гурскі	(1935-41)
А. Куляшоў	(1945-46)
М. Горцаў	(1947-49)
П. Кавалёў	(1949-50)
В. Вітка	(1951-57)
М. Ткачоў	(1957-59)
Я. Шарахоўскі	(1959-61)
Н. Пашкевіч	(1961-69)
Л. Прокша	(1969-72)
Х. Жычка	(1972-76)
А. Асіпенка	(1976-80)
А. Жук	(1980-86)
А. Вярцінскі	(1986-90)

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ, Міхась ЗАМСКІ, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Жана ЛАШКЕВІЧ, Алесь МАРЦІНОВІЧ, Барыс ПЯТРОВІЧ — *першы намеснік галоўнага рэдактара,* **Юрась СВІРКА, Віктар ШНІП** — *намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19
ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі — 2332-461
намеснікі галоўнага рэдактара — 2332-525, 2331-985
аддзелы:
публіцыстыкі — 2332-525
пісьмаў і грамадскай думкі — 2331-985
літаратурнага жыцця — 2332-462
крытыкі і бібліяграфіі — 2331-985
паэзіі і прозы — 2332-204
музыкі — 2332-153
тэатра, кіно і тэлебачання — 2332-153
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў — 2332-462
навін — 2332-462
мастацкага афармлення — 2332-204
фотакарэспандэнт — 2332-462
бухгалтэрыя — 2682-660

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку" (г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77)

Індэкс 63856. Наклад 4785
Нумар падпісаны 10.10.1996 г.
Заказ 6590/Г

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12